ГАЛЕРЭЯ ЧАЛАВЕЧАЙ ДУМКІ

АНДРЭЙ ВОЛЯН

# АБ грамадзянскай, або палітычнай СВАБОДЗЕ



Галерэя чалавечай думкі

Андрэй Волян

# Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе

Andrea Volano

# De libertate politica sive civili

Cracoviae
In Officina Matthiae Wirzbietae
Thypographi S.R.M.
1572

Андрэй Волян

# Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2009

УДК 1
ББК 87
В72

Серыя заснаваная ў 2001 годзе

Пераклад з лацінскай *Уладзіміра Шатона*
Рэдактар перакладу *Зміцер Колас*

*На вокладцы выкарыстаная гравюра Андрэя Фядорчанкі.*

Пераклад зроблены з выданняў:
Andrea Volano. *De libertate politica sive civili*. Cracoviae. In Officina Matthiae Wirzbietae, Thypographi S.R.M. 1572
Andrea Volano. *De vita beata sive summo hominis bono. Dialogus*. Vilnae. Imprimebat Salomon Sultzer. 1596

Published with the support of
the European Cultural Foundation and
the Fund for Central & East European Book Projects, Amsterdam

ISBN 978-985-6783-49-7

©Шатон Ул., пераклад на беларускую мову, 2009
©Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2009

*Яснавяльможнаму пану Мікалаю Юрыю Радзівілу,*
*Маршалку ў Дубінках і Біржы, Ваяводзе Віленскаму,*
*Канцлеру Вялікага Княства Літоўскага,*
*Кашталяну Барысаўскаму і Лідскаму,*
*майму велешаноўнаму гаспадару і вечнаму дабрадзею.*

Найяснейшы пане, у чалавечай супольнасці, называнай грамадствам, найважнейшая чыннасць заключаецца ў тым, каб разумна і правільна кіраваць гэтым грамадствам у мірных умовах і нязломна, мужна, рашуча змагацца з ворагам у час вайны. І адно, і другое заслугоўвае найвышэйшай пашаны і славы. Вельмі добра, калі чалавек спалучае ў сабе жвавасць дасціпнага розуму і цвёрдую непахіснасць волі. У такім выпадку ён варты амаль боскага ўшанавання.

Усякая чалавечая супольнасць ствараецца, галоўным чынам, каб забяспечыць сабе спакойнае, мірнае жыццё, свабоднае ад звадаў і варожай пагрозы. І калі з'яўляецца чалавек, здольны забяспечыць перамогу ў вайне і памножыць дабрабыт у міры, хто ж не будзе глядзець на яго з павагай, хто не палічыць такога дабрадзея вартым найвышэйшай ухвалы?

Сярод герояў Траянскай вайны Гамэр найбольш славіць Нестара і Адысея за іх умелае кіраванне грамадствам, а мужных Ахіла і Аякса — за іх ваеннае майстэрства. Знакаміты паэт Вергілій лучыць абое гэтыя ўмельствы ў сваім Энэю. Паэт паўсюль і на поўны голас гаворыць пра яго як пра найхрабрэйшага ваяра і наймудрэйшага сенатара. Што да Ахіла, то ў мірны час бацька прыставіў да яго выхавальнікам Фенікса.

Гамэр называе Фенікса, дасведчанага ў ваенных і грамадскіх навуках, выкладчыкам і настаўнікам жыцця. Аднак яго вучань Ахіл уславіў сябе не мірнымі ўчынкамі, а мужнымі, адважнымі подзвігамі ў час вайны.

Ва ўсе часы кожны народ меў сваіх магутаў, якія ўзорна вызначаліся як на ратным полі, так і на ніве стваральнай працы. Літва на працягу ўжо многіх вякоў спараджае знакамітых мужоў, настолькі дасведчаных у грамадзянскім і ваенным кіраванні, што яны нязменна здабываюць вялікую славу. Я ўжо не кажу пра высакародных Гедымінаў, Ягелонаў, Вітаўтаў, якія ўмацавалі аўтарытэт Літоўскага грамадства настолькі, што іх ведае цяпер увесь свет.

Калі б хто захацеў пералічыць імёны ўсіх насельнікаў нашага краю, якія ў ваенны і мірны час спрычыніліся дзейснаю дапамогай сваёй дзяржаве, то мабыць нават сярод самых слаўных народаў знайшоў бы не шмат мужоў, роўных нашым. Я не буду згадваць выбітныя дзеі кожнага з нашых радавітых сямействаў. У кожнага з іх свае вартасці. Бо калі б я намерыўся расказаць пра баявыя подзвігі хоць бы аднаго толькі сямейства Радзівілаў, то наўрад ці давёў бы аповед свой да канца. Таму я не буду закранаць падзеі глыбокай мінуўшчыны. Вазьму толькі трошкі больш за апошнюю сотню год. Ад аднаго твайго дзеда Мікалая Радзівіла, ваяводы Віленскага, пайшло столькі знакамітых нашчадкаў, што здаецца, у гэтым Траянскім кані хавалася ўся краса нашай знаці, каб аднойчы нечакана выйсці на свет.

А другі Мікалай Радзівіл, твой дзядзька і таксама ваявода Віленскі, вызначаўся мудрасцю й іншымі выдатнымі якасцямі настолькі, што Божай міласцю імператар Максімільян на Канвенце высокіх дзяржаўных мужоў запрасіў твайго родзіча ў кола сваіх прыбліжаных, і такім чынам ён першы ў вашым сямействе атрымаў ад імператара маршальскі тытул і званне.

Яму не саступае Ян, вярхоўны маршалак Вялікага Княства

Літоўскага. Кажуць, што ён быў надзелены такімі талентамі і такою рухавасцю розуму, што заўсёды надзвычай паспяхова спраўляўся са сваімі даволі складанымі дзяржаўнымі абавязкамі. А па меншай меры двух ягоных сыноў, Яна і Міколу, ёсць усе падставы параўноўваць з найбуйнейшымі асобамі любога часу. Ян, яшчэ толькі ўвайшоўшы ў росквіт юнацтва, з першых гадоў здабыў шырокую вядомасць. Яго выбітная чыннасць не сыходзіла з вуснаў людзей. На яго ўскладалі вялікія надзеі. Аднак воляю злога лёсу ён не змог паслужыць грамадству, будучы вымушаным пакінуць гэты свет.

Мікалай, славуты князь на Алыцэ й Нясвіжы, дзякуючы прыродным сваім задаткам, а таксама настойліваму і плённаму дасканаленню ў навуках вызначаўся высакароднасцю і адукаванасцю, дасягнуўшы ў грамадстве самых розных і самых паважаных чыноў і тытулаў. Ва ўсіх галінах дзяржаўнага кіравання ён праяўляў мудрую разважнасць, незвычайную рупнасць, выключную добрасумленнасць. Калі б лёс наканаваў яму даўжэйшае жыццё, мы напэўна не ўбачылі б у нашым грамадстве таго занядбання, таго пачварнага стану рэчаў, які ўганяе ў скруху ўсіх разумных людзей.

Былі, вядома, і крывадушнікі, якія яму зайздросцілі. Але цяпер, калі ён памёр, усе ў адзін голас праслаўляюць яго добрыя ўчынкі і ўзносяць яго аж да зор. Гэты муж сапраўды самаадданна спрыяў велічы сваёй бацькаўшчыны, славе свайго народа і сваёй радзімы. Наўрад ці ў цэлым хрысціянскім свеце знойдзецца такі закутак, дзе б не ведалі гэтага славутага імя. Яго вельмі цанілі спачылыя ў Бозе імператары Карл і Фердынанд, а таксама шчасны і сёння на троне Максімільян. Калі князь Мікалай ад імя караля свайго Жыгімонта Аўгуста прыбыў да іх з важнай дыпламатычнаю місіяй, яны прынялі яго добразычліва і абыходзіліся з вялікай прыязнасцю. І пасля вяртання нашага легата на радзіму імператары не пераставалі ўсхваляць веліч гэтага мужа. Заўчасная

смерць вырвала слаўнага літвіна з нашага асяродку. Яго так не стае ўсім, хто дбае пра аўтарытэт і бяспеку радзімы. Аднак засталося яго цудоўнае патомства, у якім ужо з ранняга ўзросту праявіліся бацькавы талент і дабрыня. Няма сумневу, што нашчадкі яго стануць неўзабаве красой і апорай усёй нашай краіны.

Вось старэйшы сын Мікалай Крыштаф, якога мудры кароль нягледзячы на малады яго ўзрост узвёў у стан сенатараў. Прырода надзяліла гэтага юнака выбітнымі чалавечымі якасцямі. Ён вызначаецца сталасцю думкі, дарослай разважнасцю, клопатам пра веліч грамадства, палымнее бязмернай любоўю да бацькаўшчыны. Ёсць усе падставы спадзявацца, што такімі будуць і яго браты.

А пакуль няхай далучае да сваіх разумовых і фізічных задаткаў мудрасць розных народаў, наведваючы найбольш цывілізаваныя і моцныя краіны. Там ён удасканаліць сваё валоданне замежнымі мовамі, да якіх мае выключныя здольнасці, зоймецца вывучэннем розных навук, засвоіць практыку ваеннай справы. Такім чынам ён стане вартым сваіх продкаў і, калі будзе ў добрым здароўі, прымножыць даўнюю славу роду словамі й дзеямі.

Але ў тваім родзе, знакаміты магут, квітнела не толькі ўмельства захоўваць мір у грамадстве — шырокую вядомасць заўжды мела і яго ваенная чыннасць. Я не буду пералічаць усіх шматлікіх герояў, якія адважна баранілі айчыну ад нападу раз'юшаных ворагаў. Згадаю толькі бацьку твайго Юрыя Радзівіла, апетага ў нашых хроніках, які адзін ёсць дастатковым сведчаннем ваеннай славы тваёй найзнатнейшай радзіны. Ён атрымаў шмат перамогаў над ворагамі, а па смерці Канстанціна Астрожскага быў абраны гетманам войска літоўскага. Будучы паплечнікам Канстанціна яшчэ ў векапомнай Аршанскай бітве з маскалямі, ён з такой самай мужнасцю і непахіснасцю змагаўся за шчаслівае завяршэнне тае вайны. Потым узначальваў аблогу маскоўскай крэпасці Старадуб, якую паспяхова ўзяў. Тады загінула шмат

варожага войска, і Масковію ахапіў жывёльны страх. Калі б пераможца захацеў замацаваць сваю перамогу, дык ужо тады мог бы закончыць вайну. Я ўжо не кажу пра перамогі над маскалямі і скіфамі пры выпадковых сутычках з іх бязладнымі зграямі ці пры адбіцці іх раптоўных нападаў. Ад такіх сустрэч вораг доўга не мог апамятацца.

Пасля свайго бацькі ты, нібы ў спадчыну, атрымаў пасаду вялікага гетмана. На гэтую пасаду цябе прапанаваў кароль Жыгімонт Аўгуст. Паводле яго аўтарытэтнага меркавання, менавіта табе можна было даверыць вярхоўную ўладу над войскам. Кароль меў рацыю. Ты без упынку даваў сведчанні свайго вайсковага таленту, і ў лёгкіх баях, і ў цяжкіх бітвах заўсёды перамагаючы ворага.

Так было і ў памятнай бітве на берагах Улы. Калі ты раптам узнік перад ворагам насуперак усім яго ным разлікам, маскаль, які страшыўся аднаго твайго імені, палічыў за лепшае не выпрабоўваць сумнеўнае жэрабя вайны, а адступіць, кінуўшыся на ўцёкі. Адважуся сцвярджаць, што яшчэ ніколі і нідзе на зямлі не адбывалася такой бітвы. У гэтай сечы была рассеяная і знішчаная вялікая колькасць варожага войска, быў забіты яго ваявода і захоплены ўвесь вайсковы абоз. Тым часам сярод нашых ад варожай рукі не загінуў амаль ніхто. Той перамогаю ты адвёў нашмат большую небяспеку, якая пагражала ўсёй Літве. Пра гэта сведчыць той факт, што на нас ішло яшчэ і другое маскоўскае войска. Але пачуўшы пра поўны разгром хаўруснікаў на Уле, яны паспешліва павярнулі назад і ўцяклі. Калі б гэтае войска аб'ядналася з першым, якое ты разграміў (а далейшыя падзеі сведчаць, што гэта і было іх мэтай), то на Літве, бадай, не засталося б ніводнага мястэчка і вёскі, якія пазбеглі б спусташэння і згубы. Пасля той паразы пачварны і люты вораг прапанаваў заключыць мір, але на такіх непрымальных для нас умовах, што гэта перакрэслівала ўсе твае смелыя і адважныя планы.

Але ты не задаволіўся перамогай над ворагам і гібеллю галоўнага маскоўскага ваяводы. Сваімі разумнымі парадамі ты схіліў на свой бок яшчэ і славутага князя Андрэя з яраслаўскай дынастыі, якому ў Масковіі няма роўных. Гэтым самым ты не толькі ўратаваў яго з жорсткіх кіпцюроў тырана, але і паспрыяў таму, каб колішні вораг стаў слынным грамадзянінам і саюзнікам твайго караля.

Што да князя Андрэя, то, звяртаючыся да цябе з прывітальным і пахвальным словам перад людскім натоўпам, ён сказаў, што калі аднаго непрыяцельскага ваяводу ты адолеў рукою, дык яго перамог сваім красамоўствам. Ты з поўным правам належыш да тых ваяводаў (а такія былі), хто спалучае бліскучы ваенны талент з мудрым дарам слова. Вастрынёй свайго пранікліваго розуму ты перасягаеш у нашай Сарматыі многіх выбітных сенатараў, а ў красамоўстве табе ўвогуле няма роўні. На радзіме ты цалкам заслужана займаеш першае месца і па званні сваім, і па сенатарскай годнасці. А пасля таго як табе давялося заняць месца стрыечнага брата, мудрага і знакамітага Мікалая Радзівіла, ты пачаў увасабляць для нас і яго самога. Дай жа нам, усёмагутны і ўсельітасцівы Божа, каб стырно дзяржавы апынулася неўзабаве ў руках твайго высакароднага сына Мікалая. Розум і мысленне гэтага смелага і дужага юнака — нашмат сталейшыя за яго ўзрост. Тое самае можна сказаць і пра твайго меншага сына Крыштафа, бо і ён прыкметна вызначаецца розумам і целам. Па багацці талентаў твой выбітны род спаборнічае толькі з самім сабою. Сваімі заслугамі перад радзімай ён не дае нам траціць надзею, што і ў сённяшнім дзікім разгуле бурлівых хваляў наша грамадства ўрэшце знойдзе спакойны і мірны прычал.

Калі наперадзе выступаюць такія волаты, ніхто не можа сядзець і глядзець, склаўшы рукі. Кожны адчувае абавязак унесці сваю лепту ў агульную справу. Так і я, з ранняга ўзросту і да гэтых дзён будучы пры тваім двары, нязменна бачачы вялікую

працу, якую ты аддаваў на карысць айчыны, і натхніўшыся тваім прыкладам, рашыў далучыць свае тэарэтычныя і практычныя меркаванні адносна стану рэчаў у нашым грамадстве, чыім шчырым грамадзянінам сябе лічу, у тым ліку дзякуючы тваёй ласцы і тваёй выключнае дабрыні.

А як бо для дзяржавы няма нічога важнейшага і нічога карыснейшага за свабоду, то дзеля пашырэння гэтай усеагульнай свабоды я палічыў патрэбным прыгадаць пэўныя парады з кніг вучоных мужоў. Можа быць, я і сам змагу выказаць нешта карыснае тым, на кім ляжыць клопат аб нашай дзяржаве, і тым самым дапамагу пазбавіць грамадства некаторых заганаў. Зрэшты, я не такі наіўны, каб думаць, што ў сваім невялікім творы здолею разгледзець усё, чаго патрабуе значнасць і шырыня тэмы. Але ў вялікіх справах бывае дастаткова ўхвальным ужо адно жаданне. І няхай справядлівы чытач мне даруе, калі заўважыць, што я не ўсюды адпавядаю свайму намеру. Няхай лепш пахваліць маю зычлівасць да нашага люду, а не перабольшвае маю няздатнасць.

Напісанае мною — унёсак даволі сціплы. І ўсё ж я лічу патрэбным прысвяціць гэты твор табе, яснавяльможны ўладар, надрукаваўшы яго пад шчаслівым знакам твайго імя. З Божай волі ты — першая асоба ў нашым грамадстве. Дык вазьмі пад сваю апеку таго, хто ад усяго сэрца зычыць дзяржаве дабра, і абарані яго ад нядобразычліўцаў.

Вялікі багатыр, здароўя і шчасця табе на многія гады. І няхай атульвае мяне твая заўсёдная ласка.

Адпраўлена з маёнтка майго ў Біюцішках.
5-га студзеня 1572 года

*Вашай Светлай Высокасці*
*кліент і слуга вечны,*
*Андрэй Волян*

# Раздзел I

## Усе разумныя людзі высока цанілі свабоду

Прырода надзяліла чалавечы род найвялікшымі каштоўнасцямі. Але думаю, найбольшай каштоўнасцю, бадай, ёсць свабода. Хоць чалавек і атрымаў ад маці прыроды добрыя разумовыя і фізічныя задаткі, якія, здаецца, і складаюць сапраўднае шчасце, аднак ва ўмовах адсутнасці свабоды гэтыя задаткі не могуць належным чынам выканаць сваё прызначэнне і ашчасліваць чалавека. У рабстве няма месца дабрачыннасці, у няволі немагчыма мець добрае здароўе, так неабходнае для жыцця і карысных справаў. Мусіш заўсёды рабіць не тое, што хочаш сам, а што падабаецца нягоднікам, і дзейнічаеш паводле іх прыхамаці. І нездарма ўсе людзі высокага розуму і ўсе добра ўладкаваныя грамадствы надавалі свабодзе выключную і неаслабную ўвагу. Вучоныя мужы адзначаюць, што рабства падрывае або зусім нішчыць усё добрае ў чалавечым грамадстве. Тут варта прыгадаць цудоўныя, мудрыя словы Цыцэрона: «Рабства ёсць найгоршым з усіх бедаў. Супроць яго трэба змагацца не на жыццё, а на смерць». Дый сама рэчаіснасць сведчыць, якім злом аказваецца рабства. Калі афіняне знаходзіліся пад цяжкім гнётам тыранаў, то як ваяры нічым асабліва не праславіліся ў параўнанні з суседнімі народамі. Здабыўшы, аднак, свабоду, яны, нібыта іх падмянілі, лёгка аднялі ў другіх пальму вяршэнства ў ратнай мужнасці. Па словах Герадота, пакуль афіняне здабывалі багацці не сабе, а ўладарам, яны не надта й высільваліся. А калі сталі вольнымі, пачалі працаваць на поўную сілу, бо рабілі на ўсё сваё грамадства, а значыць і на сябе. У тых краях ніколі не дасягнула б такога росквіту філасофія, ніколі не нарадзілася б навука аб самых справядлівых законах, калі б у іх не існавала свабоды, гэтай настаўніцы ўсіх добрых справаў. Дарэчы, варвары, пры-

вучаныя падпарадкоўвацца жаданням тыранаў, заўсёды былі настолькі далёкія ад прыстойнасці і высакародства, што не вельмі адрозніваліся ад астатніх жывёл.

Сярод гарадоў, у якіх свабода прынесла найвышэйшы плён, вылучаецца, канешне, і Рым. Нялёгка нават вызначыць, што яго ўславіла больш: ратныя подзвігі ці мірныя навукі і мастацтвы. Пакуль Рым быў верным і пільным вартаўнікам усеагульнай свабоды, ён, нібы з нейкай скарбонкі дабрадзейнасці, спараджаў і шматлікіх імператараў, якія пакрывалі сябе славай у бітвах, і разважных сенатараў, якія праслаўлялі сябе мудрасцю. Рымляне так моцна любілі і аберагалі свабоду, што не толькі мужна змагаліся за сваю вольнасць, але і не дазвалялі, каб нехта замахваўся на вольнасць чужую. Сведчаннем можа служыць вайна, якую вёў Квінкцій супраць македонскага цара Філіпа. Гэтая небяспечная вайна вымагала вялікіх высілкаў і сродкаў. А калі яна была паспяхова завершаная, рымляне запатрабавалі ў якасці кампенсацыі толькі аднаго: свабоды грэцкім гарадам. Грэкі ўспрынялі такую высакароднасць рымлянаў з вялікаю радасцю і захапленнем. Нечым боскім здаваўся ім факт, што на зямлі ёсць народ, які з такой прыхільнасцю ставіцца да чужой свабоды. Гэты народ, не збаяўшыся ні цяжкасцяў, ні смяротнае небяспекі, без вагання выступіў супроць магутнага ворага і вызваліў ад прыгнёту іншы свабодалюбны народ. Калі грэкі зноў паспыталі пладоў вернутае свабоды, яны былі настолькі ўсцешаныя, што і словам і справай далі зразумець: з усіх паднябесных рэчаў няма нічога каштоўнейшага за свабоду. І нездарма часта здаралася так, што многія хутчэй выбіралі смерць, чым жыццё ў рабстве. Такую моц і сілу духа праяўлялі не толькі мужчыны. У рашучасці з імі спаборнічалі і жанчыны. Гэткімі былі жанчыны ў кельтаў. Пасля таго як Антанін Каракала перамог кельтаў у вайне, іхнія жонкі апынуліся ў палоне. Рымляне запыталі ў палонніц, што

яны хочуць: каб іх прадалі ці забілі. Жанчыны адказалі, што лічаць за лепшае памерці. А калі кельцянак усё ж прадалі, то, пазбаўленыя свабоды, яны не пажадалі несці на сабе ярмо рабства і наклалі на сябе рукі. Перад гэтым жанчыны забілі сваіх сыноў, бо і дзяцей, калі б яны засталіся жывыя, чакала рабства. Нешта падобнае расказваюць і пра кантаберыйскіх жанок. Яны таксама пакончылі самагубствам, забіўшы папярэдне сваіх сыноў, каб тыя не трапілі ў рукі ворагу. Нехта вельмі слушна заўважыў: салодкі смак у свабоды, нават калі яна купленая смерцю, і няма нічога агіднейшага за рабства, бо нездарма кажуць: мілей смерць, чым няволя.

Вось эпізод, пра які распавёў Лаэрцый. Аднойчы Кратэр, прэфект ваяроў Аляксандра Македонскага, запрасіў да сябе жыць Дыягена Цыніка. Але Цынік, жадаючы паказаць выключную вартасць свабоды, адказаў гэтаму багатаму і магутнаму чалавеку: «Як на мяне, дык лепш лізаць соль у Афінах, чым ласавацца далікатнымі прысмакамі ў Кратэра». Цынік хацеў гэтым самым сказаць, што яму больш імпануе беднасць простага люду, чым раскоша багацеяў, ад якой патыхае рабствам. І яшчэ. Некаторыя лічылі філосафа Калісфена шчаслаўцам, бо ён меў у Аляксандра салодкае, усцешлівае жыццё. Цынік жа аднойчы сказаў: «Я лічу Калісфена гаротнікам і нябогам, бо яму дазваляецца снедаць і абедаць, калі гэтага жадае Аляксандр». Нездарма палявая мыш з вядомай байкі ўпадабала сваё сціплае жыццё куды больш за жыццё гарадской мышы. Сяльчанка бачыла, што сваячка мае раскошны стол. Але тая раскоша была звязаная з няспыннымі трывогамі і страхамі. Таму яна не захацела прамяняць свой небагаты харчунак, які магла спажываць у поўным спакоі, на гарадское смакоцце, прыпраўленае мітрэнгай і рызыкай.

Мы паўсюдна пераконваемся: жывёлы прыродаю створаныя так, што заўсёды прагнуць волі. Ім больш падабаецца здабы-

ваць ежу на свабодзе, чым мець яе гатовую, але ў няволі. Як гаворыць Авідый:

> Хоць і няблага жывуць салавейка і ласвіца ў клетцы,
> Толькі ж у лес да сваіх прагнуць вярнуцца яны.

Калі пачуццё свабоды ўласціваe нават маленькім птушкам, то нічога дзіўнага, што і чалавек, істота найбольш дасканалая і найбольш свабодная з усіх, створаных Богам, з вялікай упартасцю імкнецца да волі. Чалавек гатовы ісці на смерць, каб скінуць ярмо рабства. Праўду казаў Цыцэрон: «Рабу не патрэбна жыццё, якое не мае ніякай вартасці».

# Раздзел II

## Пра аблуднасць і недарэчнасць думкі, што свабода — гэта ўсёдазволенасць

Ніводзін разумны чалавек ніколі не сумняваўся, што свабода ўласцівая самой чалавечай прыродзе і ніхто не нараджаецца рабом. Але з прычыны сапсаванасці чалавечай натуры нашае жыццё абложана мноствам злыбедаў. Трэба прызнаць, што і ўзнікненне рабства, якое займае далёка не апошняе месца сярод іншых ліхтуг, абумоўлена той жа прычынай. Славалюбства і сквапнасць — гэтыя плады заганнай натуры — спарадзілі спаміж людзьмі вайну, за якой, быццам цень, сунулася рабства. Акрамя вайны, беспрасветная галеча змушала чалавека пайсці ў няволю дзеля куска хлеба. Рабства практыкавалася ў чалавечым супольніцтве і як пакаранне за надзвычай цяжкае злачынства. Але якія б там ні былі асобныя прычыны падняволля, усе яны ёсць вынік грэхападзення чалавечай натуры. Калі б людзі зберагалі першапачатковую цнатлівасць, іх не напаткалі б аніякія беды. Чалавеку служыла б усё, што было створана Богам, і ніхто і ніштo не загнала б людзей у ярмо няволі.

Цяпер жа ўсё настолькі перамяшалася, што рэчы, якія павінны былі б дапамагаць людзям, здаецца, адвярнуліся ад іх зусім. І толькі прыклаўшы вялікія намаганні, чалавек змушае гэтыя рэчы служыць ягоным патрэбам. А гэта таксама з'яўляецца сведчаннем таго, што мы знаходзімся пад гнётам нявольніцтва. Але ніадкуль так не пагражае чалавеку небяспека пакутнага рабства, як ад самога ж чалавека. Як толькі гэтая жывёліна раскілзваецца ды траціць усякую прыстойнасць і сціпласць, яна неўзабаве робіцца фанабэрыстай і пыхлівай, сквапнай і жорсткай. Яна імкнецца да ўлады з такім нахабствам, што бачыць сябе шчаслівай толькі, калі трымае іншых у няволі.

Калі мы прыгадаем падзеі мінуўшчыны і паглядзім на тое, што дзеецца сёння, мы не зможам для сябе не адзначыць, што сярод людзей заўсёды знаходзіцца той, хто прагне захапіць неабмежаваную ўладу цаною шматлікіх інтрыг і забойстваў. Пыха і неўтаймаваная разбэшчанасць чалавека з'яўляюцца галоўнай прычынай рабства. Але знаходзяцца людзі, чый розум сапсуты і карумпаваны настолькі, што гэтыя самыя заганы, якія ўжо адны руйнуюць усякую свабоду, яны легкадумна мянуюць свабодай. І шмат хто лічыць, што толькі тады мае поўную, сапраўдную свабоду, калі сваім суровым і грозным абліччам наганяе жуду на слабейшага, па сваёй прыхамаці чыніць над ім гвалт, змушае ўсіх скарыцца дзікаму самаўладдзю. Але ўсялякая празмернасць ператвараецца ў загану. Людзі, якія выхваляюцца сваёй празмернай свабодай, фанабэрацца не высакародным разуменнем свабоды, а паняццем, найменне якому «разбэшчанае сваволле». Свабода нікому не чыніць зла, тады як розная кшталту бязэцтва парушае спакой чалавека. Толькі дэспат лічыць прыстойным рабіць людзям ліха па сваёй прыхамаці. Свабода адмаўляе рабства і падтрымлівае панаванне справядлівых законаў. Дэспат жа руйнуе любое вяршэнства закона і ў сваіх дзеяннях кіруецца не розумам, а жарсцю заганных пачуццяў.

Платон у сваім творы «Аб дзяржаве» слушна гаворыць: падобна да таго, як усякая празмерная якасць ператвараецца ў сваю процілегласць, так і некантраляваная свабода дэгенеруе ў неабмежаванае нявольніцтва. Калі грамадства дазваляе чалавеку не зважаць на закон і рабіць усё, што кожны хоча, яно гэтым самым патурае прыхамаці і сваволі мацнейшых і нясе рабства згалелым і нямоглым. Каб адшукаць падобны стан рэчаў, далёка хадзіць не трэба. Амаль усім даводзілася паспытаць гора ад нечыяга самачынства. Як часта жаўнеры, забыўшыся на свае абавязкі, скінуўшы путы ледзьве не ўсіх законаў, ляцяць на злом галавы туды, куды іх пацягне жарсць. За апошнія гады

мы бачылі столькі забойстваў, столькі згвалтаваных жанчын, столькі абрабаваных маёнткаў і нават цэлых раёнаў, што большае плягі грамадства не магло б атрымаць нават ад ворага. І гэтыя ліхадзеі на ўвесь голас, не чырванеючы, заяўляюць, што маюць права на ўсё, бо яны — вольныя, хаця ў сапраўднасці аказваюцца нікчэмнымі рабамі сваіх подлых жаданняў. Зрэшты, і самі яны церпяць несправядлівасць ад больш моцных.

Дык хай жа будуць як мага далей неразумныя памкненні тых, для каго свабода — гэта неўтаймаваная вольнасць рабіць усё, што захочаш. Свабода заўсёды мае на мэце высакародныя ўчынкі і заўсёды спалучаецца са станоўчым ладам мыслення.

# Раздзел III

## Развагі аб свабодзе і яе сутнасці

Усе даброты бываюць трох кшталтаў. Наконт гэтага сыходзяцца ў сваіх меркаваннях філосафы, пра гэта сведчыць і сама рэчаіснасць. Усё, што лічыцца за дабро, бывае альбо духоўным, альбо цялесным, альбо маёмасным. У першай кнізе «Законаў» Платон называе духоўныя даброты боскімі — пэўна, таму, што людзі, якія разумна карыстаюцца гэтымі каштоўнасцямі, адлюстроўваюць прыроду бога. А Бог ёсць абсалют усіх дабрачыннасцяў. Даброты цела і даброты фартуны Платон мянуе чалавечымі добротамі. І тыя, і другія залежаць ад даброт духоўных і, як малодшыя старэйшым, павінны ім падпарадкоўвацца і служыць.

З выказваннямі Платона сугучныя выказванні Арыстотэля. Усё чалавечае шчасце філосаф дзеліць на эўдаманію і эўтыхію. Эўдаманія лучыць у сабе толькі ўнутраныя, духоўныя даброты, якія складаюць вяршыню ўсіх вартасцяў і робяць чалавека саўдзельнікам сапраўднай шчаснасці. Эўтыхія ахоплівае толькі знешнія, гэта значыць, толькі цялесныя і маёмасныя даброты. Яны дадзеныя чалавеку з адзінаю мэтай — каб праз гэтых, так бы мовіць, памагатых навучыць і натхніць людзей чынна здзяйсняць высакародныя справы.

У «Эўфідэме» Платон гаворыць, што шчаслівымі людзей робіць не само валоданне добротамі, а іх разумнае выкарыстанне. Бо чалавек, не абазнаны ў мудрасці, не здольны як след распарадзіцца і сваім багаццем. З гэтым выказваннем, бадай, можна пагадзіцца. Сапраўды, чалавечае шчасце заключаецца ў правільным ужыванні добротаў, а дзейнічаць так можа толькі чалавек разумны. Зрэшты, і мудрэц, на мой погляд, не патрапіць належным чынам скарыстацца сваім дабро, калі не будзе сва-

бодны. Усякая чалавечая супольнасць, называная грамадствам, утвараецца дзеля таго, каб людзі праз агульнае паразуменне і ўзаемную падтрымку жылі памысна і шчасліва. А ніякага іншага спосабу забяспечыць прыстойнае і годнае жыццё людзі не вынайшлі, апроч як праз усталяванне міжсобку спакою і міру, гэта значыць — магчымасці свабодна і без турботаў карыстацца сваімі дабротамі. Дый навошта тыя даброты, калі няма як карыстацца імі? Або — як можна разумна выкарыстоўваць даброты, калі не маеш на іх дазволу? Адсюль вынікае, што нармальнае карыстанне каштоўнасцямі павінна спалучацца са свабодай такога выкарыстання. Чалавечае шчасце абумоўленае разумным і свабодным выкарыстаннем уласнасці.

Каб свабода кожнага заставалася цэлай і непарушнай і каб ёю не злоўжывалі сквапныя, прагавітыя, несумленныя людзі, грамадствам былі вынайдзеныя сродкі гамаваць чалавечае сваволле і нахабства. Такімі сродкамі ёсць законы. Яны ўтрымліваюць нормы сумленнага выконвання абавязкаў, а таксама прадугледжваюць пакаранне тых, хто парушае гэтыя нормы. Так што калі нехта не захоўвае грамадскага парадку добраахвотна, яго прымушаюць зрабіць гэта пад пагрозай кары.

Няма ніякай свабоды там, дзе законы або адсутнічаюць, або, калі яны ёсць, то хутчэй каб патураць свавольству ліхадзеяў, а не яго стрымліваць. З гэтага ясна бачна, якая свабода патрэбная. А менавіта — бяспечнае і без ніякага страху перад несправядлівасцю валоданне вышэй памянёнымі дабротамі, роўна як і разумнае, законнае карыстанне імі. Справядлівыя законы ўсяляк умацоўваюць грамадзянскую свабоду і нікому не дазваляюць злоўжываць дабротамі. Яны сцігуюць зламыснікаў, якія шкодзяць сваёй і чужой свабодзе. Бо ўсе парушальнікі справядлівых законаў і пастановаў не толькі падрываюць, але і душаць вольнасць асобы. Калі яны чыняць гвалт, нявечаць чалавека альбо рабуюць маёмасць грамадзян, яны ёсць прыгня-

тальнікамі чужой свабоды. І яны губяць уласную свабоду, калі, аддаўшыся блуду і распусце, аказваюцца подлымі рабамі сваіх жаданняў і нявольнікамі злачынстваў.

Ёсць правіннасці, якія шкодзяць толькі самому чалавеку, які іх здзейсніў. Але і гэта не можа служыць апраўданнем ганебных, рабскіх паводзінаў. Сапраўдная свабода адмаўляецца служыць як подласці, так і падлюгам. «Усе бязвольныя, — гаворыць Цыцэрон, — усе хцівыя, усе нікчэмныя ёсць рабамі, бо падпарадкаванне зломленага, прыгнечанага розуму, не здольнага на самастойнае мысленне, ёсць рабства». І далей ён кажа: «Ці свабодны чалавек, якім кіруе жанчына, якому яна па сваёй прыхамаці дыктуе законы, пастановы, загады, ставіць забароны, а той ні ў чым не можа ёй адмовіць, не адважваецца запярэчыць? Яна патрабуе — ён дае, яна кліча — ён прыходзіць, выганяе — ён ідзе прэч, пагражае — ён баіцца. Ды я такога, нават калі ён паходзіць з найвыбітнейшай сям'і, назаву не проста рабом, а рабом самым нікчэмным».

Неспатольныя жаданні настолькі збіваюць чалавечы розум з тропу, цягнуць яго то ў адзін, то ў другі бок, што сам чалавек, на думку Цыцэрона, практычна няздольны вызваліцца ад зла, якім ёсць рабства. Аднак дзяржава, як страж супольнай свабоды, дзеля захавання гэтай свабоды ўстанаўлівае законы, скіраваныя супроць злачынстваў, якія чыняць шкоду *выключна іншым* асобам. Гэтаксама і я не збіраюся вызваляць людзей ад усякага рабства ўвогуле і зацугліваць іх асабістую свабоду нейкім асабліва суровым законам. На мой погляд, свабода кожнага будзе забяспечаная дастаткова, калі законы ў грамадстве прымусяць людзей жыць так, каб ніхто нікому не шкодзіў.

## Раздзел IV

### Царская ўлада была ненавісная колішнім грэкам і рымлянам, бо супярэчыла свабодзе

Платон у трэцяй кнізе «Законаў» кажа, што грамадства, чые грамадзяне шануюць законы, знаходзіцца ў добрым і здаровым стане. Людзі павінны падпарадкоўвацца законам, калі хочуць сабе дабра. Платон сцвярджае, што свабодным і пазбаўленым страху можа быць толькі той, хто паважае і шануе законы. З гэтым вучэннем Платона ў многім сугучныя выказванні Арыстотэля. У адным са сваіх сачыненняў гэты філосаф робіць, у прыватнасці, такую выснову: «Мы рабы законаў, каб быць свабоднымі».

Аднак у любым грамадстве законы акажуцца нічога не вартымі, калі будзе адсутнічаць дзейсны нагляд за іх выкананнем. Таму заўсёды і ва ўсякай грамадзянскай супольнасці ў першую чаргу старанна абмяркоўвалі, каму даручыць кіраванне дзяржавай, каму даверыць дзяржаўную бяспеку, а таксама якая паўнамоцная ўстанова будзе сачыць за выкананнем законаў.

Ёсць некалькі спосабаў кіравання дзяржавай. Розныя народы ў залежнасці ад сваіх нораваў і звычаяў мелі розныя формы дзяржаўнасці. Паступова з іх вызначыліся тры асноўныя, якія адпавядаюць тром відам дзяржаўнай улады. Але сёння ў свеце амаль не знойдзеш іншай формы, апроч адной з тых трох, альбо, як вынік пэўных абмежаванняў, змешанай формы кіравання.

Калі вышэйшая ўлада належыць аднаму чалавеку, а ўсе астатнія яму падуладныя, — гэта манархічная форма праўлення. Пры арыстакратычнай форме ўладу чыняць аптыматы, ці знаць. Кіраванне грамадствам тады даручаецца некалькім найбольш выбітным асобам. Трэцяй формай з'яўляецца дэмакратыя, або народаўладдзе. Тут правяць ужо не манарх і не эліта, а народ.

Усе грамадзяне маюць аднолькавыя магчымасці кіраваць грамадствам і роўныя правы як на заканадаўчую, так і на выканаўчую дзейнасць.

Там, дзе кожная з гэтых формаў дзяржаўнасці захоўвае ўласцівы ёй статус, яна прыносіць грамадзянам шмат дабра і карысці. Але старажытныя рымляне і грэкі аддавалі перавагу народаўладству. Панаванне цароў, як супярэчнае агульначалавечай свабодзе, яны ненавідзелі. Але манархічная форма праўлення была ім нялюбая не таму, што сама па сабе ёсць дрэннай. Па тым часе, як піша Юстын, законамі былі меркаванні цароў. А нават калі маглі існаваць і нейкія пісаныя законы, то ўстанаўліваліся яны хутчэй з прыхамаці цароў, а не па волі і на карысць грамадзянаў. Усё дзеялася па хаценню і вяленню самадзержца. Ён сам па сабе, забыўшыся на супольны дабрабыт, кіраваў грамадствам. Такое кіраванне непазбежна спалучалася з падняволеннем і прыгнётам.

Пра законы цары не дбалі зусім альбо дбалі надзвычай мала. Своеасаблівым сведчаннем гэтаму служаць паводзіны адной суполкі знатных рымскіх юнакоў, якія запатрабавалі, каб выгнаных з Рыма цароў вярнулі ў горад. Прычынай такому рашэнню стала тое, што пасля выгнання цароў рымляне абвясцілі ўсеагульную роўнасць і замацавалі яе ў выглядзе адпаведных законаў. Юнакі не змаглі цярпець на сабе вярыгі законаў. На іх думку, сваволле пры царах якраз і было свабодай, а падпарадкаванне законам стала рабствам. Як сведчыць Лівій, цар, на іх думку, быў усё ж чалавекам. У яго можна было папрасіць і добрае, і дрэннае. У ім было месца для міласэрнасці і дабрачыннасці. Ён мог угнявіцца і злітавацца, адрозніваў сябра ад злосніка. А законы — глухія і няўмольныя. З іх больш карысці слабаму, а не моцнаму. Калі пераступіш закон, табе ўжо не будзе ні літасці, ні спагады. А жыць бездакорным жыццём сярод сціжмы заганаў і хібаў — нават небяспечна.

Адсюль сама напрошваецца выснова: царская ўлада ўяўлялася тым маладзёнам такой, пры якой манарх дзейнічае, абапіраючыся не на дабро і справядлівасць, і кіруецца ў сваіх словах і справах не розумам і мудрай парадай, а робіць усё, як яму закарціць. Невінаватага ён можа пакараць, а вінаватага апраўдаць. Але такое чыніць не цар, а тыран.

Манарх, які ўзначальвае і вядзе свой народ, кіруе ім з дапамогай законаў і асабістага прыкладу. Ён уяўляе сабой для ўсіх узор чалавека, які жыве сумленным, прыстойным жыццём. Паміж манархам і законам нават ёсць падабенства. Для нас манарх — гэта закон, які здольны гаварыць. Ён прамаўляе сваімі вуснамі дабратворную норму закона, запісаную на паперы ці на скрыжалях.

Згадаю яшчэ некалькі сведчанняў антычных пісьменнікаў адносна манархіі. Пасля таго, як імператар Актавіян Аўгуст вайною дамогся міру і ў Рымскай дзяржаве зноў запанавала спакойнае жыццё, ён вырашыў адмовіцца ад улады і перадаць яе Рыму. Сярод самых блізкіх і знакамітых сяброў, запрошаных ім у якасці дарадцаў, ягоны друг Мецэнат не ўхваліў імператарскага намеру і параіў Актавіяну захаваць уладу. Ён даводзіў, што, калі кесар не тыран, а самаўладца, які чыніць дабро, яго ўлада нічога не адымае ад агульнай свабоды. Мецэнат казаў слушна. Калі пазней гэтая прапанова абмяркоўвалася пры шырокай аўдыторыі ў Сенаце, яе ўхвалілі найвыбітнейшыя і наймудрэйшыя мужы.

За мінулыя стагоддзі, аднак, манархія, або самаўладдзе, набыло сабе кепскую славу. Але ганіць за гэта трэба не саму манархію, якая можа быць для грамадства і карыснай, і выгаднай, а вераломства людзей, якія узурпуюць празмерную, не абмежаваную ніякімі законамі ўладу над іншымі. У нашыя дні ўжо не чалавек — тыран над законамі, а закон — гаспадар над чалавекам. І сёння самаўладдзе ўжо не заслугоўвае былой

нянавісці і асуджэння. Болей за тое, цяпер яго паўсюль хваляць і менавіта яму аддаюць перавагу самыя магутныя народы.

Зразумела, што і ў нашым грамадстве каралеўская ўлада дзейнічае ў прасах пэўных абмежаванняў. Кароль не мае права ўстанаўліваць якія-небудзь законы без адпаведнай згоды ўсёй грамадзянскай супольнасці. Перш чым атрымаць стырно кіравання дзяржавай, кароль падчас каранацыі павінен прысягнуць народу і ўрачыста абяцаць, што ніколі і нічога не зробіць насуперак існуючым законам. А калі ён нешта падобнае ўчыніць і яго рашэнні і пастановы парушаць вернасць і святасць прысягі, у такім выпадку яны не будуць лічыцца прававо нормай і не набудуць ніякай юрыдычнай сілы.

Але ўявім сабе, што каралеўская прыхамаць вераломна пераступіла законы, нейкім чынам парушыла свабоду грамадзянаў і дамаглася жаданага. Дык вось нават у гэтым выпадку абвінавачваць трэба не каралеўскую ўладу і яе годнасць саму па сабе, а пэўную асобу — караля, які нядобрасумленна выконвае свае абавязкі, роўна як і тых дарадцаў і ахоўнікаў манарха, якія, хоць і маглі, не ўтрымалі яго ад нядобрага ўчынку.

Калі нехта з іх, баючыся каралеўскае ўсёмагутнасці, не адважваецца раскрыць рота, каб запярэчыць манаршай прыхамаці, ён паводзіць сябе як нікчэмны баязлівец. Кожны, хто дзеля каралеўскай міласці і дароў маўчыць і не кажа, што ён сам думае, — вінаваты праз сваю несумленнасць і крывадушнасць.

# Раздзел V

## Якія ў грамадстве павінны быць законы, каб грамадзяне напраўду мелі свабоду

З усяго сказанага няцяжка зразумець: ніякае грамадства не можа ганарыцца сапраўднай свабодай, калі не ўсе яго грамадзяне жывуць адпаведна законам. Ніхто не будзе аспрэчваць, што ў чалавечай супольнасці, дзе адсутнічаюць прававыя нормы жыцця, якія прадугледжваюць пэўныя санкцыі супраць правапарушальнікаў, усе або прынамсі слабейшыя застаюцца ў рабскай прыгнечанасці. Аднак у розных частках свету заўсёды былі і ёсць шматлікія народы, якія, хоць і жывуць адпаведна з законнымі нормамі, але не могуць пра сябе сказаць, што цалкам вызваліліся ад няволі. Таму не без падставы ўзнікае патрэба даць слову «закон» азначэнне, каб у выніку скажонай інтэрпрэтацыі недасведчанымі яго не палічылі за інструмент прыгнёту.

Усе вучоныя ў цэлым пагаджаюцца на тым, што закон ёсць падмурак свабоды. Цыцэрон у першай кнізе «Законаў» вызначае яго як закладзены ў прыродзе найвышэйшы розум, які загадвае, што трэба рабіць, і забараняе, чаго рабіць не трэба. Іншымі словамі, але ўкладаючы ў іх такі самы сэнс, ён у другім месцы піша: «Закон ёсць дадзены багамі здаровы розум, які змушае рабіць дабро і забараняе адваротнае». Да гэтых выказванняў далучаецца Дэмасфен. Ён сцвярджае, што закон ёсць вынаходніцтва і дарунак багоў, якія замацавалі ў галовах людзей паняцці справядлівасці, роўнасці і дабра. Менавіта законы даюць дабратворныя, гаючыя нормы чалавечых паводзінаў ва ўсіх сферах жыцця, спрыяючы захаванню грамадзянскай супольнасці. Таксама і Арыстотэль хоча, каб законы стасаваліся з разумнай прыроднаю рацыяй. Калі ж яны разыходзяцца са справядлівы-

мі натуральнымі правіламі, то ніякіх падставаў называць такія нормы законамі няма.

А хто будзе называць законам, а не пачварным, гнюсным злачынствам даўні звычай кіпрыётаў, якія перад шлюбам змушалі дзяўчат да прастытуцыі, альбо норавы аўгейцаў, якія ў першую шлюбную ноч пускалі сваіх маладзіц на агульнае каханне? Індусы забівалі знямоглых састарэлых бацькоў, а потым забітых з'ядалі, бо лічылі сваё цела за самы пачэсны магільны склеп. Усё гэта цалкам варварскія і жорсткія звычаі, якія не стасуюцца з паняццямі нармальнага чалавечага розуму. А таму абсурдна і недарэчна даваць падобным завадам найменне закона.

Ніякая норма, якая па прыродзе сваёй не абапіраецца на дабро і справядлівасць, не можа мець у чалавечым грамадстве сілу закона. А сярод разнастайных людскіх дасягненняў ёсць нямала паняццяў, прадыктаваных чалавеку яго натуральным розумам і ўкладзеных у яго свядомасць самой прырода, у прыватнасці: не гвалціць дзявочай нявіннасці, не квапіцца на чужое дабро і не замахвацца на жыццё. Але насуперак усеагульнаму досведу варварскі, дзікі народ парушыў натуральныя нормы чалавечнасці і ўвёў бязглуздыя, шкодныя для жыцця ідэі ў практыку абрадавых звычаяў. Тым не менш яму не ўдалося зрабіць, каб гэтыя звычаіператварыліся ў норму і набылі аўтарытэт закона. Урэшце яны выйшлі з ужытку і зніклі.

І ўсе законы, якія супярэчаць нармальнаму розуму, будуць выклікаць супраціў у грамадстве, аж пакуль іх, як гібельныя і разбуральныя, не адменіць сама ўлада або не скасуе паўстаўшы народ. Такім чынам, каб забяспечыць людзям сапраўдную свабоду і трывалы спакой, пад найменнем закона ў жыццё грамадзянскай супольнасці трэба ўводзіць толькі такія нормы, якія дыктуе розум і падказвае рацыянальная думка.

Ёсць нязменны, пастаянны закон прыроды: не чыніць ні над кім гвалту, кожнаму аддаваць ягонае і, як кажа Цыцэрон,

стрымліваць сваю прагнасць, берагчы ўласнае і адводзіць ад чужога думкі, вочы і рукі. Калі жыццё асобы ў грамадстве абароненае ад забойства і здзеку і маёмасці чалавека не пагражае разрабаванне, то і ўвесь народ пачуваецца ў поўнай бяспецы. У такім грамадстве і сэнс салодкага слова «свабода» застаецца ўстойлівым і непарушным.

# Раздзел VI

## Пра траісты статус грамадзян у нашым грамадстве і пра тое, ці ўсе карыстаюцца аднолькаваю свабодай

Калі дзе-небудзь і былі народы, якія карысталіся вольнасцю, то сваёй прыналежнасцю да іх можа пахваліцца і наш слаўны народ, прычым настолькі, што яму ў гэтым, бадай, належыць пяршынства. Пра гэта гавораць не толькі на нашых соймах. Шматлікія допісы сведчаць, як моцна хваляць нашу свабоду. Кажуць, што такая — уласцівая толькі нашаму народу. Але каб залішняя любоў да свайго не абярнулася пустым самахвальствам і каб людзі мудрэйшыя не пачалі даводзіць нам адваротнае, мы, на мой погляд, павінны быць у гэтых рэчах больш памяркоўнымі і прыслухоўвацца больш да чужых словаў, а не да свайго славаслоўя.

Мы нярэдка памыляемся, разважаючы пра стан рэчаў у нашым жыцці, а тым часам чужая ацэнка нашай рэчаіснасці аказваецца нашмат дакладнейшай і праўдзівейшай. Гартаючы замежныя кнігі і даследуючы іх змест, я, здаецца мне, не заўважыў, каб хто-небудзь расхвальваў такое ўжо вялікае шчасце нашага існавання. Многія нават сцвярджалі, што ўсё якраз-такі наадварот. Паколькі ж большасць падзеяў адбываюцца ў будзённым жыцці, навідавоку ў многіх, то нам не спатрэбяцца ні вялікія намаганні, ні доўгія і складаныя разважанні, каб высветліць і вызначыць канкрэтныя факты.

У нашым народзе ў цэлым адрозніваюць тры грамадзянскія станы. Таму будзе дарэчы разгледзець умовы жыцця кожнага з іх і вызначыць, ці яны раўнапраўныя або свабодай надзеленая толькі адна нейкая частка грамадства. Мы маем шляхту, гараджан і сялян. Іх вылучаюць і раздзяляюць даволі значныя адрозненні, а менавіта — адметны від дзейнасці, своеасаблівы лад жыцця,

неаднолькавы прававы статус. Шляхта, не звязаная з паднявольным механічным рамяством, займаецца толькі вайсковымі справамі, каб заўсёды быць гатовай абараніць айчыну ад варожай навалы. Гараджане садзейнічаюць агульнаму дабрабыту сваімі таварамі або прадметамі ўжытку, якія аднекуль прывозяць або вырабляюць у сваіх майстэрнях. Сяляне апрацоўваюць зямлю і сваёй працай кормяць астатніх.

Што ж да правасуддзя, то па адной і той жа справе існуюць законы асобна для шляхты, асобна для гараджан і асобна для сялян. Ужо адно гэта паказвае: разуменне свабоды тут неаднолькавае. Я ўжо не кажу пра шматлікія крыўды, якія шляхта чыніць простаму люду. Але ў судзе шляхціцу гэта абыходзіцца лёгкім спагнаннем. А вось калі шляхціца пакрыўдзіць або зняважыць прасталюдзін, дык яму пакаранне будзе назначанае нашмат цяжэйшае і суровейшае. Учыненае забойства таксама ўзважваецца правасуддзем не на аднолькавых шалях. Для злачынцаў розных станаў пакаранне рознае. Гэта пацвярджае, што толькі шляхта мае перспектыву свабоды, астатнія станы носяць кляймо пэўнай прыгнечанасці.

Сапраўды свабоднымі грамадзянамі можна назваць толькі тых, хто надзелены ў грамадстве роўнымі і аднолькавымі правамі. Калі ж нехта мае юрыдычную перавагу і можа беспакарана чыніць гвалт і насілле, у такім грамадстве адны, па сутнасці, пануюць, а другія гібеюць у падняволлі. Кажучы гэта, я не маю на мэце ліквідаваць усякае адрозненне шляхты ад плебсу. Я хачу, каб роўнасць і справядлівасць, якія належаць усім у арыфметычнай прагрэсіі, не былі падарваныя нейкімі заганнымі інстытуцыямі, каб замест усеагульнай свабоды ў грамадстве не ўзяла верх алігархія або ўлада нямногіх. Няхай за шляхтай застаюцца цэлымі яе прывілеі, у адпаведнасці з якімі яна з ласкі сваіх каралёў і магнатаў вызваляецца ад усіх нявольніцкіх павіннасцей, а таксама ад падаткаў. Але каб улада і правы шляхты на

чужую свабоду былі большыя, чым улада і правы іншых на яе свабоду — гэтага не павінны дазваляць ніякі закон і ніякае справядлівае права. Прынцып роўнасці ўсіх перад законам адмаўляе такую няроўнасць як нешта пачварнае і злачыннае.

Калісьці па нейкім злашчасным звычаі такую неабмежаваную ўладу мелі толькі рабаўладальнікі. У той час людзі, ахопленыя сляпой прагаю панавання, забылі пра ўсякую гуманнасць і дазвалялі сабе распараджацца жыццём і смерцю рабоў. Але такая празмерная вольнасць была пазней зацугляная з дапамогай законаў. І хоць гаспадары маглі пакараць раба, які правінаваціўся, але забіваць нявольніка беспакарана ўжо не маглі. Каб неабмежаваная ўлада рабаўладальнікаў не перарасла ў дэспатызм, былі нават пазначаныя акалічнасці, пры якіх рабам дазвалялася падаваць скаргу, прычым не толькі на старонніх, але і на сваіх гаспадароў, і выступаць у судзе.

А ў нашага народа няма ўпыну ні на якую хэнць. Селяніну не дадзена права падаваць скаргу не толькі ў сувязі з захопам яго маёмасці. Ён не мае права паскардзіцца на пана нават тады, калі той учыніў забойства. Але чаму б і пану не кіравацца тым, чым кіруюцца іншыя? Чаму яму дазваляецца забіваць столькі халопаў, колькі ён хоча, абы толькі плаціў нязначнай гатоўкай за смерць забітага? Шкада, што наш народ (між іншым, найгуманнейшы) альбо ставіцца да гэтых дзікіх законаў паблажліва, альбо, хоць і не любіць іх, надта ўжо доўга заплюшчвае вочы на несправядлівую няроўнасць людзей, не сумяшчальную са здаровым розумам.

У грамадстве дастаткова ўжо, каб людзі адрозніваліся па сваім грамадзянскім стане, родзе заняткаў і абавязках. Няхай кожны робіць сваё і не лезе ў чужую справу, да якой не здатны. Тады захаваецца прынцып геаметрычнай, або дыстрыбутыўнай справядлівасці. Калі ж перад законам роўныя не ўсе, калі адна частка грамадзян надзеленая большымі правамі ці вольнасцямі

ў параўнанні з іншымі, дык на маю думку, гэта ўжо хутчэй нейкае бесчалавечнае і варварскае дзікунства, а не справядлівае заканадаўства. Камутатыўная справядлівасць, якую філосафы называюць арыфметычнай, не прызнае адрознення паміж чалавекам шляхетным і простым, багатым і бедным, яна ўсіх надзяляе пароўну. Яна не бачыць ніякай розніцы між асобамі і ўсякую ўчыненую шкоду, а таксама забойства карае аднолькавай адпаведнаю карай.

Калісьці прыродны розум вызначыў гэтыя нормы яшчэ ў свядомасці паганскага грамадства і дазволіў захаваць іх у пазнейшых супольнасцях. І вялікая ганьба нам, хрысціянам, што дазваляем колішнім паганцам быць вышэйшымі за нас у прававо́й справядлівасці і гуманнасці. У Пісанні ёсць шмат справядлівых законаў, навеяных Святым Духам. Гасподзь гаворыць вуснамі Майсея свайму народу (Другазаконне, I): «Судзіце па справядлівасці, не робячы ніякай розніцы паміж братам і чужаземцам; выслухоўвайце малога так, як і вялікага, не зважаючы на асобу». Мудры цар Саламон кажа: «Царскі пасад, які судзіць бедных па справядлівасці, будзе навекі шчаслівы».

Няхай ніхто не спадзяецца, што трывалы мір і спакой усталююцца ў грамадстве, дзе мацнейшым паслабілі цуглі і тыя прыгнятаюць слабейшых. Менавіта з гэтай прычыны найчасцей узнікаюць смуты, звады і войны. Усе яны падрываюць і разбураюць грамадства, падаграваюць думкі і жарсці сярод грамадзян і парушаюць між імі згоду, якая ёсць істотнай умовай стабільнага выніку чалавечай дзейнасці. І калі ў якасці прыкладу трэба спаслацца на нейкі народ ці краіну, то яскравым узорам такога бедства можа паслужыць суседняя з намі, а значыць, і больш нам знаёмая Лівонія. Яна — наглядны доказ таго, што несправядлівасць можа прыводзіць да самых згубных наступстваў. Хто не ведае, з якою пыхай, з якім нахабствам і жорсткасцю шляхта панавала там над сялянамі і халопамі? Усё гэта вядома добра —

настолькі, што спыняцца асобна няма патрэбы. А потым сталася так, што на Лівонію пайшоў вайною маскоўскі тыран. І калі ён шырокім фронтам пачаў пустошыць краіну агнём і жалезам, то яе сяляне ў пераважнай сваёй большасці самі наводзілі рабаўнікоў на маёнткі шляхты і спешна пераходзілі ў непрыяцельскую веру. Сумнае і мізэрнае відовішча яшчэ і сёння служыць дастатковым сведчаннем таго, якая пляга напаткала той край, дзе людзей забівалі тысячамі, а безліч знатных жанчын і шляхетных дзяўчат, а таксама дзяцей было сагнана ў жорсткую, акрутную няволю.

Таму ўсім, хто хоча, каб яго грамадства было ў бяспецы, трэба імкнуцца да ўсталявання роўнасці людзей розных станаў перад законам. Вядома, умовы жыцця ў адных лепшыя, ў другіх горшыя. Але ніхто не павінен цярпець несправядлівасць ад іншага з прычыны прававой няроўнасці.

Асаблівая ўвага гэтаму надавалася ў мудрай Рэспубліцы вэнэтаў. І хоць стан патрыцыяў, або знаці, карыстаўся ў ёй вышэйшымі прэрагатывамі, а з плебеяў ніхто і ніколі не дапускаўся да кіравання дзяржавай, але за ўсё доўгае існаванне той імперыі ў ёй ніколі не ўзнікалі паўстанні ці смуты. Плебс не меў ніякай зачэпкі патрабаваць пераменаў, у яго не ўзнікаў нават цень недаверу ці падазронасці да патрыцыяў. Кантарэнус у сваім аповедзе пра Рэспубліку вэнэтаў бачыць прычыну гэтага ў тым, што вэнэты спрадвеку трымаліся звычаю продкаў, паводле якога ўсе, вялікія і малыя, мелі аднолькавыя правы. Ніхто не мог беспакарана чыніць несправядлівасць нават прасталюдзіну. Калі ж знатны крыўдзіў плебея, то гэта, кажучы словамі Кантарэнуса, заўсёды лічылася за вялікае святатацтва й злачынства. Ветрагон, які хоць аднойчы насмельваўся здзейсніць такое, не меў ніякага шанцу пазбегнуць кары. І яго пакаранне было тым болей суровым, чым вышэйшымі былі яго слава і годнасць.

Няхай бы і нашая шляхта сапернічала сваёй адметнай, прыгожаю сціпласцю з цудоўнай Рэспублікаю вэнэтаў замест таго,

каб выхваляцца, у якім жорсткім прыгнёце і бясправʼі яна трымае паспаліты люд. Бо хоць вэнэты і дазвалялі плебеям мець правы, але годнасць і знатнасць патрыцыяў праз гэта ніяк не цярпела. Тое самае было б і ў нас, і нічыя шляхетнасць не пахіснулася б. А пакуль кожны мерае сваю свабоду магчымасцю падняволіць іншых. У выніку прыгожае слова «свабода» ўжо страціла значную частку свайго сэнсу.

Нялёгка абмежаваць уладу, калі кожны імкнецца ўзвысіцца, каб закабаліць другога. Як слушна павучае Лівій, празмерная свабода, якая ператвараецца ў цяжар для слабейшых, аказваецца неўтаймоўнай і небяспечнай і для саміх самаўладцаў. А вось калі свабода абмяжоўваецца, яна карысная ўсім — і асобнаму чалавеку, і грамадству. Паколькі ж, аднак, жадаць здаровага і шчаслівага грамадства лягчэй, чым яго пабудаваць, то пакінем гэта на Бога і мудрацоў. А самі коратка прыгадаем, якімі вольнасцямі шляхта карыстаецца ў народзе і дзякуючы якім прэрагатывам узвышаецца над простым людам. Але спачатку будзе нялішнім і нават дарэчным даць сціслую характарыстыку шляхты, акрэсліўшы яе сутнасць і паходжанне.

# Раздзел VII

## Знатнасць, яе сутнасць і паходжанне

Паўсюль у сваіх сачыненнях і сам Арыстотэль, і многія іншыя філосафы характарызуюць знатнасць як знакамітасць продкаў і славу прашчураў, якая нібыта па нейкім спадчынным праве распаўсюджваецца на іхніх нашчадкаў. Пакаленне, прадстаўнікі якога вызначыліся асабліваю дабрачыннасцю, ці заслужылі вялікую павагу і пашану, ці праславіліся багаццем і сілаю, амаль заўсёды пакідала сваім патомкам фамільную годнасць і веліч, якою само карысталася пры жыцці. Як сведчыць Арыстотэль, знатнасць складаецца са спалучэння двух кампанентаў: высакародных якасцяў і багацця. Аднак рэчаіснасць паказвае, што аўтарытэту імя садзейнічаюць не так высакародныя якасці, як багацце і тытулы продкаў.

У рымлянаў найменне *patricii* (знатныя) паходзіла ад слова *patres* (бацькі) або *senatores* (старэйшыя), якіх калісьці выбіраў Ромул. Не высакародныя якасці, а пасад і абавязкі пэўных асобаў забяспечвалі ім павагу сярод астатніх. Дый якая магла быць высакароднасць у тым зборышчы, дзе не было ніякай розніцы паміж рабом і свабодным і дзе ўсе яны, цёмныя прасталюдзіны, урэшце знайшлі сабе прыстанак.

Слынным і знатным чалавека могуць зрабіць высакароднасць продкаў, вялікае багацце, годнасць, аўтарытэт ці ўсё разам узятае. Але на чым бы ні грунтавалася славутасць сям'і, яна пераходзіць нашчадкам, і яе называюць знатнасцю. Зрэшты, цяпер мы вядзем гаворку не пра тую знатнасць, якую чалавек заслугоўвае сваёй высокай маральнасцю і дабрадзейнасцю, а пра агульнапрынятую ў народзе знатнасць, падставаю якой служыць рэпутацыя продкаў. Шмат хто на поўным сур'ёзе сцвярджае, нібыта для такой знатнасці пры ўсіх яе іншых выгодах таксама

ўласцівая пераемнасць. Словам, семя вартасцяў, якімі валодалі папярэднікі, пераходзіць і да іх нашчадкаў, дзякуючы чаму тыя робяцца такімі самымі, як і продкі. Можна часта пачуць, як цытуюцца такія вершаваныя радкі:

Моцных выводзяць на свет здаравейшыя, моцныя,
Сіла бацькоў да быка й жарабца пераходзіць.
Голуба міру — птушкі спакою і згоды
Не спараджае ніколі арол-крыважэрца.

Вышэй адзначалася, што знатнасць не заўсёды паходзіць ад праяўлення высакародных якасцяў. Часта яе паходжанне абумоўленае багаццем або аказанымі пашанотамі. Таму будзе марнаю спроба звесці да нечага аднаго тое, што ёсць шматаблічным.

Няхай знатнасць дасталася камусьці ад продкаў, слынных сваёй дабрадзейнасцю і выключнаю чалавечнасцю. Але ж гэта не падстава лічыць, што гэтыя якасці абавязкова і самі сабой адродзяцца ў нашчадках і што ім дзеля гэтага не трэба ўжо ні навукі, ні працы, ні намаганняў, якія ў немалой ступені паспрыялі знатнасці і славе іх папярэднікаў. Я, вядома, не адмаўляю, што вартае найчасцей і спараджаецца вартым. Знатныя нашчадкі нярэдка маюць столькі добрых задаткаў, што дасягаюць багатага плёну, прыкладаючы зусім мала высілкаў. Але ж нельга ўзводзіць гэта ў абавязковы закон, паводле якога знатнымі нібыта нараджаюцца заўсёды і ўсе нашчадкі знатных бацькоў, прычым самым натуральным чынам. Падобнае меркаванне ўяўляецца мне настолькі абсурдным, што высоўваць супраць яго нейкія падрабязныя контраргументы я не бачу ніякае неабходнасці. Сваімі вартасцямі чалавек перадусім абавязаны вялікае ласцы Бога, які, не зважаючы на асобу, надзяляе выбітнымі здольнасцямі, талентам і розумам тых, да каго мае прыхільнасць. Нярэдка дзеці простых бацькоў нараджаюцца з такімі шчаслівымі задаткамі, што дзякуючы сваёй энергіі і дараванням дасягаюць пазней незвычайнае славы. А бывае і наадварот. Патомкі знатных і вы-

сакародных продкаў дэгенеруюць настолькі, што здаецца, гэтыя выпладкі толькі й імкнуцца, каб узвысіцца над дабрачыннасцю папярэднікаў сваёю бязэцнасцю, і лічаць прыстойным паганіць сваё жыццё розным паскудствам. Вельмі слушна кажа Патрыярх: «Знатнымі не так нараджаюцца, як становяцца». Ён адмаўляе знатнасць як спадчынную каштоўнасць: «Не па сваёй волі кажу гэта. Сама рэчаіснасць паказвае, што ў знакамітага мужа рэдка ўдаецца знакаміты сын». Каб такую няздатнасць не прыпісвалі нейкаму аднаму веку, згадаю словы найстаражытнейшага паэта Гамэра, які ў засмучэнні праз гэткую злыбеду дадае:

Надта ўжо мала дзяцей бываюць такімі, як тата,
Дрэнных — дык больш, а здатнейшых за бацьку,
на жаль, небагата.

Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Куды ні глянь, паўсюль бачыш, што сыны вельмі рэдка адпавядаюць бацькам па сваіх вартасцях. Мужныя продкі праславілі сябе ў свой час у бітвах з ворагам, а сыны і ўнукі, маладушныя і лайдачыя, аказваюцца няздатнымі да вайсковае чыннасці. Папярэднікі вылучаліся ва ўсім стрыманасцю і памяркоўнасцю, а пасля сябе нярэдка, каб не сказаць заўсёды, пакідалі, на жаль, нядбалых патомкаў, якія купаліся ў раскошы і распусце. З кніг і жыццёвага досведу ўсім нам вядома, што і ў разумных бацькоў дзеці бываюць неразумныя, і ў адукаваных — неадукаваныя, і ў справядлівых і добрых — жорсткія і бесчалавечныя.

Пакінем, аднак, падзеі нядаўняга часу і ўспомнім сівую мінуўшчыну. Хто не адчуваў замілаванне іудзейскім царом Майсеем? Хто не захапляўся яго незвычайна мудрым праўленнем, нязломнай сілаю духа, справядлівасцю і міласэрнасцю? А вось пра ягоных сыноў Элізара і Гірсама ў Святым пісанні гаворыцца вельмі мала. Гэта сведчыць, што ў Майсеевых сыноў не было і пробліску бацькавых вартасцяў. Дый сам Майсей ніводнага з іх не прызначыў сваім спадкаемцам, хоць законы дазвалялі такую

натуральную пераемнасць. Ён бачыў, што сыны не адпавядаюць тым абавязкам, якія выконваў сам, і выключыў іх з гэтага поля сваёй дзейнасці.

А славуты шматлікімі вартасцямі цар Давід? Якіх толькі бед не спазнаў ён ад сваіх подлых і гнюсных сыноў. Адзін з іх, урэшце, прагнаў бацьку на край царства, і жыццю і ўсёй маёмасці цара пагражала небяспека. І толькі пасля забойства сына Давід зноў змог спакойна ўладарыць у сваім царстве.

Ад цара Эзэкія, вартага найвышэйшай ухвалы за імкненне адрадзіць сапраўдную рэлігію, яго сын Манасія атрымаў у спадчыну царства, але не бацькоўскую дабрадзейнасць. Сын вярнуў культ фальшывага бога і пашырыў яго, жорстка пераследуючы святых прарокаў. Ён асудзіў на пакутную смерць прарока Ісаю.

Калі ж прыгадаць і паганства, то і яно дае нам паўсюдна шмат прыкладаў. Вось некаторыя з мноства. Слаўныя дзеі рымскага імператара і філосафа Марка Антонія праменяцца тым ярчэйшым бляскам, чым нікчэмнейшым аказаўся ягоны сын, які ўзышоў пасля яго на імперскі трон. Германік, знакаміты сваёй мудрасцю і высакароднасцю, пасля сябе пакінуў сына Калігулу — па сутнасці, не чалавека, а вылюдка. Маладушны, пажадлівы, жорсткі, сын быў зусім не падобны да бацькі. Здаецца, Калігулу спарадзіў нават не чалавек, а звяруга. Імператар Аўгуст, яскравы ўзор чалавечай годнасці, быў так абураны распустай сваіх дачок, што неаднаразова ўголас паўтараў Гамэравы словы: *«Лепш бы я жонкі не меў і да скону бяздзетны застаўся»*.

Ад выбітных бацькоў вельмі рэдка нараджаюцца вартыя іх дзеці. Таму ўяўляецца вельмі няпэўным і хісткім сцвярджэнне, паводле якога нашчадкі разам з шляхецтвам, што дастаецца ім ад папярэднікаў у спадчыну, атрымліваюць, быццам якую маёмасць, і высокія чалавечыя якасці. Як ужо адзначалася, адных прырода надзяляе добрымі задаткамі больш, чым другіх. Пры

гэтым, калі ты будзеш лайдаком і не прыкладзеш вялікага намагання і працы, каб узгадаваць і ўзрасціць закладзенае ў цябе зерне, то замест добрага плёну атрымаеш адзін чартапалох. Талент, які тоіцца ў чалавеку, падобны да іскаркі. Падзьмеш, падкладзеш распалу — і загарыцца яна яркім полымем. А перастанеш дбаць і клапаціцца пра сваю іскарку — давядзеш да таго, што яна ніколі ўжо не засвеціць. Вельмі трапна і мудра пісаў пра гэта паэт Гесіёд. Багі наўмысна зрабілі так, каб памясціць высакароднасць на крутой строме. Дарога туды вядзе цяжкая і цярністая. І няхай ніхто не падумае, што дасканаласці можна дасягнуць, гуляючы ды палежваючы, што ўсё прыйдзе само сабой і дзеля гэтага не спатрэбяцца ніякія старанні й высілкі.

Тым больш недарэчным і смешным выглядае аблуднае і марнае перакананне тых, хто, атрымаўшы ад продкаў знатнасць, выхваляецца ёю, быццам нейкаю асабістаю вартасцю, з пагардаю ставячыся да астатніх, нават самых таленавітых. Нікчэмныя людзі замест існых каштоўнасцяў ганяюцца за іх ценямі. Не маючы іх саміх, яны цешаць сябе пустымі прывідамі.

Яшчэ больш здзіўляе, што гэтая заганная аблуда — ўласцівая не толькі нашай сучаснасці ці нядаўняй мінуўшчыне, але панавала і ў далёкі старажытны час. Аднак мудрыя і адважныя мужы ў прамовах сваіх і ў пісаннях заўсёды адмаўлялі такія погляды. Салюстый, выхваляючыся даўняю сваёй радавітасцю, упікнуў Цыцэрона тым, што той атрымаў знатнасць зусім нядаўна. На гэты марны папрок Цыцэрон адказаў: «Сваёй дабрачыннасцю я стаў для маіх продкаў светачам. Калі раней пра маіх крэўных ніхто не ведаў, дык цяпер памяць пра іх возьме свой пачатак ад мяне. А ты праз жыццё, якім ты жывеш, засланіў сваіх продкаў, скінуўшы іх у змрок забыцця, і цяпер пра іх, калісь знакамітых, ніхто ўжо не ўспомніць».

Марый, якога нобілі зневажалі за нізкае паходжанне, адказваючы на лаянку, даводзіў, што іх разуменне высакародства як

неад'емнага спадарожніка знатнасці — памылковае і абсурднае. Іх продкі пакінулі ім усё, што можна: багацце, гербы, памяць пра сябе. А вось высакародства не пакінулі. Яно адзінае, што не даецца і не атрымліваецца як дарунак. Хто хоча праслаўіцца высакародствам, не павінен быць гультаём і лежабокам. Той жа Марый кажа далей: «Каб людзі паверылі мне, я не буду тыкаць ім у вочы выявы сваіх продкаў, выхваляцца іх перамогамі ці консульскімі рангамі. Калі спатрэбіцца, я пакажу ім свае коп'і, свае харугвы, свае фалеры і іншыя вайсковыя адзнакі, а таксама шматлікія шнары на маіх грудзях. Гэта ёсць мае продкі, гэта ёсць мая знатнасць. Яна дасталася мне не за так, як ім — проста ў спадчыну. Я здабыў яе цяжкаю працай і чыннасцю, рызыкуючы ўласным жыццём».

Высакародства патрабуе вялікай упартасці ў пераадоленні цяжкасцяў. Яго не здабудзеш гультайствам, не атрымаеш у спадчыну — яно прыходзіць як скутак тваіх усё больш дасканалых учынкаў. Пра гэта сведчыць і паэт, калі кажа:

> Той, хто хацеў дасягнуць у рысталішчах пэўнае мэты,
> Змалку вучыўся трываць, змагаўся і ў спёку і ў сцюжу;
> З Бахусам не сябраваў, пазбягаў і любошчаў Венеры.

Умельства не ёсць вынікам знатнасці. Яно не даецца прыродай, а набываецца стараннем і працай. Але знатнасць дае пэўныя перавагі і прывілеі. У прыватнасці, істотную адметнасць асобам знатнага паходжання надае тое, што іх успрымаюць як своеасаблівых носьбітаў святла ў грамадстве. Зыркі агонь гэтага святла адразу высвечвае ўсе добрае і вартае ўхвалы, што робяць нобілі. І людзі хутка дазнаюцца пра іх высакародныя ўчынкі.

Выхадцы з нізоў пазбаўленыя такой ласкі. Толькі ў выніку неймаверных заслуг і неверагодных разумовых і фізічных высілкаў прасталюдзіны могуць здабыць прызнанне й вядомасць. І нават стаўшы знакамітымі, яны вымушаныя цярпець воўчую непрыязь шматлікіх ненавіснікаў і зайздроснікаў. У пацвер-

джанне гэтаму я мог бы прывесці шмат прыкладаў ад самай антычнасці, але ж яно і без таго добра вядома, бо адбываецца амаль кожны дзень.

У знаці такіх перашкодаў няма. Іх ніхто не ўздумае папікнуць, калі, спасылаючыся на дзедаўскую ці бацькоўскую славу, яны таксама будуць чыніць на сваім шляху добрыя справы. Слава продкаў бачыцца тут як бы ўласцівай нашчадкам. «Мы ўсе добразычліва ставімся да людзей знатных, — гаворыць Цыцэрон. — Грамадству карысна, калі ў ім ёсць высакародныя патомкі, вартыя сваіх папярэднікаў, бо такім чынам жыве і памяць пра знакамітых мужоў, якія ў свой час вызначыліся сваімі заслугамі перад дзяржавай». А вось калі нехта аказваецца не падобным да сваіх знакамітых продкаў, яго вобраз выглядае тым болей агідным, чым большыя надзеі ўскладаліся на яго ў святле былой славы яго дзядоў.

Тут дарэчы згадаць словы Ювэнала: «Калі ты, не могучы ўтаймаваць сябе, станеш ахвяраю свайго славалюбства й распусты, калі будзеш сам сябе ганьбаваць сваёю несправядлівасцю й жорсткасцю, то знатнасць продкаў паўстане супроць цябе і высвеціць палымянай паходняю твае подлыя ўчынкі». Знатнасць продкаў ператвараецца для іх нашчадкаў у абавязак ці, дакладней, у норму — быць годнымі высокіх вартасцяў сваіх дзядоў. Як сведчыць Цыцэрон, прадстаўнікі знаці, славутыя не так сваім паходжаннем, як распустай, самі выстаўляюць сябе на ўсеагульную ганьбу.

# Раздзел VIII

## Сёння знатнасць вызначаюць не на тых падставах, як у мінулыя вякі

Даўней знатнымі лічылі пераважна тых, хто ўславіў сябе сваім розумам ці выбітнаю чыннасцю, хоць раней гэта мог быць прасталюдзін, чые продкі нічым адметным не вызначыліся і не пакінулі пра сябе памяці для нашчадкаў, каб запачаткаваць іх знатнасць. Якраз такую знатнасць мае на ўвазе Цыцэрон, калі ў спрэчцы з Салюстыем, які папікаў яго нязнатным паходжаннем, адказвае: «Не спасылайся на продкаў. Лепш быць славутым сваімі дзеямі, чым ківаць на аўтарытэт папярэднікаў. Лепш жыць так, каб твае патомкі вялі ад цябе пачатак сваёй знатнасці, і самому служыць ім прыкладам дабрадзейства». Аднойчы сябры параілі Цыцэрону змяніць фамільнае прозвішча, бо яно гучала абразліва і абрасло шматлікімі кепікамі*. На гэта ён адказаў, што прыкладзе ўсе намаганні, каб уславіць гэтае прозвішча больш, чым здаўна слаўныя прозвішчы рымскіх родаў Катонаў, Катулаў ці Скаўраў. А нейкаму Гармодыю, які зняважліва нагадаў яму пра яго нізкае паходжанне, Цыцэрон адказаў: «Мой род з мяне пачынаецца, а твой табою заканчваецца». Такі самы адказ даў Іпікрат, калі яго папікнулі цёмным і нізкім радаводам.

Тады кожны, хто захацеў, мог бы подзвігамі сваімі адчыніць браму славы перад патомкамі, ушанаваўшы радавое імя. Але пазней насталі часы, калі знатнасць, якая доўга была натуральнаю, па шчодрасці і з ласкі рымскіх імператараў, якія кіравалі дзяржавай, стала дароўнаю.

Пра гэта сведчаць нормы грамадзянскага права, паводле якіх тытул мусіць быць пацверджаны ганароваю граматай ці іншым

---

*Цыцэрон паходзіць ад лацінскага *cicer* – гарох (заўв. рэдактара).

прывілейным актам. Прадстаўнік простага стану, ушанаваны такім прывілеем, лічыцца ўжо не прасталюдзінам, а нобілем. А не маючы такога пасведчання, чалавек не можа прэтэндаваць на знатнасць, колькі б ён ні даказваў сваю годнасць. Тут ужо нічога не залежыць ад нашай волі, ад нашых памкненняў і ўчынкаў. Усё вырашаецца з ласкі ўладара. Як бы хто ні даводзіў, што той вунь ці гэты не вартыя звання нобіля, іх статус будзе лічыцца ўсё адно непарушным. Галоўнае, каб нобіль пацвердзіў сваю годнасць імперскаю граматай.

Разам з тым некаторыя нават і без такой граматы маюць прыналежнасць да знаці — на той падставе, што паходзяць ад продкаў знатнага стану. Праз гэтую даўнюю знатнасць нашчадкі набываюць такі ж набілітэт, які іншыя атрымліваюць з ласкі ўладара. Некалі аднойчы набыты, статус знатнасці, як па спадчынным праве, пашыраецца потым на ўсё патомства.

Такім чынам, адрозніваюць два віды знатнасці. Адна пераходзіць да дзяцей ад бацькоў, і яе па праве называюць радавою. Другая даецца з ласкі манарха, і яе цалкам слушна мянуюць дароўнаю. Як першая, так і другая маюць аднолькавую вартасць. Здаўна ўсталяваўся і замацаваўся звычай, паводле якога разам з манаршымі прывілеямі такія асобы атрымліваюць гербы і іншыя рэгаліі. Гэтыя сімвалы — таксама частковае сведчанне знатнасці і пацвярджанне аб прыналежнасці адпаведнага роду да знаці. А каб ніхто не думаў, што набілітэт ёсць нейкай прывіднаю, ілюзорнаю вартасцю, на знаць ускладаюцца пэўныя абавязкі. У сваім жыцці знаць павінна прытрымлівацца канкрэтных нормаў паводзін. Калі ж нехта парушае гэтыя прыказанні, ён страчвае свой прававы статус і лічыцца прасталюдзінам.

Кожны народ жыве па сваіх звычаях. У нашым народзе той, хто прэтэндуе на права мець шляхецкую годнасць, павінен валодаць зямельнай маёмасцю, у прыватнасці вёскамі, фальваркамі, замкамі, гарадамі. Прадстаўніку гэтага стану не дазваляецца займацца

брудным ці нявольніцкім рамяством. Шляхта павінна жыць толькі ад земляробства і падаткаў з сялян, а таксама з іншых выгодаў, якія можа даваць зямля. Калі ж нехта страчвае свае зямельныя ўладанні і пераходзіць да механічнага рамяства, то болей не лічыцца нобілем і ў сувязі са зменаю жыццёвых умоваў пераходзіць у плебеі.

Шляхта можа займацца мастацтвамі і вайсковаю справай. Акрамя таго, на яе ўскладаецца кіраванне дзяржавай. Таму прадстаўнікі шляхты павінны вывучаць навукі, якія дапамагаюць забяспечваць у дзяржаве мір і спакой і абараняць яе ад нападаў знешняга ворагу. Наогул, для дзяржавы надзвычай важна, каб у грамадстве, дзе ўсе станы і людзі ўзаемазалежныя, дзе існуюць розныя інстытуцыі, скіраваныя на карысць чалавеку, існавала і такое саслоўе, якое, грэбуючы ўсімі рамествамі, старанна займалася толькі тымі справамі, якія садзейнічаюць умацаванню аўтарытэту дзяржавы і забеспячэнню яе патрэб. Калі ж стырно ўлады ў дзяржаве дастаецца асобам нячыстым, калі ваенныя справы даручаюцца людзям подлым і нізкім, якіх цікавіць больш не агульнае дабро, а ўласная карысць, то наўрад ці можна спадзявацца, што пры такім кіраўніцтве ўсё грамадства будзе шчаслівым і здаровым.

У нас дагэтуль не адмысловыя ўмацаванні і не гарадскія муры, а мужнасць шляхты і яе непахісная сіла духа прыносілі дзяржаве перамогу ў барацьбе супроць усякай варожай навалы. Адвага і пачуццё ўласнай годнасці заўсёды цаніліся ў шляхецкім стане настолькі высока, што ў бойцы шляхціц гатовы быў рынуцца ў самую гушчу ворагаў і загінуць дзеля адной толькі згадкі пра ягоны подзвіг. У іншых краінах ваяры служаць у войску і ваююць за пэўную плату і ўзнагароду, у нас жа гэтага вымагае чалавечая годнасць і мужнасць асобы. Няхай бы можна было і далей зберагаць даўнюю славу і крочыць па слядах нашых продкаў, якія будавалі дзяржаву з вялікім умельствам і рупнасцю! Няхай бы нашы нашчадкі з такім самым стараннем дбалі пра паспалітае грамадства, каб зрабіць яго моцным і непарушным.

Але ў насназіраюцца вялікія перамены. Ледзь не ўсе займаюцца справамі, далёкімі ад таго, пра што дбалі нашыя продкі. Мала каго вабіць высокая чыннасць, большасць стараецца знайсці занятак, які спатоліў бы яе прагу да прыбытку й нажывы. Шляхта не саромеецца гандляваць, ліхвярыць, карчмарыць ці займаецца іншымі нізкімі рамёствамі, калі яны прыносяць даход.

А як бо абавязкі, якія шляхта павінна выконваць у першую чаргу, аказваюцца занядбанымі, то паўсюль пачынае панаваць усё большая сапсаванасць нораваў. І хоць такое прыгожае і цудоўнае слова як «высакароднасць» можна пачуць з вуснаў ледзьве не кожнага, на справе высакародная чыннасць уласцівая сёння вельмі нямногім. Шляхта вядзе жорсткую барацьбу за захаванне сваіх свабодаў і прывілеяў, між тым забываючыся, што раней імі ўганароўваўся толькі той, хто ўсё жыццё займаўся вайсковаю справай і навукамі аб кіраванні дзяржавай. Чалавеку, які праз сваю знатнасць ці іншыя прывілеі прэтэндуе ўзвышацца над простым людам, не да твару займацца чорнай плебейскаю працай ці рамяством, абы толькі здабыць прыбытак. Там, дзе за аднолькавую працу людзі атрымліваюць розную ўзнагароду, дзе за роўнае даецца няроўнае і тым самым парушаецца закон справядлівасці, — там сеецца семя разладу.

Калі дзе-колечы ёсць народ, чые нобілі могуць пахваліцца сапраўды шырокімі свабодамі і прывілеямі, то, мабыць, першынством сярод іх валодае наша шляхта. Але чым болей шляхце дадзена прывілеяў, тым болей яна павінна цурацца ўсіх агідных і вычварных праяваў жыцця. У гэтай сувязі будзе дарэчы згадаць некаторыя вады, якія, на маю думку, пэцкаюць прыгожае слова *свабода*, — дзеля таго, каб мы не вельмі хваліліся сваёй шляхецкаю вольнасцю і не думалі, што, цешачыся з вялікай свабоды, можам пераступаць усякія межы. Але перадусім я каротка хачу паказаць, у чым ёсць сутнасць нашай свабоды і чым яна настолькі прываблівая, каб яе прапанаваць іншым.

# Раздзел IX

## Шляхта ў нашым грамадстве мае намнога большую свабоду, чым нобілі іншых народаў

Каб грамадства заставалася цэлым і непарушным, злачынцы ў ім павінны карацца, а дабрачынцы ўшаноўвацца ўзнагародамі. І на мой погляд, для забеспячэння трываласці грамадства нашыя продкі мелі надзвычай карысныя і спрыяльныя статутныя нормы, паводле якіх шляхце за яе выключныя заслугі перад дзяржавай даваліся найвышэйшыя ўзнагароды. Чыннасць нашай шляхты на карысць айчыны заўсёды была вялікай і слаўнай. Мужна бароначы радзіму ад ворагаў, шляхта не шкадавала ні сіл, ні сваёй крыві і адважна душыла падступныя намеры ўсіх нападнікаў.

Разнастайныя тытулы і ўладныя прывілеі, якімі ў нашым грамадстве карыстаецца адна толькі шляхта, уяўляюць сабой немалую ўзнагароду. Дзякуючы ім шляхце адкрываецца лёгкая дарога да прымнажэння радавой славы і павелічэння дамашняга дабрабыту. Але найвышэйшай і найкаштоўнейшай узнагародай за здзяйсненні і подзвігі застаецца свабода. Свабода ёсць адзінай асновай чалавечага жыцця. І шляхта карыстаецца ёю напоўніцу, абапіраючыся на даўнія звычаі і законы нашых продкаў. Без свабоды ніякія тытулы і багацці не прынясуць чалавеку шчасця і дабрабыту. Калі свабоды няма, багацці толькі распальваюць хцівасць тыранаў. Іх розум, аслеплены сквапнасцю, прагне нажывы. І тыраны, як галодныя псы, кідаюцца на здабычу.

Яскравым прыкладам гэтаму ёсць Масковія. Яна пераканаўча сведчыць, якая небяспека пагражае дабрабыту кожнага там, дзе адсутнічае свабода. Тыран у Масковіі правіць па сваёй прыхамаці. Законам ён лічыць усё тое, што захочуць яго распаленыя мазгі. Годнасць і маёмасць жыхароў у той краіне ніяк не абароненыя ад несправядлівасці, якую чыніць самаўладца.

У любы момант ён можа не толькі забраць у чалавека ўласнасць, але і сцяць уласніку галаву. Але цёмны і грубы люд, прывучаны да дзікага рабства, не толькі не выступае супроць злачыннай сквапнасці свайго тырана, а ўспрымае яго самавольства і самадурства ледзь не як нябесную кару.

Закон ёсць маральнае правіла, якое дыктуецца здаровым розумам і ўхваляецца боскімі запаветамі. Калі тыран так ці іначай парушае законы або слушныя нормы розуму, ён тым самым чыніць не Божыя суд і волю, а, як люты звяруга, прагне задаволіць толькі свае сляпыя жывёльныя інстынкты. Там, дзе над людзьмі стаіць не закон, які іх настаўляе ва ўсіх учынках, а верхаводзіць легкадумная чалавечая воля, — там паўсюль, як справядліва кажа Арыстотэль, грамадствам кіруе і правіць не Бог, а пачвара. Марна спадзявацца, што ў такім грамадстве калі-небудзь будуць мір і спакой. Народ там пачувае сябе так, як авечкі ў авечніку, у якім лютуе воўк.

Наш народ забяспечыў сабе мір і агульную свабоду болей удумліва. Ён абмежаваў караля рамкамі законаў, каб ён не насмеліўся замысліць нешта супроць грамадзян ці паквапіцца на іхнюю маёмасць. Кароль павінен рабіць толькі тое, што прадугледжвае ці патрабуе закон — вярхоўны ўладар як над грамадзянамі, так і над манархам. Самі ж законы, якія паўсюдна маюць прыярытэт, устанаўліваюцца не элітай і нават не каралём. Заканадаўства цалкам належыць шляхце. А гэта спрыяе ўмацаванню свабоды. Нават калі шляхта ў чым-небудзь памыляецца, дзе-небудзь адступае ад выкарыстання агульных каштоўнасцяў належным чынам, яна ў любы момант можа змяніць ці палепшыць закон, што бачыцца мне як праява свабоды. І праўда, хіба гэта не свабода — заўжды мець магчымасць спрыяць паспалітаму дабрабыту і рабіць тое, што ідзе на карысць усяму грамадству?

Іншыя народы, народнасці таксама маюць законы. Але тыя законы, выдадзеныя па асабістай волі ўладароў ці эліты, не так

спрыяюць шчасцю людзей, як дапамагаюць рабаваць слабейшых, бо якія б ні былі законы, усе ўрэшце вымушаныя ім падпарадкавацца, нават калі яны няволяць асобу. Але зняволеным не даецца права змяняць законы, і такія людзі нясуць на сабе вялізнае і відавочнае кляймо рабства.

Сярод вольнасцяў нашага народа немалаважным чыннікам і паказнікам яго грамадзянскай свабоды ёсць абранне караля. Калі ў іншых народаў цары і манархі прыходзяць да ўлады паводле спадчыннага права і натуральнае пераемнасці, то ў нас уладарамі не нараджаюцца — іх выбіраюць усеагульным галасаваннем шляхты. Пры гэтым народ настолькі паважае караля, што пакуль ніводнаму з каралеўскай сям'і не выказваў непрызнання. Сярод аптыматаў каралеўскага паходжання выбіраюцца спрэс айчынныя, а не замежныя асобы. Манарх сведчыць потым, што абраны свабодна, што ёсць каралём не на аснове спадчыннага права, а з ласкі і адабрэння народа, і ў якасці такога будзе правіць грамадствам.

Дзяржава перадаецца каралю разам з дзеючымі законамі. Ён павінен скласці прысягу, што будзе кіраваць краінай у адпаведнасці з нормамі гэтых законаў. На маю думку, якраз дзякуючы такім устанаўленням ва ўчынках нашых каралёў ніколі не ўбачыш фанабэрыстасці і жорсткасці і не заўважыш грубасці ў абыходжанні з народам.

У адрозненне ад нашых каралёў іншыя манархі кіруюць дзяржавамі зусім інакш. Як сведчаць шматлікія факты не толькі ў суседніх, але і ў болей далёкіх краях, тамтэйшыя ўладары абыходзяцца са сваімі падданымі з пачварнай бесчалавечнасцю. Найбольш верагодным мне ўяўляецца, што магчымасць такога варварства закладзеная ў самім статуце дзяржаўнага кіравання. Патомныя манархі ўспрымаюць сваю ўладу як спадчыну, атрыманую ад продкаў. Таму яны не лічацца з жаданнямі народа і не пытаюцца ў яго згоды. Але галоўная і асноўная прычына раз-

бэшчанага, фанабэрлівага царавання ляжыць у статусе ўладара, калі яго ўлада не абмяжоўваецца ніякімі дастаткова моцнымі цуглямі закону ці калі ён скідае гэтыя цуглі, скарыстаўшыся сваёю падступнасцю ці чужымі крывадушнымі парадамі.

Нават калі ў нейкім грамадстве і існуе такая завада, ці звычай, згодна з якім уладаром робіцца той, хто ім ёсць па сваім паходжанні, дык і тады народ павінен дазволіць спадкаемцу трона ўзяць уладу, толькі абмежаваўшы будучага манарха пэўнымі законамі. Сам па сабе пераход манаршага пасада ў спадчыну не будзе перашкаджаць грамадзянскай свабодзе пры ўмове, што ўладар не ўгрузне ў заганах, да якіх яго могуць схіляць ягоныя благія жаданні.

Амаль усе нашыя каралі мелі настолькі ціхі і лагодны характар, што не дазвалялі сабе ўносіць нейкія змены ў дзяржаўныя законы ці нават парушаць іх.

І ўсё ж, каб запабегчы верагоднаму самавольству караля, былі прадугледжаныя сур'ёзныя захады. Без іх, калі б уладар, скажам, меў дазвол самахоць аб'яўляць і весці вайну, маглі б быць парушаныя мір і спакой усяго грамадства. Несправядлівыя і пастаянныя войны, якія развязваюць лютыя і шалёныя ўладары, нясуць грамадствам вялікія беды. З гэтай прычыны шляхта, памятаючы пра асабістыя свабоды, палічыла за неабходнасць абмежаваць верагоднае самапраўства караля і не дазволіла яму аб'яўляць ці весці вайну без адпаведнай згоды набілітэту.

Нельга аднак не сказаць, што часам такая вольнасць перасягае ўсякія разумныя межы. Празмерна узурпаваная народам свабода таксама нясе грамадству шмат бедаў. Закон, прызначаны стрымліваць несправядлівыя войны, нярэдка становіцца перашкодай у справе вызвольных і справядлівых войнаў. Шляхта, упадабаўшы бяздзейнасць і даўно адвыкшы ад вайны, не азываецца на заклікі караля, не бярэцца за зброю і тым самым дазваляе ворагу ўрывацца ў нашыя землі і пустошыць нашу

радзіму агнём і мячом. Вядома, у інтарэсах дзяржавы нельга ўхваляць вайну, якую мерыцца развязаць уладар пад уплывам нейкай пустой фанабэрыі. Калі ж вораг паліць і забівае, руйнуе вёскі і гарады, лютуе і жорстка здзекуецца з грамадзянаў, не выступіць супроць такога ліхадзея і не абараніць радзіму, якая ўмольна просіць аб дапамозе, было б ганебнай, подлай, агіднай бяздзейнасцю. Калі свабода нам дарагая, дык будзем карыстацца ёю памяркоўна. Іначай, неабмежаваная свабода можа ператварыцца ў сваю процілегласць, то бок у рабства. Схіл, каб скаціцца да гэтай бяды, надзвычай круты. Упасці ў яе вельмі лёгка.

Наш народ карыстаецца многімі свабодамі, рупліва ўведзенымі нашымі продкамі. Але, мабыць, найбольшую вартасць мае свабода, згодна з якой шляхта, валодаючы ворнымі ды іншымі землямі, а таксама фальваркамі, замкамі, мястэчкамі, нікому ніякіх падаткаў ці пабораў не плаціць. Кожны шляхціц мае ў нас такое права на сваю ўласнасць, якое ў іншых краінах маюць толькі цары і каралі. У замежных нобіляў таксама ёсць вялікія ўладанні. Але гэтыя ўладанні — альбо узуфруктуарныя, калі гаспадар не мае права перадаваць іх у валоданне каму-небудзь іншаму, альбо на маёмасць адпаведна з ацэнкай накладаецца такі падатак, што ўладальніку застаецца зусім нязначная частка даходу.

У нашым народзе шляхта распараджаецца сваёю маёмасцю, як хоча. Свае ўладанні яна можа перадаць нашчадкам, скарыстаць на ўласныя патрэбы, а дзе выгадна, то і прадаць. Калі ж узнікае пагроза нападу ці ёсць якая патрэба ў агульнаграмадскіх сродках, дык складкі робяць нават і сяляне і падданыя шляхты, але не ў такой меры, як загадае кароль ці запатрабуе нейкая частка эліты, а столькі, колькі ўхваліць на сваім сойме шляхта. Так набілітэт забяспечвае сабе спакойнае і надзейнае ўладанне маёмасцю. Уладальнікам не пагражае ні рабаўніцтва, ні раскраданне, ні залежнасць ад чужой прыхамаці.

Нельга не сказаць і яшчэ пра адну акалічнасць. Толькі шляхце належыць арганізацыя войска дзеля выправы ў паход і збройнай абароны айчыны. Пры гэтым не вызначаецца, якую колькасць жаўнераў павінен прывесці з сабой кожны шляхціц. Усё залежыць ад яго сродкаў і ўсведамлення ўласнай годнасці. Галоўнае, каб ён не пасылаў замест сябе кагосьці іншага, а з'явіўся сам са сваімі жаўнерамі і пры поўнай амуніцыі. Магчыма, і тут варта было б мець пэўныя абмежаванні. Хай бы пры няроўных маёмасных умовах не ўсе неслі аднолькавы цяжар, пад якім адны ажно падаюць, а другія яго нават не адчуваюць.

Увогуле, для грамадства надзвычай важна, каб тыя, хто атрымлівае ад яго больш выгодаў, адпаведна ўкладалі больш сродкаў і працы ў яго бяспеку. Тады нідзе не будзе падрывацца роўнасць, якая аб'ядноўвае грамадзян краіны. Нельга, вядома, адмаўляць магчымасць кожнага свабодна распараджацца сваёй маёмасцю. Але не ўсе аднолькава шчыра ставяць бяспеку сваёй дзяржавы вышэй за асабістае майно і выгоды. І такіх, хто ўхіляецца ад выканання сваіх абавязкаў перад айчынай, трэба пры дапамозе законаў прымусіць дапамагаць дзяржаве адпаведнымі сродкамі.

Паводле Цыцэрона, свабода — гэта, апроч усяго іншага, абавязак дзейнічаць разумна, справядліва, выконваць неабходнае і мець ясна азначаны жыццёвы шлях. Таму скаргі на ўціск свабоды будуць беспадстаўнымі, калі законы, насуперак жаданню скаржніка, змушаюць да высакародных, дабрадзейных учынкаў. Дзяржаўныя законы — найлепшыя вартаўнікі свабоды. Яны, як настаўнікі, вучаць правільна весці ўсялякія справы. Розніца паміж беззаконнем і свабодай заключаецца ў тым, што беззаконнае дзеянне кіруецца толькі жаданнем бягучага моманту, а свабода стрымлівае безразважныя, аблудныя памкненні цуглямі розуму. З гэтай прычыны заканадаўцы павінны ўважліва прыглядацца да зместу законаў, каб пад аздобай свабоды, заснаванай на

законах грамадства, у жыццё і норавы людзей не пранікла вераломнае самачынства. Такое магчыма, калі законы адыходзяць ад маральных правілаў, увасобленых у нашай свядомасці Богам, ці калі законы, якія накіроўваюць грамадзян на дабрачынныя дзеянні, адсутнічаюць увогуле.

Але ў нас дагэтуль не стае законаў, якія забяспечвалі б трывалы і шчаслівы дабрабыт. На вялікі жаль, некаторыя законы, у свой час аднагалосна прынятыя нашымі продкамі, разыходзяцца з Божымі нормамі і многім нямала шкодзяць. Прыгадаем факты. Іх няшмат, але і яны даюць падставу меркаваць пра многае, прынамсі, пра патрэбу ў лепшай форме дзяржаўнай улады. І мы просім заканадаўцаў таксама паразважаць пра гэта.

# Раздзел X

## Несправядлівы закон аб забойстве, які дзейнічае ў нашым грамадстве, шмат у чым шкодзіць агульнай свабодзе

Некалі Дэмасфен вельмі трапна сказаў, што нічога так не садзейнічае дабрабыту грамадства і свабодзе народа, як аўтарытэт закона. Мір і ўсеагульная свабода грамадзянаў найбольш забяспечаныя там, дзе чалавеку не пагражае забойства, а яго маёмасці — рабаўніцтва. Адсюль вынікае, што мы шмат у чым абавязаныя законам, галоўная мэта якіх — прадухіленне ўсякай несправядлівасці ў чалавечым грамадстве. Дзякуючы магчымасці пакарання законы стрымліваюць ліхадзеяў ад злачынстваў. Як сведчыць Платон, людзі мала адрозніваліся б ад самага лютага звяр'я, калі б жылі без ніякіх законаў.

Прырода не стварыла чалавека такім абазнаным, каб яму былі дакладна вядомыя чыннікі, якія спрыяюць агульнаму дабрабыту. Дый нават калі б ён быў дасведчаны ў гэтым, дык і тады не заўсёды мог бы рабіць усё, што хоча. Менавіта з гэтай прычыны Дэмасфен гаворыць, што мы, бадай, маем большую карысць ад законаў, чым ад прыроды, бо чалавек у запале пачуццяў робіцца ахвярай сваіх прагных жаданняў, якія прымушаюць яго дзейнічаць на злом галавы. Але нягледзячы на тое, што чалавечая натура сама па сабе схільная да аблуд і заганаў, законы вядуць яго, накіроўваюць і змушаюць рабіць дабро. Не без падставы Дэмасфен называе закон вынаходніцтвам і дарункам бессмяротных багоў. Вучоныя мужы ўвасобілі гэты дар у юрыдычныя нормы.

Пастулаты прававой навукі закладзены ў нашу свядомасць Богам. Яны, у прыватнасці, патрабуюць нікому не чыніць шкоды, не рабіць іншым таго, чаго мы не хочам сабе. А каб ніхто

не сумняваўся, што гэта ёсць норма Божага закону, Бог сам пасля патопу ўстанавіў і абвясціў усяму чалавецтву закон: «Хто праліе кроў чалавечую, таго кроў праліе чалавек». Бог не толькі санкцыянуе закон, які забараняе супрацьпраўнае забойства або гвалт у адносінах да іншай асобы, але і стварае ўладу, якая ажыццяўляе выкананне гэтага закону і мае права караць забойцу і забяспечыць мір у грамадстве. Мір гэты магчыма ўсталяваць толькі тады, калі парушальнікам спакою пагражае суровая кара і яны на сваёй шкуры адчуюць зло, якое прычынілі іншым.

Гасподзь нам ясна растлумачыў, якімі павінны быць законы, прызначаныя ахоўваць бяспеку грамадзянскай супольнасці. Суровасць пакарання мусіць адпавядаць цяжкасці злачынства. Прысуд павінен выносіцца толькі за тое, што ёсць у дэлікце. Калі ж пакаранне аказваецца суравейшым за віну злачынцы, то гэта жорсткасць, а калі лягчэйшым, то самавольства. Як адно, так і другое нельга назваць справядлівасцю.

У грамадстве, дзе справядлівасць у загоне ці адсутнічае зусім, непазбежна ўзнікаюць звады і смуты, якія нясуць разарэнне і пагібель ўсяму астатняму. Таму няхай кожны задумаецца, як у нашай дзяржаве павінна ацэньвацца пакаранне за ўчыненае забойства. Цяпер гэтае пакаранне — несувымернае злачынству. У параўнанні з учынкам яго можна назваць проста забавай ці жартам. Я ўжо не кажу пра забойства плебеяў ці іншых людзей нізкага паходжання. Забойства прасталюдзіна, як і забіццё скаціны, караецца спагнаннем нязначнай грашовай сумы. І просты люд вымушаны дагэтуль цярпець ганебны цяжар такога прыгнёту.

Але гаворка пойдзе пра шляхту. Яна выхваляецца сваёй вольнасцю і, спасылаючыся на яе, ставіць сябе вышэй за многія іншыя народы. Што ж, тут яна мае рацыю. І шматлікія ўзоры чыннасці нашай шляхты (пра якія згадвалася раней) сведчаць пра гэта. Але ж як бо шляхта церпіць несправядлівы закон аб

забойстве і так нізка цэніць свае галовы, то непазбежна накладае тым самым ганебнае кляймо на сваю свабоду і нявечыць астатнюю сваю годнасць. Па згаданым законе шляхціц, які забіў чалавека шляхетнага звання, павінен заплаціць мізэрную суму грошай і адседзець год у турме. Хто не бачыць, што гэты закон супярэчыць Божаму прыказанню і не сумяшчальны з ім? Толькі тупы, абмежаваны чалавек не разумее, што такі нарматыўны акт не толькі не супыняе злачыннай разбэшчанасці, але яшчэ больш абвастрае і распальвае яе. Ён парушае Божы закон і нішчыць большую частку выгодаў, якія нясе свабода.

Дзіўна, што, з аднаго боку, заканатворцы прызнаюць, што паводле Божага закону забойства павінна карацца забойствам. Але ў той жа час абвінавачваюць Бога ў празмернай жорсткасці і суровасці. І каб змякчыць Божую строгасць, выдаюць больш літасцівы і спагадлівы да забойцаў закон. Як смешна выглядаюць гэтыя высілкі смяротнага чалавека, якога з усіх бакоў абступаюць блюзнерства і ліхадзейства. Ён мала што хоча пасупернічаць у спагадзе і міласэрнасці з усёмагутным і бессмяротным Богам, дык яшчэ й дамагаецца прызнання свайго вяршэнства. Але рэчаіснасць паказвае, што ўсё гэта — несусветная бязглуздзіца. Бог строга карае за чалавеказабойства менавіта дзеля таго, каб суровасцю свайго пакарання прадухіліць забіццё чалавека чалавекам. А нехта змякчае Божую кару настолькі, што фактычна патурае зламысніку ў душагубстве. І хто варты большае пахвалы? Бог, які заўсёды клапоціцца аб уратаванні чалавека і гневаецца на вылюдкаў, што пасягаюць на чалавечае жыццё, аказваецца ўрэшце жорсткім. А сын зямлі, якога не надта кранае чалавеказабойства і які мяркуе, што забойцу дастаткова лёгкага пакарання, заслугоўвае пахвалу за спачуванне і літасць. Гэтак памыляецца кволая чалавечая мудрасць, калі, падымаючы свой чубок, мерыцца ўзляцець вышэй за Бога.

Калі нейкі нарматыўны акт не адпавядае рацыянальным

высновам розуму і не стасуецца з паняццямі ісціны, якія чалавек атрымаў ад Бога, то такая юрыдычная ўстава не будзе мець трывалай асновы. Так і разгляданы закон, ці, дакладней, беззаконне, не супадае з перакананнямі большасці грамадзян і таму не прымаецца імі. Чым чалавек руплівей дбае пра бяспеку грамадства і агульны мір і спакой, тым мацней працівіцца несправядліваму закону і прагне яго адмены.

Паглядзіце на сумнае становішча рэчаў, на страшныя беды, да якіх у нашым грамадстве спрычыніўся гэты закон. Нямногія шляхетныя дамы абмінулі смутак і жаль. Большасць напаткала вялікая страта. Тут жонка аплаквае мужа, тут няшчасны бацька аплаквае сына, а там сын — забітага бацьку. Свабода забіваць разраслася і пашырылася неймаверна. Забойцы беспакарана пазбаўляюць людзей жыцця і не баяцца ніякага суду. Бо хто з такіх душагубаў з ахвотаю не пагодзіцца гадок пацярпець няўтульнасць зняволення ў вязніцы ды ахвяраваць нязначнай грашовую сумай, абы толькі магчы ў гнеўным запале і шале здзейсніць сваё злачыннае жаданне? Як часта мы чуем галасы гэтых шаленцаў, якія амаль без дай прычыны пагражаюць камусь забойствам і заяўляюць, што пачалі ўжо адкладаць выкупныя?! Дзе тая грамадзянская свабода, заснаваная на добрых і справядлівых законах?! Ці ж можна лічыць чалавека свабодным, калі нехта мае права купіць ці забіць яго, як скаціну? Забойцы, як мяснікі, купляюць у нашым грамадстве людзей, потым іх забіваюць, а родзічам плацяць гатоўкай. Нават скаціна мае пэўную перавагу: яна прадаецца са згоды гаспадара і па дамоўленай непасрэдна з гаспадаром цане. А родзічам, якія маюць права кроўнай помсты за ўчыненае забойства, галоўшчына выплачваецца нават без іхняга жадання і згоды. Але ёсць і сваякі, абыякавыя да такога злачынства. Ім рупіць толькі атрымаць грошы. Але ж гэта дзікунства, калі смерць родзіча не ўспрымаецца як цяжкая непапраўная страта, а разглядаецца адно як прыбытак. Так

людзі прывучаюцца да звярынай жорсткасці. Замест глыбокага смутку з прычыны смерці блізкага чалавека яны адчуваюць задавальненне. Дайшло ўжо да таго, што пра чалавека, які памёр натуральнай смерцю, жартаўнікі і дасціпнікі кажуць, ён, лічы, і не памёр, бо ад той смерці сыны пакуль ніякага прыбытку не мелі. Вельмі шкада, што народ цярпіць гэты ганебны, несправядлівы закон, які наносіць вялікую шкоду свабодзе.

Першай умовай свабоды ёсць наша бяспека. Чалавеку не павінны пагражаць самавольства, гвалт ці забойства, а яго скарбу і майну — грабеж і разарэнне. Бо і валоданне самымі вялікімі багаццямі болей не цешыць, калі жыццё ўладальніка ў небяспецы. Наш народ заўсёды імкнуўся, каб законы як мага надзейней баранілі яго набытак. І калі ён карае смерцю рабаўнікоў і зладзеяў, то смяротны прысуд забойцам быў бы тым больш справядлівы. Жыццё чалавека — каштоўнасць нашмат даражэйшая за ўсё астатняе. Наўрад ці знойдзецца такі вар'ят, які, у раз'юшанасці і шале, будзе гатовы ахвяраваць жыццём, абы пакінуць непарушным багацце. А наш закон патрабуе, каб рэчы цаніліся намі вышэй за жыццё. Забойцы, заплаціўшы пэўную суму грошай, пазбаўляюцца кары, тым часам як зладзеі не могуць выкупіць сваё жыццё ніякімі грашыма і ніякімі вязніцамі. Вось да якой ступені наш закон аб забойстве абсурдны і несправядлівы. І з гэтай прычыны ў нас развялася безліч чалавеказабойцаў. Не дзіва, што на адным сойме абмяркоўвалася прапанова стварыць з такіх крымінальнікаў войска.

Можна сабе ўявіць, колькі сумленных і чэсных людзей загубілі гэтыя нелюдзі, гуляючы на свабодзе і пазбягаючы кары. І няма ніводнага, хто пасля аднаго забойства не чыніў бы і далей сваё ўпартае і шматахвярнае катаўства. Беспакараных абыклых ужо душагубаў пры думцы аб чалавечай крыві апаноўвае такі шалёны сверб, што яны толькі і марачь, каго б звесці са свету, і ўсяляк шукаюць зачэпкі для новага злачынства. Гэтыя чалаве-

каненавіснікі ніколі не пераставалі б забіваць людзей, калі б самі не станавіліся ахвярамі іншых забойцаў. Там, дзе не дзейнічае закон, справядлівая Божая кара ўсё адно насцігне злачынцу. Тыя ж, хто ўстанавіў законы, якія нясуць чалавеку шкоду і гібель, без сумневу, панясуць за гэта яшчэ большую адказнасць.

У сваіх размовах і думках мы праклінаем пачварную жорсткасць маскоўскага тырана кожны раз, калі да нас даходзяць жахлівыя чуткі і праўдзівыя гісторыі аб гнюсных забойствах, якія ўчыняе над сваімі падданымі люты манарх. Але ў той жа час самі церпім законы, якія паблажлівасцю сваёй патураюць шматлікім тыранам у чалавеказабойстве. І пакуль забойца лічыць, што можа дзейнічаць беспакарана, не так ужо важна, хто тыранствуе — самаўладца ці прыватная асоба. Не без прычыны шляхта амаль заўсёды ходзіць у атачэнні ўзброенай да зубоў вялікае світы. Законы не засцерагаюць нобіляў ад небяспекі, таму і ўся іх надзея толькі на зброю.

Так ужо павялося, што за кожную крыўду, асабліва за чаркай, крыўдзіцелю пагражаюць забойствам і прагнуць здзейсніць пагрозу. І нярэдка яна такі спраўджваецца. З абодвух бакоў, нібы чужаземныя ворагі, выступаюць узброеныя дружыны, і, на вялікі жаль, у ход пускаецца ўсё дзеля ўзаемнага вынішчэння. Сутычкі адбываюцца жорсткія. Гібельная варажнеча і поўныя ўзаемнай нянавісці міжусобныя бойкі патанаюць у моры крыві. І ў гэтай крывавай калатнечы ўдзельнічаюць не толькі яе завадатары. У яе ўцягваюцца ўсе, хто павязаны з імі сваяцтвам ці блізкаю дружбай. Сябры і сваякі імкнуцца ўсяляк пасобіць і дапамагчы ваеўнікам. Робячы такую паслугу, яны разлічваюць на ўзаемнасць. Бо калі нешта падобнае здарыцца з імі, былыя хаўруснікі змогуць патрабаваць ад тых, каго падтрымалі, такой самае дапамогі.

Залішне казаць, якіх выдаткаў вымагае вайсковы рыштунак. А колькі горычы трэба праглынуць, калі бачыш пустыя клеці

і свірны. Ужо няма нічога свайго — усё належыць усім. Падчас застолляў, каб гаспадара выпадкам не папракнулі ў скупасці, ён вымушаны шчодра і ўдосталь частаваць сваіх субяседнікаў. Бо ва ўзброеных сутычках саўдзельнік рызыкуе не толькі маёмасцю, але і жыццём.

Усе згаданыя бедствы спараджае закон, які ставіцца да забойцаў вельмі добразычліва і сваёй мяккасцю, паблажлівасцю яшчэ больш патурае разбэшчанасці нахабнікаў. Згодна з гэтым законам зброя ёсць адзіным сродкам бяспекі ўсіх і кожнага. Нікчэмным, рабскім, цалкам нявольніцкім бачыцца мне жыццё чалавека, які заўсёды страшыцца мацнейшага. Гэты нявольнік можа пазбавіцца свайго рабства толькі тады, калі сам набярэцца моцы і ўлады больш за таго, каго ён баяўся.

Паміж жыццём чалавечым і жыццём звяроў ёсць розніца. Звяры забяспечваюць сваё існаванне сілай, і таму іх баяцца слабейшыя. Людзі ж з дапамогай законаў ствараюць грамадзянскую супольнасць, у якой моцныя і слабыя, багатыя і бедныя маюць аднолькавы прававы статус. Калі ж роўнасць у статусе тым ці іншым спосабам парушаецца, то няхай ніхто не грэе надзеі, што такая супольнасць будзе трывалай і даўгавечнай. Яе лучнасць хутка будзе раз'едзеная міжусобнымі сваркамі, і яна загіне.

Калі ў нас дагэтуль усё яшчэ ўзнікаюць бойкі, звады, зацятыя спрэчкі, то галоўнай іх прычынай застаецца закон аб забойстве. Менавіта ён падбухторваў і падбухторвае да падобных узрушэнняў. Нельга абысці маўчаннем і тое, што не на ўсіх забойцаў накладаюцца грашовыя санкцыі. Пакаранню падлягае толькі той, каго злавілі на месцы злачынства і пасадзілі ў вязніцу. Калі забойца ўцёк і быў злоўлены потым, то ён падлягае суду толькі пры ўмове, што цела забітага яшчэ не паспелі аддаць зямлі. Гэта выглядае ўжо зусім смешным і недарэчным. Ну, які злачынца будзе такі бяздзейны, каб пасля задуманага і ўчыненага забойства не пастарацца як след сябе засцерагчы, уцячы куды-небудзь

і не дацца быць злоўленым? Які дурань палезе ў пашчу небяспекі і аб'явіцца перад судом, калі ведае, што цела яшчэ захоўваюць і даследуюць? Хай пройдзе час, адбудзецца пахаванне, і нябожчыкава цела ўрэшце пакрые зямля. Цяпер душагуб можа адкупіцца за ўчыненае забойства мізэрнай грашоваю сумай і будзе пачуваць сябе анігадкі. Пра яго хіба што будзе хадзіць нядобрая слава ды наганяць на людзей страх.

Паколькі ўсім забойцам прадугледжваецца неадпаведна лёгкае пакаранне, то нават зламыснае пазбаўленне жыцця не лічыцца сур'ёзным крыміналам. Таму вінаватых у забойстве не абмяжоўваюць у правах. Асуджаныя карыстаюцца тымі ж тытуламі, тымі ж прывілеямі і прэрагатывамі, якія мелі раней, да злачынства. Трэба таксама згадаць, што падчас судовага разбору ўсе наперабой стараюцца дапамагчы падсуднаму як парадай, так і дзеяннем. Болей за тое, самі суддзі выступаюць у ролі заступнікаў падсуднага, не зважаючы на пратэсты і нязгоду пацярпелых, і заклікаюць бакі да замірэння. Зрэшты, дзе ёсць несправядлівыя законы, там ёсць і прадажныя суды. І гэта цалкам натуральна: адно адпавядае другому.

Нельга абмінуць і факт, што пры сённяшнім законе, які так нізка цэніць жыццё грамадзян, меней цяжкія правапарушэнні — напрыклад, пабоі, раненні — злачынствам нават не лічацца, і злачынцы застаюцца амаль зусім без пакарання. Хоць за цялесныя пашкоджанні, нанесеныя шляхце, законы ўстанаўліваюць пэўны грашовы штраф, але гэтая сума аказваецца настолькі мізэрнай, што яе сорамна атрымліваць. Дый далёка не кожнага задаволяць спагнаныя ў судовым парадку грошы. Таму большасць пацярпелых адварочваюцца ад зневажальнай платы за сваю кроў. А як бо мяккасць пакарання нікога не ўтрымлівае ад злачынства, то амаль усе, каму былі прычыненыя цялесныя пашкоджанні, звяртаюцца не ў суд, а гараць жаданнем паквітацца за кроў таксама крывёю.

Здараецца, што ў судзе крымінальная справа заканчваецца, як лічаць, даволі шляхетна. Абвінавачаны караецца абібоцкай адсідкай у межах пэўнага месца. Там ён альбо задае храпака, альбо на ўсю поўніцу п'е са сваімі сябрукамі, ладзіць пад музыку святы і пыхліва зневажае збітага і знявечанага ім чалавека. А на тым чалавеку бывае столькі ран і столькі ўсякіх пашкоджанняў, што небарака ў хуткім часе канае ці на ўсё жыццё застаецца нямоглым і хворым.

Па нашых законах і цяжкае, і лёгкае цялеснае пашкоджанне кампенсуецца аднолькавай грашоваю сумай. Ужо куды надзейней бароніць свабоду грамадзянаў Карнэліеў закон, змешчаны ў Грамадзянскім кодэксе. Мера пакарання ім устанаўліваецца ў залежнасці ад характару пашкоджання. Падсудны павінен выплаціць такую грашовую суму, якая, па вызначэнні суддзі, кампенсуе нанесенае пашкоджанне. А калі за нязначнае правапарушэнне і сур'ёзнае злачынства прадугледжваецца аднолькавае пакаранне, то ад справядлівасці не застаецца нічога. Калі ж грамадзяне ўсе разам і кожны з іх паасобку хочуць абараніць сваю свабоду, яны павінны ўмацаваць яе дзейснымі законамі. Нельга, каб законы сваёю мяккасцю распальвалі подлыя памкненні людзей. Грамадству патрэбны законы, якія справядлівай і адпаведнаю строгасцю былі б здольныя прадухіліць баламутныя ўчынкі зламыснікаў.

## Раздзел XI

### Адсутнасць у нашым грамадстве законаў, якія каралі б за пралюбадзейства, значна парушае палітычную і грамадзянскую свабоду

Калі ў грамадстве адсутнічаюць законы, то, як сведчыць Цыцэрон, няма патрэбы вызначаць, каму што належыць. З гэтай прычыны мудрэйшыя мужы і вучонейшыя заканазнаўцы, кіруючыся сваім прыродным інстынктам і здаровым розумам, стварылі законы, якія вучаць людзей справядлівасці і прыстойнасці і пад пагрозаю пакарання ўтрымліваюць заблудных ад распусты ці намераў завалодаць чужым. Зберагчы чалавечую супольнасць і мірнае, спакойнае яе існаванне можна толькі тады, калі з дапамогай законаў утаймаваць нястрымныя чалавечыя жаданні і жарсці, каб ніхто і ніколі не насмельваўся параніць ці забіць іншага. Законы яднаюць людзей у адно цэлае — народ. Цалкам слушна сказаў Дэмасфен: «Законы — гэта душа грамадства». І падобна як цела, развітаўшыся з душою, апускаецца і падае, так і грамадства, у якім не дзейнічаюць законы, прыходзіць у заняпад і гіне. Не дарма Геракліт Эфескі кажа, што грамадзяне павінны дбаць пра законы больш, чым пра гарадскія муры. Без гарадскіх муроў грамадства існаваць можа, а вось без законаў зберагчы сваю цэласць і непарушнасць яму ніколі не ўдасца. У свой час персы, усвядоміўшы карысць законаў, знаёмілі сваіх дзяцей з дзеючымі прававымі нормамі яшчэ ў малалецтве. Гэты звычай перанялі крыцяне. Іх дзеці павінны былі запамінаць законы, хорам спяваць гімны багам, славіць подзвігі ваяводаў, што мусілі быць для кожнага ўзорам дабрачыннасці і мужнасці.

Ніякую супольнасць людзей, якая не мае законаў і дзе кожны робіць, што хоча, нельга назваць сапраўдным чалавечым грамадствам. Такая супольнасць будзе нагадваць хутчэй збо-

рышча хіжых звяроў. Толькі ў звярыным асяродку мацнейшы перамагае слабейшага і тым забяспечвае сваё існаванне. А мэта законаў — гарантаваць чалавеку спакойнае валоданне ўласнасцю і абараніць яго ад несправядлівасці. Нездарма ў сувязі з гэтым некаторая неабдуманасць нашых заканадаўцаў выклікае вялікае і ўсеагульнае нараканне. Так імі не выдадзена ніякіх законаў, якія тычыліся б маральна-этычных паводзінаў сужэнцаў. Заканатворцы не палічылі патрэбным паставіць заслон агіднаму пралюбадзейству і пазашлюбным сувязям і не стварылі адпаведных законаў. А тым не менш, на думку вучоных мужоў, апаганьванне чужога ложка ёсць злачынствам, блізкім да забойства. Гэтае злачынства разбурае тую супольнасць, з якой, нібы з крынічкі, бярэ пачатак наш радавод. Не было амаль ніводнага народа, які дапускаў бы памаўзліваю юрлівасць. За распусту адпаведныя законы прадугледжвалі суровае пакаранне. Нават у жывёльным асяродку прыродны інстынкт прымушае некаторых жывёл жорстка пераследаваць самку, якая сваёй нявернасцю апаганіла шлюбную повязь. Як апавядае Пліній, леў, калі пачуе пралюбадзейства львіцы з леапардам, абрушвае на блудніцу ўвесь свой звярыны гнеў. Праўда, сланы пачуцця рэўнасці не ведаюць і боек за самак між сабой не вядуць.

Здаровы сэнс вучыць, што ў шлюбе трэба старанна і рупна дбаць пра душэўную чысціню. А ў нас, тым не менш, дагэтуль не выдадзена законаў, якія прадугледжвалі б пакаранне за распусту і юр. Такая бяздзейнасць у пэўнай меры супярэчыць прыродзе. Калі заканатворцаў не кранае голас Божага закона, які патрабуе караць за падобны грэх, то, можа, яны прыслухаюцца да голасу большасці народаў, якія з дапамогай эдыктаў ці іншых уставаў імкнуцца не дапусціць разбэшчанасці ў грамадстве. Дыядор Сіцылійскі сведчыць, што ў егіпцян заспеты на пралюбадзействе юрлівец атрымліваў да тысячы ўдараў розгамі. Юрлівым жанчынам адразалі насы, каб сваім знявечаным тварам яны адпуджвалі

ад распусты іншых. Парфяне і арабы за такое злачынства заўсёды каралі смерцю. Колісь Залеўк выдаў для насельнікаў Локры закон, па якім асуджанаму за пралюбадзейства выдзіралі абодва вокі. Але аднойчы здарылася так, што спралюбадзейнічаў яго сын. Лакрыйцы, зважаючы на выбітную бацькаву чыннасць на карысць грамадства, гатовыя былі сыну грэх дараваць. Залеўк доўга не пагаджаўся, але, саступіўшы шматлікім просьбам народа, прыняў больш памяркоўнае рашэнне, якое, тым не менш, адпавядала прынцыпу роўнасці ўсіх перад законам. Ён вырваў адно вока спачатку ў сябе, а потым адно вока ў сына. Гэтак Залеўк аддаў належнае закону, але абаім захаваў зрок.

У рымлян закон і звычай дазвалялі мужу забіць няверную жонку, пра што сведчаць даўнія помнікі: у прыватнасці, пралюбадзеяў сурова каралі паводле закона Юлія. Прыводзіць карысныя ўстанаўленні супроць парушальнікаў шлюбнай вернасці ў іншых краінах будзе, бадай, нават залішнім. Бо ў наш час амаль ва ўсіх, нават у варварскіх народаў, далёкіх ад ушанавання Хрыста, такое злачынства беспакараным не застаецца. Не без падставаў гэтая акалічнасць павінна выклікаць у нас цалкам натуральнае пачуццё сораму. Мы ж называем сябе хрысціянамі, выхваляемся свабодай, справядлівымі законамі, належным дзяржаўным ладам. Але дазваляем подлыя, ганебныя ўчынкі, ад якіх патыхае рабствам. Сапраўды, той, хто можа, але не праціўіцца ліхадзею, фактычна патурае ліхадзейству. І не трэба наіўна думаць, што згаданая гнюснасць ніяк не шкодзіць свабодзе. Ніхто не можа быць свабодным, калі яго жыццю штосьці пагражае. А ці лічыць сябе ў бяспецы сужэнец, чый ложак беспакарана апаганьваюць каханкі? Не. Калі жонка здраджвае мужу, уся любоў пралюбадзейкі да яго знікае. Яна толькі і думае, як бы звесці мужа са свету. І багацці, якія павінны былі б садзейнічаць дабрабыту і выхаванню дзяцей, могуць стаць здабычай падступных юрліўцаў.

Хто знайшоў прыстойную жонку, кажа Эклезіяст, знайшоў і спосаб разбагацець. У асобе жонкі ён мае памочніцу, паплечніцу, надзейную апору свайго спакою. А здрадлівая, бессаромная жонка, якую той самы Эклезіяст называе паршываю сучкай, усё дабро прамантачыць і пусціць на свае зламысныя патрэбы ўвесь мужаў набытак. Але няма несправядлівасці болей жорсткай, чым калі народжаныя ад пралюбадзейства дзеці займаюць месца дзяцей легітымных і нахабна адымаюць у сапраўдных, законных спадкаемцаў маёмасць і іншыя жыццёва неабходныя сродкі. Я ўжо не кажу пра злачынныя забойствы, якія распусныя жонкі здзяйсняюць з дапамогай атруты ці іншых таемных сродкаў. А нярэдка гвалт з мужа ў адкрытую чыняць самі каханкі. Факты такога насілля настолькі шматлікія, што, бадай, і не варта згадваць усе гнюснасці, што плывуць з клаакі гэтай разбэшчанасці.

Такое ліхадзейства чыніць шкоду не толькі асобнаму чалавеку і яго маёмасці, яны ўцягваюць у вір паўсюднага разарэння і згубы ўсё грамадства. Што стала прычынай падзення Троі? Што сутыкнула столькі народаў і падштурхнула іх да ўзаемнай разні і знішчэння? Што спрычынілася да пагібелі столькіх плямён і народаў? Толькі пралюбадзейства Парыса. А калі была згвалтаваная Лукрэцыя, колькі нягодаў скаланала Рым, колькі яму выпала перажыць напасцяў, колькі забойстваў? У ізраільскім народзе таксама пасля гвалту, учыненага з жонкі Левіта, было вынішчанае цэлае пакаленне беніямітаў. З гэтай самай прычыны цяжкая кара спасцігла і Давіда разам з усім ягоным патомствам і нават царствам. Падзеі гэтыя настолькі добра вядомыя, што няма сэнсу спыняцца на іх падрабязна. Помсцячы за ўчыненыя злачынствы, усёмагутны і справядлівы Бог хоча, каб парушальнікі яго канонаў і запаветаў заўсёды атрымлівалі належную адплату. Божы гнеў абрынуўся на ізраільцянаў, і яны апынуліся пад гнётам жорсткага рабства. Сярод іншых правінаў таго на-

рода быў і такі цяжкі грэх, як распуста. Вуснамі прарока Ераміі (5. 7-8) Гасподзь гаворыць: «Я карміў іх дасыта, а яны пералюбы чынілі і натоўпамі хадзілі ў дамы блудніц. Гэта — укормленыя коні, і кожны з іх іржэ на жонку другога. Няўжо Я не пакараю за гэта і ці не адпомсціць душа Мая такому народу, як гэты?» Подлае апаганьванне чужога ложка, як і іншыя забаронныя сувязі змушаюць Бога да помсты паганскаму народу. І гэта павінна ўсяляць апраўданы страх у астатніх. Гасподзь папярэджвае, што за такую мярзотную разбэшчанасць ягоны гнеў насцігне не толькі ізраільцянаў, але і ўсе іншыя народы.

А мы не стрымліваем распусты строгімі законамі, мы дазваляем дзейсніцца гэтым гнюсным злачынствам. Беспакараная свабода грашыць разраслася ў нас неймаверна. Многія лічаць такія ўчынкі за подзвіг і выхваляюцца сваім пяршынствам у шматлікім апаганьванні чужога сужэнства. Бо калі нешта не прадугледжвае пакарання, яно ўспрымаецца як нешта дазволенае і нават прыстойнае.

Некаторыя гісторыкі, у тым ліку Сабэліюс, пішуць, што згодна са звычаямі і норавамі літвінаў нашым жанчынам са згоды мужоў дазваляецца мець палюбоўнікаў. З яго словаў, у народзе такіх палюбоўнікаў называюць сямейнымі памагатымі. Але ж мы, насельнікі Літвы, добра ведаем, што гэта няпраўда, і Сабэліюса, зрэшты, знакамітага пісьменніка, можна абвінаваціць у легкадумным пашырэнні фальшывых звестак. Літвіны вызначаюцца прыстойнымі звычаямі, пабожнасцю, адукаванасцю і іншымі станоўчымі якасцямі так, што могуць сваімі вартасцямі з поспехам сапернічаць за пяршынства сярод іншых народаў. Не трэба думаць, быццам наш народ такі дзікі і варварскі, што ліквідаваў маральна-этычны закон, закладзены ў свядомасць людзей самою прыродай. У нашым народзе, сапраўды, ніколі не было юрыдычных нормаў, якія каралі б за пралюбадзейства, таму жанчыны маглі бязбоязна і больш-менш свабодна займац-

ца любоўю. Нічога дзіўнага, што пры такіх абставінах некаму пачало мроіцца, быццам наш народ праз свае законы і звычаі ўспрымае адзюльтэр як нешта дазволенае і прыстойнае, хоць кожны сумленны чалавек у нас лічыць распусту за ліхадзейства. Таму, каб зняць гэты агідны, ганебны ярлык, пачэплены ўсім літвінам, нашы заканатворцы павінны абавязкова ўвесці строгі закон супроць шлюбнай нявернасці і стрымаць пажадлівасць пралюбадзеяў.

Як бо ўсякае грамадства складаецца з мужчын і жанчын, то, калі не стрымліваць ворагаў і гвалтоўнікаў жаночае цноты, гэта можа давесці да разбурэння самых яго асноваў. Што да жанчыны, то, страчваючы сваю цнатлівасць, яна страчвае і дзявоцкасць, якая так яе ўпрыгожвае.

Вядомыя выпадкі, калі прыстойныя жанчыны пасля згвалтавання не хацелі жыць і па сваёй волі прымалі смерць. Калі нехта гвалтам пазбаўляў іх цноты, жыць далей ім было няміла. Так, Лукрэцыя, апаганеная Тарквініем, учыніла самагубства. А калі Апій у сваёй злачыннай пажадлівасці зняславіў дачку Віргінія, той палічыў за лепшае забіць яе, чым выстаўляць на агульнае ганьбаванне. Рымскія законы цалкам справядліва каралі гвалтаўніка, які належаў да знаці, канфіскацыяй паловы маёмасці. А распусныя прасталюдзіны падлягалі спярша цялеснаму пакаранню, а потым выгнанню.

Разнастайным юрліўцам вельмі лёгка падмануць неабачлівых дзяўчат. Не дасягнуўшы сталага ўзросту, яны няздольныя распазнаць гнюснасць і надта хутка даюць сябе спакусіць. Каб гэтае ліха, а разам з ім і ганьба, і з'едлівыя кпіны іх абмінулі, свабоднае грамадства мусіць мець законы, якія бароняць жаночую цноту і строга караюць юрліўцаў. Мы ведаем, што нават у самых прыстойных і знатных сем'ях нярэдка здараюцца ганебныя ўчынкі, якія няславяць увесь род. Разбэшчаныя нахабнікі, не стрымліваныя ніякім законам, як галодныя псы, рыскаюць

па ўсіх дамах і чыняць свае паскудныя справы. Адзінае, што можа ўтаймаваць гэтых юрліўцаў, — страх перад справядлівай законнаю карай. Апроч таго, свабоднае хрысціянскае грамадства павінна пазбавіцца ад прытонаў распусты, публічных дамоў з іх бессаромнымі прыслужніцамі, і паставіць жорсткі заслон перад свабодай разбэшчанасці, якую суд Божы забараняе цалкам. Ёсць, праўда, пэўныя кананічныя нормы, якія дзеля прадухілення пралюбадзейства, кровазмяшэння і яшчэ цяжэйшых злачынстваў дапускаюць памянёную загану. І нярэдка паганскія пісьменнікі папускаюць лейцы, якія стрымліваюць распусту. Але мудры заканадаўца не павінен кіравацца такімі скажонымі меркаваннямі. Мудры заканадаўца аддае перавагу парадам здаровага розуму і перадусім патрабаванням ці забаронам, якія пад пагрозай суровага пакарання ставіць Божы закон.

Паводле вучэння св. Яна Хрызастома, увесь чалавечы род, створаны Богам, варты павагі і пашаны. Чалавека нельга зневажаць без сур'ёзай правіны або злачынства. Але агорнутаму нястрымнаю жарсцю, яму бывае вельмі цяжка суняць свае злачынныя намеры. І нярэдка, адкінуўшы ўсякі страх, ён кідаецца ў цянёты агіднага, цяжкага юру. Скажоная недарэчная паблажлівасць не толькі не стрымлівае распалены розум юрліўца ад ліхога ўчынку, а наадварот — падштурхвае да яго, што прыводзіць у выніку да пачварных правапарушэнняў. Апанаваны пажадай юрлівец не зважае ні на якія разумныя нормы і, як сведчыць Калумела, не думае ўжо ні пра што, акрамя любошчаў. Задавальненне сваёй неадольнай цягі ён уяўляе за найвышэйшую слодыч, а няўдачу ўспрымае як самую страшную кару.

Марна спадзявацца, што чалавек, які ўгруз у распусце і пераступае ўсе нормы прыстойнасці, знойдзе час на высакародныя ўчынкі і праявы душы. Яму, як той нячыстай свінні, карціць толькі адно — хутчэй паваляцца ў смуроднай тхлані ўцехаў. Я ўжо не кажу, што жыццю юрліўцаў пагражае ўвесь

час небяспека. Заразныя хваробы як справядлівая Божая кара неадступна пільнуюць пажадлівых сладастраснікаў. А нярэдка яны паміраюць і ад атрутнага зелля блудніц ці гінуць ад ран, атрыманых у бойках.

Дык няхай жа народ наш, занепакоены гэтай злыбедаю, ачысціць грамадства ад пошасці, якая не стасуецца з прынцыпамі свабоды. Мы не павінны цярпець на нашых шматлюдных соймах натоўпы распусных нахабнікаў, бо гэта ганьба для ўсёй краіны і боль для кожнага яе пабожнага грамадзяніна. Чаму злодзею за крадзеж нават невялікай маёмасці, якую можна лёгка зноўку набыць, у нас назначаецца смяротнае пакаранне, а спакуснік і разбэшчаны гвалтаўнік, якія назаўжды губяць дзявочую цноту, не заслугоўваюць хоць нейкага пакарання? Мы марудзім і пазіраем праз пальцы на пачварнае бязэцтва, што пануе паўсюдна. Але Божая помста ўжо блізкая, і мы заплацім за сваю марудлівасць суроваю карай. Хутка мы дойдзем, што замест свабоднага грамадства ў нас не будзе ніякага.

# Раздзел XII

## Дзеля забеспячэння агульнай свабоды і грамадзянскага дабрабыту трэба выдаць законы, якія абмяжоўваюць п'янства

Акрамя іншых высокіх вартасцяў, наш народ славіцца сваімі гуманнасцю і гасціннасцю. Няма, бадай, ніводнага іншага народа, дзе так зычліва ставяцца да ўсякага прыстойнага чалавека і так дружалюбна прымаюць не толькі сваіх, але і замежных гасцей. Па нашых краях можна падарожнічаць без вялікіх выдаткаў, нават маючы вялікую світу. Тутэйшае жыхарства сардэчна запрашае гасцей да сябе ў дом і задарма прапануе шчодры частунак. Я маю на ўвазе не заезныя дамы, хоць і там госцю прапаноўваюць усё патрэбнае за болей справядлівую цану, чым у іншых народаў. Я вяду гаворку пра нашых сялян і шляхту. Іх дамы адчыненыя ўсім. Гаспадары гатовы сустрэць наведніка з самай сардэчнай гасціннасцю. Не задаволіць госця напоўніцу ці выклікаць у яго хоць нейкае падазрэнне ў скупасці лічыцца за найвялікшы грэх. Залішне казаць пра адметную ветласць, нязменную далікатнасць і заўсёдную гатоўнасць неадкладна і ва ўсім дапамагчы. Са свайго штодзённага досведу гэта добра ведае кожны.

Але ёсць хвароба, якая нярэдка разбурае і нішчыць спакойнае, мірнае жыццё многіх людзей, — гэта дурная звычка піць і патрабаваць ад іншых піць столькі ж. Загана ўкаранілася да таго, што стала ледзь не агульным законам, і благім яго наш народ не лічыць. Зрэшты, не мінула гэтая бяда і іншыя народы. Папойкі ў іх часцяком бываюць нават горшыя, чым у нас. Але запазычваць непрыстойныя, нізкія норавы нам не варта. Для нас прыкладам павінны стаць цвярозасць і ўмеркаванасць. Вялікаю стрыманасцю тут вызначаюцца гішпанцы. Не саступаюць ім

італьянцы і французы. А наш народ, роўны па сваіх вартасцях іншым, не можа пасупернічаць з імі ў слаўнай цвярозасці. Дык можа, калі нішто не пераконвае наш люд крочыць у нагу са слыннымі цывілізаванымі нацыямі, яго навучаць пазбягаць гэтай жывёльнай, цалкам недастойнай хрысціян асалоды туркі? Бо гэты варварскі паганскі народ надае цвярозасці такое важнае значэнне, што лічыць патрэбным аддаваць прапойцаў на ганьбу і караць бізуном.

Залішне прыгадваць, колькі незлічоных ліхтугаў, звадаў, смутаў, грамадзянскіх міжусобіцаў спарадзіла п'янства. Яскравым сведчаннем гэтых бедаў ёсць наша будзённая рэчаіснасць. Амаль кожная сутычка, у якой гіне чалавек, кожная бойка, што нясе разарэнне і страты, адбываецца там, дзе перапітых да страты розуму выпівох агортваюць шал і прага да ўзаемнага збройнага вынішчэння.

Цалкам слушна казаў Ізакрат: чалавек, чый розум занадта абцяжараны хмельнымі напоямі, паводзіць сябе, як воз, з якога выпаў вазніца. Падобна таму, як калёсы, страціўшы кіроўцу, ляцяць напралом, так і чалавек з адурманеным розумам здольны чыніць незлічоныя правапарушэнні. Паводле Платона, ап'яненне не толькі моцна ўзбуджае нашы органы пачуццяў, але і разбурае адчуванні, памяць, кемлівасць, разважнасць. Таму некаторыя мудрыя праўнікі патрабуюць, каб падсуднага, які здзейсніў цяжкае злачынства ў п'яным стане, каралі падвойнаю карай. Бо ён вінаваты, што наўмысна пазбавіў сябе здаровага розуму і зрабіў схільным да любога злачынства. Не дарма святы Базылік называе ахмяленне то вінным, то добраахвотным д'яблам, які са згоды чалавека пранікае ў яго глузды і авалодвае імі.

Але ў нас насуперак здароваму сэнсу лічаць, што чалавек не заслугоўвае пакарання, калі пераступіў закон у стане алкагольнага ап'янення. Маўляў, ён зрабіў гэта не намерана. І часцяком злачынцу апраўдваюць на той падставе, што злачынства было

здзейсненае ім па дурасці, абумоўленай памарачэннем розуму ад выпітага віна. А тым часам п'янчуг, якія няхай нават і не ўчынілі правапарушэнняў, трэба караць самым строгім чынам, бо яны самахоць страцілі розум і давялі сябе да быдлячага стану. Так, іншы раз п'янчуга нічым нікому не пагражае. Але п'янства трэба абмяжоўваць яшчэ і таму, што яно руйнуе цела, здароўе, здольнасці саміх п'янчуг. Яны не ў стане весці ніякія справы. А значыць, п'яныя напоі шкодзяць не толькі самім прапойцам, але і ўсяму грамадству. Як порсткі ўвішны звер, алкаголь нястомна цікуе новых ахвяраў, каб уздзець іх на свае рогі. Вось чаму ахвочыя да спіртнога заслугоўваюць не толькі асуджэння, але і строгай кары.

У нашых гарадах, мястэчках, вёсках можна бачыць падвыпіўшых і п'яных нахабнікаў, якія бадзяюцца, трывожаць людзей, зневажаюць і лаяць кожнага стрэчнага. Калі пачнеш абурацца — толькі наклічаш на сябе бяду. А пройдзеш моўчкі — панясеш у сэрцы глыбокую крыўду. Я ўжо не кажу пра дзікія вар'яцкія начныя крыкі, якімі поўняцца нашы вуліцы. Ашалелы сп'янелы натоўп, вораг цішыні і спакою, не дае хоць на час звесці вочы, то тут, то там усчынаючы то бойку, то панажоўшчыну.

Саламон у сваіх Прытчах кажа, што віно спараджае глумліўцаў, п'янка прыводзіць да буйства. І кожны, хто знаходзіць у ахмяленні асалоду, робіцца безразважны. А вось яшчэ сведчанне Ксенафонта: персідскі цар Кір, будучы яшчэ хлапчуком і жывучы ў свайго дзеда Астыягена, вельмі трапна пажартаваў з падчашага Сака. Унучак сказаў, што Сак, які налівае віно цару і гасцям, напэўна, падмешвае ў яго атруту. Бо ад такога пітва ўсе раптам страчваюць розум, чмурэюць і пачынаюць паводзіць сябе непрыстойна і недарэчна. Цар нібыта забывае, што ён цар, а госці не памятаюць, што над імі ёсць уладар. Аляксандр Македонскі пасля шматлікіх слынных подзвігаў і слаўных перамог упаў у такое п'янства, што ў папойках сваіх пазабіваў многіх

сяброў. За гэта яго ўзненавідзелі. А непераможнае Ганібалава войска, пакрысе аслабленае і зняможанае гулянкамі і папойкамі ў час пастояў, страціла сваю мужнасць і сілу і ў выніку было паступова разбітае і знішчанае рымлянамі.

Такімі прыкладамі поўняцца ўсе святыя і свецкія кнігі. Яны апавядаюць пра страшную смерць ці ганебныя, гнюсныя ўчынкі тых, хто даваў сябе зацягнуць у агідны вір п'янства. Але нам няма патрэбы шукаць фактаў у далёкіх замежных землях, бо само будзённае наша жыццё дае нам выдатна адчуць усю мярзотнасць прапойцаў. Мудрэц у прыпавесцях сваіх прамаўляе: «Дзе многа п'юць, там лямант і стогны». Некалі ў спартанцаў, чыя дзяржава вызначалася слаўнымі інстытуцыямі, быў звычай прывозіць п'яных рабоў і паказваць дзецям, як яны ванітуюць. Мярзотнае, брыдкае відовішча павінна было адпудзіць малалетак ад перайманння ганебных і паскудных паводзінаў п'янчуг. Кажуць, што і цар Кір катэгарычна забараняў свабодным і знатным людзям ужываць усякае віно. А вось рабам п'янства ім дазвалялася.

Але ў нашым народзе шляхта і вышэйшая знаць не даюць люду простага і нізкага звання перахапіць у іх гэткую славу. Нават больш — яны ўсяляк імкнуцца ўзяць у гэтым над прасталюдзінамі зверхнасць. Так што людзям цвярозым, не схільным да крайнасцяў, ужо й няможна трымацца залатой сярэдзіны. Калі ў дом шляхціца прывалаклася п'яная кампанія, ён згодна са звычаем павінен гэта цярпець, выпіваць з імі разам і старацца здабыць іх прыязнасць. І адзіным клопатам у такіх гулянках ёсць старанне не адстаць ад субяседніка па колькасці выпітага. Бо адмову піць чарка ў чарку могуць палічыць за найвышэйшую зняваги. І часта здараецца, што слабасільнаму, які не хоча загінуць ад клінка, даводзіцца падрываць свае кволыя духоўныя і цялесныя сілы і гінуць ад непамернасці выпітага. Часам гаспадар, унікаючы такой злыбеды, мерыцца прыбраць келіхі, але п'янчуга расцэньвае гэта за пагарду да сваёй асобы

і кідае на недалужніка такі пагрозлівы позірк, абкладае яго такім моцным слоўцам, што той воляй-няволяй скараецца і прымушае сябе дапіць усё да дна.

П'янства, безразважная звычка піць прыводзяць урэшце да таго, што большасць выгодаў свабоды, якія ўжо самі па сабе робяць чалавечае жыццё чалавечным, аказваюцца для нас страчанымі. Калі не спыніць п'янства строгімі санкцыямі, то пры цяперашнім разгуле гэтай здаўна ўкаранелай злачыннай звычкі няма надзеі, што цвярозасць у нашай краіне знойдзе належнае месца і ўмеркаванасць стане агульным правілам.

Некалі ў Грэцыі былі пітныя суддзі. Іх называлі *ойнопта-самі*. Гэтыя суддзі маглі пакараць кожнага, хто перабраў меру, выпіўшы залішне віна. Сённяшнія туркі б'юць п'яных палкамі, каб гэтая кара стрымлівала выпівох і змушала іншых ставіцца да пітва з большай перасцярогаю. Дзякуючы цвярозасці туркі вельмі ўзмацнілі сваё грамадства, пра што яскрава сведчаць шматлікія паразы хрысціянаў.

А ў нас? Па меры таго як наш народ адыходзіў ад умеркаванасці, ашчаднасці, стрыманасці, якія былі ўласцівыя продкам, ён страчваў дабрачыннасць, высакароднасць, цнатлівасць, вайсковую дысцыпліну, трываласць перад нягодамі. Ён стаў як жанчына распешчаны. У нас часцяком бяздзейнічаюць суды, амаль усе крэслы суддзяў пустуюць, а паны, як кажа прарок, здольныя хіба толькі піць віно ды праяўляць сваю моц у п'янстве.

Сярод моладзі юнакі ўжо не імкнуцца здабыць пяршынства ў высакародных і мужных справах, а забаўляюцца высцігамі, хто вып'е больш агромністых келіхаў. Заезныя дамы, якія мусяць забяспечваць сваім і замежным гасцям надзейны прытулак, дзень і ноч поўняцца п'яным збродам. Такія дамы цалкам справядліва называць не корчмамі, а бандыцкімі прытонамі. Хутчэй за ўсё, з такіх прытонаў і выпаўзаюць шайкі зладзеяў, каб цікаваць на дарогах багатых наведнікаў. І ўжо, несумненна, яны спараджа-

юць плоймы жабракоў, якія бадзяюцца потым па вёсках і жаруць чужы дармовы хлеб.

Кожны, на каго звальваецца п'яная напасць, страчвае свой набытак і дабрабыт, робячыся голым, як той бізун. Шматлікія факты няспынна сведчаць нам пра вялікія беды, якія ў выніку празмернага ўжывання моцных напояў абрынуліся амаль на ўсё грамадства. Збядненне і п'янства сялян дайшлі да таго, што пустуюць палеткі, і нават у майстэрнях не ўбачыш майстроў.

Няма нічога карыснейшага, больш дабратворнага для здароўя грамадства і больш дзейснага для ўмацавання агульнай свабоды, чым паўсюднае выкараненне такога ліха, як п'янства. П'янчуг трэба стрымліваць рознымі відамі пакарання. У залежнасці ад асобы і яе статуса гэта можа быць або нейкае ганебнае кляймо, або зняволенне, або штраф.

# Раздзел XIII

## У СВАБОДНЫМ ГРАМАДСТВЕ ВЕЛЬМІ ПАТРЭБНЫЯ ЗАКОНЫ АБ ВЫДАТКАХ НА РАСКОШУ

Усе мудрацы ў цэлым згаджаюцца, што ва ўсякім грамадстве прысутнічаюць дзве немалаважныя заганы: раскоша і прагнасць. І гэтак сама, як ашчаднасць і ўмеркаванасць садзейнічалі ўмацаванню цэлых імперый, сквапнасць і празмерныя багацці спараджалі ў краінах вялікія бедствы і прыводзілі да разбурэння і гібелі ўсяго грамадства.

Адбіць небяспеку, якая паграждае бацькаўшчыне, здольны толькі той, хто рухавы і дужы, чый розум не распешчаны ўцехамі і чыё цела прывучанае да памяркоўнасці ў харчаванні і загартаванае фізічнаю працай. А хто купаецца ў раскошы і не прывык саступаць спакусам, той жыве лянотным, лайдачым жыццём, якое не нясе ніякай карысці айчыне. Людзі, заклапочаныя аздабленнем свайго жытла, спажываннем далікатных страваў, набыццём элегантных убораў, узвядзеннем велічных збудаванняў, маюць патрэбу ў значных сродках. І ўвага такіх людзей нярэдка скіроўваецца на супрацьзаконнае, несправядлівае авалоданне чужою маёмасцю. Калі ж у грамадстве пачынае квітнець такі неадлучны спадарожнік раскошы, як сквапнасць, у ім узнікаюць нянавісць і варажнеча. Пастаянныя ўзрушэнні руйнуюць грамадства і прыводзяць да заняпаду. Яскравым прыкладам гэтага служыць тайная змова, зладжаная Катылінам. Яе вытокамі сталі якраз гэтыя дзве гнюсныя крайнасці чалавечай натуры — раскоша і сквапнасць. Менавіта яны падштурхнулі Катыліну задумаць патаемны замах на айчыну. Тады знайшлося нямала малойцаў і несумленных грамадзян, якія, жывучы, што называецца, на шырокую нагу і прамантачыўшы сваё багацце, паклалі прагнае вока на ўласнасць іншых. Неўзабаве яны рас-

пачалі супроць грамадства вайну. Калі б Цыцэрон не папярэдзіў пра небяспеку і ўлады не прынялі адпаведных засцерагальных заходаў, нахабныя хціўцы з іх падступнымі вераломнымі замысламі несумненна задушылі б свабоду прыстойных грамадзянаў. Пралілася б кроў, загінулі б многія нявінныя людзі. І хоць падобныя ліхадзействы не заўсёды заканчваюцца трагічна і не кожны раз нясуць пагрозу грамадзянскай вайны, але марнатраўства заўсёды адчувальна нішчыць дабрабыт асобнага чалавека, спараджае вялікую дарагавізну і харчоў, і адзення, кладзецца цяжкім гнётам на няшчасны люд. Ужо з гэтай прычыны празмернае матаўство неабходна абмяжоўваць.

Ва ўсіх знаных грамадствах лічылася, што ў ліку іншых важных законаў павінен быць і закон, які стрымлівае непамерныя выдаткі грамадзян. Так, Оппіеў закон у рымлян патрабаваў, каб жанчыны насілі на сабе не больш, як на паўунцыі золата. Ім не дазвалялася апранаць рознакаляровыя строі і ездзіць у конных павозках па горадзе ці мястэчку, а таксама ў наваколлі бліжэй, як за мілю ад гэтых паселішчаў. Закон аказаўся вельмі карысны. Калі рымскіх жанчын пазбавілі магчымасці насіць дарагое ўбранне, яны пачалі ахвотна ахвяраваць срэбра і золата на папраўку дзяржаўнага скарбу. А стан рэчаў у дзяржаве тады быў сапраўды кепскі. Ганібал-пераможца выматаў у рымлянаў усе сілы. І калі б Оппіеў закон не пастанавіў забраць прадметы раскошы ў насельніцтва, выплачваць воінам заробак зусім не засталося б сродкаў. А без гэтага немагчыма было спыніць наступ Ганібала-пераможцы, які пагражаў мурам горада. Праўда, пазней, у перыяд росквіту Рымскай дзяржавы, гэты закон з легкадумнай ініцыятывы трыбунаў быў адменены, і ўсе жаночыя аздобы зноў былі дазволеныя. Катон, зрэшты, прадбачыў нядобрае і ўжо тады бурна даводзіў трыбунам, што такая адмена паслужыць дрэнным узорам. Наколькі справядлівай была яго перасцярога, досыць пераканаўча сведчыць тое, што раскоша

пачала сапернічаць з прагнасцю, і ў выніку пачаўся найбольшы заняпад Рымскай імперыі.

Але не будзем шукаць далёкіх прыкладаў. Звернемся да некаторых падзеяў блізкіх, сучасных і зусім недалёкіх, з якіх таксама будзе няцяжка зрабіць выснову, што агідная прага да нажывы ў спалучэнні з раскошай прыносілі нават самым магутным імперыям і царствам разарэнне і гібель.

Калі больш за стагоддзе назад люты турак аблажыў Канстанцінопаль, яго грамадзяне змаладушнічалі. Нягледзячы на тое, што імператар Канстанцін настойліва прасіў і нават патрабаваў грошай для набору войска, людзі закопвалі свае скарбы ў зямлю, хавалі ў сховах, абы толькі не аддаць каштоўнасцяў і значнай часткі срэбра і золата на карысць грамадства. Націск туркаў, чым далей, тым усё больш мацнеў. Але абаронцаў на гарадскіх мурах было надта мала, і яны не маглі даць адпор варожаму наступу. А пры спустошанай дзяржаўнай скарбніцы набраць падмацаванне магчымасці не было. Пры слабым супраціве маларікага гарнізону дзёрзкасць ворага расла ўсё больш. Расла і надзея, а потым і ўпэўненасць туркаў, што горад можна ўзяць. Пасля чарговага моцнага і імклівага штурму Канстанцінопаль нарэшце паў. Імператар быў забіты, грамадзяне знявечаныя і пасечаныя насмерць. Горад з усімі яго каштоўнасцямі і безліччу срэбра і золата перайшоў пад уладу жорсткага ворага. А калі ўсе схаваныя скарбы потым павыцягвалі з тайнікоў і выставілі перад вачыма супастата, той здзівіўся незвычайнай дурасці насельнікаў. Кажуць, ён уголас абурáўся гнюснай прагавітасцю хціўцаў, якія ў цяжкую для айчыны гадзіну так ганебна клапаціліся толькі пра свае багацці.

Сапраўды, калі б гэтыя багацці былі патрачаныя на паспалітыя патрэбы, то існавала б магчымасць выйграць любую, нават самую цяжкую вайну. Але багацеі, тупагаловыя рабы золата, былі гатовыя хутчэй ахвяраваць жыццём, чым аддаць

свае скарбы. І гэтыя скупцы загінулі або апынуліся ў жорсткай няволі. Іх багацце не прынесла ім радасці. Яно стала здабычай ворага, каб наталіць не іх, а яго прагавітыя жаданні.

Вось так сквапнасць асляпляе розум чалавека. Грамадзяне, прызвычаеныя да багацця й раскошы, зусім не дбаюць пра бяспеку дзяржавы. Яны рупяцца толькі пра свае прыватныя інтарэсы і тым самым імкліва набліжаюць уласную згубу. Гэтая загана практычна ў нас на вачах давяло квітнеючае некалі Вугорскае каралеўства да такое бяды, да такое жалю вартай нядолі, што для нас, вугорскіх суседзяў, лёс іх грамадства павінен служыць знакавым напамінам пра неабходнасць абмяжоўваць раскошу і сквапнасць. Бо там першапрычынаю стала любоў да багацця. Сярод знаці пачаліся высцігі ва ўсякага кшталту раскашаваннях і баляваннях. Паступова чэзлі ўзаемная прыязнасць і згода. Дзяржаўныя патрэбы прыходзілі ў занядбанне. Саперніцтва штурхала ўсіх на міжусобныя сутычкі і вынішчэнне. Нікому нават не было ў галаве, што трэба адагнаць ворага ад межаў дзяржавы. А вораг, між тым, ужо штурмаваў трывалыя вугорскія фартэцыі і ўмацаванні. Знаць жа тым часам выхвалялася ў конных і пешых маршах неверагоднымі сваімі багаццямі, прымушаючы шпацыраваць полчышчы жаўнераў, ззяючых золатам і срэбрам. Усіх апанавала такая фанабэрыя, што ніхто надта не прыслухоўваліся да голасу караля, які заклікаў да вайсковага рушэння. Эліта падпарадкоўвалася яму з вялікаю неахвотай, і кожны збіраўся, калі хацеў, а не ў адзін час, як патрабавалі надзвычайныя абставіны і навіслая небяспека. Тады кароль Людовік, пакінуты на волю лёсу, з невялікім конным атрадам і небагатым ваенным рыштункам вырушыў сам супроць моцнага, узброенага да зубоў ворага. У няроўным змаганні кароль страціў жыццё і каралеўства, пакінуўшы Вугоршчыну жорсткаму ворагу на рабунак і разарэнне.

Калі Саліман разглядаў трупы вяльможаў, яму прынеслі

галаву нейкага стрыгонскага біскупа Уладзіслава. Кажуць, што супастат папракнуў нават мёртвага біскупа ў ганебнай скупасці. Той жмінда хоць і меў скарбы, у прыватнасці вялікую колькасць золата, але каралю, які прасіў сродкаў на ваенныя патрэбы, адмовіў. Біскуп не хацеў даваць золата задарма, пагаджаючыся яго хіба што пазычыць.

Няхай жа нашаму народу ніколі не давядзецца бачыць такога сумнага відовішча, якое здарылася ў Вугорскім каралеўстве. Але і ў нас раскоша і сквапнасць ужо дасягнулі такіх памераў, што па размаху баляванняў, па вычварнасці ўбранняў і ўпрыгожанняў мы апярэджваем усіх вядомых сібарытаў, а па вынаходству новых спосабаў выкалочвання грошай перавышаем, бадай, самога Веспасіана, які выціскаў прыбытак ажно з мачы. Сёння можна сустрэць нават людзей нізкага звання, якія ходзяць у ядвабе, перлах і золаце. Шалёная прага мець вытанчаныя аздобы настолькі засела ў галовах некаторых франтаў, што яны без вагання прадаюць фальваркі, землі, а часам і ўсю сваю спадчыну, абы толькі ўсе бачылі, як зіхаціць на іх золата і пурпур, як гарцуюць яны на конях у каралеўскім бляску. Каб набыць у далёкіх краінах чужаземныя прадметы раскошы, ганарліўцы трацяць не толькі шмат срэбра і золата, але і наўзахапкі збіраюць збожжа і экспартуюць яго ў заморскія землі. А найвышэйшым паказчыкам нашай неразважнасці і дурасці ёсць тое, што гэтае ж збожжа вяртаецца зноў да нас, але ўжо па нашмат большай цане. Празмерная дарагоўля і нястача хлеба нясуць нашаму народу страшныя беды. І сведчанне гэтаму — шматлікія целы памерлых ад бяскорміцы й голаду, якія валяюцца па ўсіх гарадах, мястэчках і вёсках.

У недалёкім мінулым, пра якое памятаюць яшчэ нашы бацькі, такіх бедстваў не ведалі, хоць не кожны год удаваўся ўрадлівым. Здаралася, пры неспрыяльным надвор'і ўраджай быў дрэнны. Але ж збожжа, якое людзі адкладвалі на працягу некалькіх

гадоў, разам з іншымі харчовымі запасамі засцерагалі народ ад недаядання і голаду, ужо не кажучы пра галодную смерць. Тады яшчэ нікому не карцела так мець пурпурныя і ядвабныя строі. Збожжа і іншы наедак не абменьвалі на заморскі тавар. І ніхто не баяўся голаду, калі надараўся неўрадлівы год. Людзей не вабілі турэцкія, гішпанскія, італьянскія ці арабскія коні. Ставала тых, якіх гадавалі дома. Імі карысталіся і ў ваенны, і ў мірны час. І коні гэтыя былі не якія-небудзь нядошлыя ці замораныя, а моцныя, цягавітыя. Як і самі гаспадары, яны маглі вытрываць любое ваеннае ліхалецце. А цяпер, калі тутэйшыя паны ўпадабалі коней, якіх купляюць аж за горы золата і не іначай, як у далёкіх чужых краях, на ўсіх напала такая лянота, такая млявасць, што немагчыма ўжо ні каня выпхнуць са стайні, ні вершніка адарваць ад цёплага месцейка. Не дзіва, што паўсюль толькі й квітнее паказная раскоша. Адзін выхваляецца перад другім ужо не подзвігамі і не мужнасцю, а раскошным убраннем і багаццем закусі ў сваіх застоллях. Нашыя продкі падавалі на стол усяго адну страву, цяпер жа на баляваннях вялікіх паноў можна ўбачыць, як сталы гнуцца пад цяжарам і трыццаці, і сарака стравaў. Калі ўлады не стрымаюць такіх непамерных выдаткаў, немінуча ўзнікне пагроза, што людзі з меншым дастаткам пачнуць галадаць.

Некалі імператару Гэльягабалу захацелася праславіцца шчодрай гасціннасцю і вытанчаным хлебасольствам. Ён падаў на стол шэсцьсот страўсавых галоваў, каб пачаставаць субяседнікаў страўсавымі мазгамі. Але ж як бо ў нас столькі страўсаў няма, то нашыя паны, у якасці процівагі, з'ядаюць амаль такую ж колькасць рознай іншай птушкі і ўсякае смакаты. Законы павінны, як цуглямі, стрымаць такое вар'яцкае абжэрства і згубнае марнатраўства. Грамадзян трэба прымусіць жыць умеркавана, бо ўмеркаванасць ёсць калі не крыніцай, то ахавальніцай і аздобай усякай чалавечае вартасці.

Грамадству надзвычай важна, каб ніхто не злоўжываў сваёю

маёмасцю і каб кожны падпарадкоўваў свае жаданні загадам розуму — творцу справядлівых законаў. Калі чалавек хоча трымацца годнага, здаровага ладу жыцця, ён не павінен ганяцца за бруднымі ўцехамі, шкодзячы і сабе, і іншым. Я ведаю, што многія будуць супроць закона аб выдатках на раскошу. Яны зараз пачнуць на ўвесь голас даводзіць, што гэта — таксама своеасаблівае рабства. Такі закон, маўляў, пазбавіць грамадзян права свабодна распараджацца сваімі рэчамі і стане на іх незвычайным цяжарам. Але ж папярэднія аргументы дастаткова паказалі, што дабрачыннасць, прадыктаваная розумам, не пярэчыць свабодзе. Таму не трэба наракаць на новы закон, калі ён карысны грамадству. Паводле Лівія, Катон рашуча выступаў за пралангацыю Оппіевага закона аб выдатках на раскошу. Ён цалкам слушна казаў, што хваробе лягчэй запабегчы, чым шукаць супроць яе лекі. На жаль, людскія жарсці ўзнікаюць раней, чым прымаюцца скіраваныя супроць іх законы. Калі б мы бачылі, што і цяпер усе трымаюцца ўмеркаванасці і ашчадлівасці, як было ў нашых продкаў, то нас менш за ўсё турбаваў бы закон, які абмяжоўвае раскошу. Яна, гэтая раскоша, проста не існавала б. Але ж вельмі многія сёння, адкінуўшы ўсякія абмежаванні ў адзенні і ежы, глыбока ўгрузлі ў непрыстойных уцехах. А таму, калі мы хочам зберагчы наша грамадства, мы павінны з дапамогай законаў стрымаць тых ненасытных, якія ператварыліся ў рабоў раскошы і марнатраўства.

А калі знойдзецца раптам зласлівец, які, наследуючы Дуронію, пачне выказваць нездавальненне законам, што змушае скаржнікаў да ашчаднасці, то, па-мойму, такі чалавек будзе заслугоўваць цэнзарскага асуджэння. Некалі ў Рыме Дуроній запатрабаваў скасаваць закон, які абмяжоўваў выдаткі на банкетаванне. Як сведчыць Валерыюс, гэты прамоўца бесцырымонна ўзышоў на растральную трыбуну і сказаў: «Рымляне, вы ні ў якім разе не павінны цярпець тыя цуглі, якімі вас закілзалі. Вы аблытаныя, звязаныя нязноснымі путамі рабства. Выдадзены закон

загадвае вам быць ашчаднымі. Дык ліквідуем гэтую пачварную імперскую норму, пакрытую іржой дзікай старасветчыны. Навошта свабода, калі не маеш дазволу нават пры жаданні загінуць ад раскошы». Цэнзары пакаралі Дуронія ганебнай вымовай і выгнаннем з сената.

Выгнанец меў скажонае паняцце аб свабодзе. Пад свабодай ён разумеў магчымасць чыніць зло і распуснічаць. Але ж свабода мае на ўвазе выключна прыстойнае жыццё і беззаганныя ўчынкі. А вось калі чалавек скараецца такім жорсткім гаспадарам, як ненатольнае абжэрства і неўтаймаваныя плоцевыя ўцехі, то гэта якраз і ёсць самым агідным рабствам. Як трапна заўважае Валерыюс Максімус, у гэтых заганах нікнуць усе чалавечыя вартасці, блякнуць перамогі, пацямнелая слава абарочваецца ў ганьбу, а духоўныя і фізічныя сілы слабеюць так, што ўжо й невядома, адкуль пагражае большая небяспека: ад варожага палону ці жарсцяў, якія цябе апанавалі. Гісторык прыводзіць даволі пераканаўчы эпізод з жыцця Вальсініяў. Якая сумная і ганебная пляга, якое рабства абрынулася на той горад, калі яго насельнікаў агарнула прага да непамернага багацця й раскошы. А некалі гэта быў магутны горад, вядомы сваімі звычаямі і законамі, якія служылі надзейнымі вартаўнікамі сапраўднай свабоды. Ён лічыўся сталіцай Этрурыі. Калі ж яго раз'ела раскоша, горад абрынуўся ў бездань несправядлівасці і заганаў, апынуўшыся пад уладай недасведчаных, але пыхлівых рабоў. Спачатку толькі некалькі найбольш нахабных адважыліся пралезці ў сенат, але неўзабаве рабы захапілі ўсю ўладу ў дзяржаве. Па іх прыхамаці пісаліся і перапісваліся тастаменты. Знаці забаранялася ладзіць банкеты й застоллі, а рабы жаніліся на дочках сваіх гаспадароў. Пазней была ўвогуле санкцыянаваная беспакаранасць распусных сувязяў з удовамі і чужымі нявестамі. Ніводнай дзяўчыне не дазвалялася выходзіць замуж за знатнага, пакуль які-небудзь раб першы не пазбавіць яе дзявоцкасці. У такім вось агідным,

ганебным рабстве аказалася жыццё грамадзян, разбэшчаных раскошаю і пажадай. У вачах кожнага яно ўяўляецца сёння поўнай пачварнасцю.

Калісьці Лікург, таксама знакаміты сваімі юрыдычнымі ўстанаўленнямі, прапанаваў абмежаваць з дапамогай законаў раскошныя банкеты і іншыя баляванні, назваўшы іх узбуджальнікамі непатрэбных жарсцяў, і заклікаў падданых да памяркоўнасці. У спартанцаў былі не толькі законы, скіраваныя супроць п'янства, але і нарматыўныя акты, якія тычыліся адзення, і эфорам даручаўся паўсядзённы агляд вопраткі грамадзян. Эліян расказвае, што, калі выяўлялася, што ўбранне не адпавядае сціпласці і прыстойнасці, вінаватых каралі па ўсёй строгасці закона. Павучальна і паказальна тое, што толькі жанчынам лёгкіх паводзінаў дазвалялася насіць залатыя, срэбныя і жамчужныя ўпрыгожванні. Гэта павінна было адвярнуць сумленных, цнатлівых жанчын ад усякай раскошы і падахвоціць іх да суперніцтва ў цноце, разважнасці і ашчаднасці. Такія правілы дагэтуль захоўваюцца ў Венецыянскай рэспубліцы. І самі бяседы, і строі бяседнікаў там маюць пэўныя абмежаванні. Так, асобы, якія падалі на стол аднаго ці двух каплуноў, а разам з імі ялавічыну, бараніну ці якія-небудзь далікатэсы і моцныя прыправы, падлягаюць штрафу. Калі застолле — не вяселле і не якая-небудзь іншая вялікая ўрачыстасць, жанчынам знатнага паходжання не дазваляецца насіць каралі, перлавыя аздобы, надзяваць ядвабныя строі. Абмяжоўваецца велічыня пасагу. Нават самаму багатаму забараняецца даваць у пасаг больш за шэсць тысяч залатых. А раней некаторыя адвальвалі і па шэсцьдзесят тысяч дукатаў.

Тым часам у нашай кране ў людзей рознага паходжання і рознага стану раскоша дасягае неверагодных памераў. Асабліва вызначаюцца ў гэтым жанчыны. У аздобах і строях ім дадзеная такая свабода, што ўзнікае ўражанне, быццам на жаночае ўбранне ідуць грошы ўсяго грамадства. Жанчыны стараюцца паказаць

сябе ва ўсім бляску свайго багацця, ва ўсёй красе разнастайных убораў, ва ўсім хараstве самацветаў, якія аж зіхцяць чырванню й золатам. І ў пасаг за іх патрабуюць многія тысячы. У выніку прыстойныя, шляхетныя дзяўчаты, у чыім доме меншы дастатак, не могуць выйсці замуж. Яны або так і старэюць, застаючыся векавухамі, або згаджаюцца на ганебнае замужжа. Нашыя продкі былі нашмат ашчаднейшыя. Па іх законах і звычаях, нават самыя знакамітыя сем'і давалі ў пасаг усяго трыццаць марак.

Як заўважае Кратэт, мужчыны чакаюць ад сваіх жанок якасцей, якія ўпрыгожваюць жанчыну — іначай кажучы, робяць яе прыстойнейшаю. А жаночай прыстойнасці спрыяюць не золата, не пурпур і не смарагды, а пабожнасць, памяркоўнасць і цнатлівасць. Аднак сёння замест спаборніцтва ў вартасцях ладзяць высцігі ў раскошы і бессэнсоўных аздобах. Ад жанчын лёгкіх паводзінаў не толькі не адварочваюцца, а наадварот — падчас фэстаў і баляванняў пралюбадзейкі і ўдовы, што апаганілі сябе юрлівасцю і распустай, ахвотна запрашаюцца за сталы. Цэніцца толькі багацце. Цнатліваю лічаць і тую жанчыну, якая ганарліва імчыць у мнагаконнай калясніцы ці выходзіць на шпацыр у строях, вышываных золатам, пурпурам і перламі, каб выставіць сябе на ўсіх вуліцах і вулічных скрыжаваннях.

Раскоша стала прычынай і шмат якіх іншых заганаў, надта ўласцівых сённяшнім нашым жанчынам. Яны не могуць доўга ўседзець у сценах свайго дома, а бегаюць адна да адной, каб памянціць за трапезным сталом языкамі, а іншы раз і, куляючы навыперадкі вялікія келіхі хмельнага, спазнаць полымя любоўнай жарсці. Такія вылазкі не да твару прыстойным жанчынам. Пра гэта сведчыць і зробленая Фідыем статуя Венеры, ля чыіх ног прымасцілася чарапаха. Фідый намякае гэтым, што жанчыне больш пасуе быць нешматслоўнай і бавіць час дома. А Плутарх піша, што ў егіпцян нявестам, каб яны не выходзілі з дому, не дазвалялася нават насіць сандалі.

У свой час Цыцэрон, разважаючы аб сквапнасці і раскошы, вельмі трапна сказаў: «Калі хочаце пазбавіцца ад сквапнасці, вам трэба пазбавіцца ад яе маці — раскошы». Маральныя заганы і вычварныя звычкі жанчын, якія немінуча вядуць да яшчэ горшага, можна выправіць, забараніўшы раскошу, бо менавіта раскоша служыць той цэрай, якая распальвае разбэшчанасць. Калі раскошу не трымаць у цуглях законаў, жанчыны не толькі прамантачаць маёмасць сваіх бацькоў, дзядоў і іншых продкаў, а давядуць да пагібелі ўвогуле ўсё грамадства. Раскоша дасягнула ўжо такіх памераў, што здаецца, вярнуўся той век, калі Праперцый, апісваючы жанчын, пісаў так:

Столькі ўжо ўбранства на ёй, што патомкам яшчэ дасталося б,
Свой сараматны трафей важна нясе міма нас.
Меры не знае, зноў просіць абноваў, а муж калі раптам
Будзе марудзіць, дык ёй мусіць урон аплаціць.

Калі Катон, як піша Лівій, прапаноўваў не адмяняць закона аб абмежаванні раскошы, то ён аргументаваў гэта так: «Рымляне, няўжо вы хочаце навязаць вашым жанчынам суперніцтва, у якім багатыя жонкі захочуць мець тое, чаго не здолее мець ніводная іншая, а бедныя будуць надрываць жылы, каб хоць неяк унікнуць пагарды. У выніку дойдзе, што жанчына пачне саромецца таго, чаго саромецца не трэба, і не будзе саромецца таго, чаго не саромецца нельга. Хай купляе тое, што можа купіць за свае грошы. А калі грошай бракуе, хай звяртаецца да мужа. Праўда, угаварыць мужа не заўсёды можна. Аднак я лічу нікчэмным таго, хто бачыць, як нехта чужы дае яго жонцы тое, чаго не даў ён сам. Але паспрабуйце адпусціць цуглі слабавольным неўтаймаваным жывёлінам і пачакайце. Тады кабеты ўжо самі, без вас пачнуць утаймоўваць свае прыхамаці».

Каб запабегчы гэтай загане і не запляміць прыгожага імя свабоды, дзяржава павінна стварыць законы, якія перакрыюць усе крыніцы сілкавання злашчаснай раскошы і ўрэшце ліквідуюць яе.

# Раздзел XIV

## Няправільнае ўжыванне законаў моцна шкодзіць свабодзе

Ніхто, бадай, не будзе аспрэчваць, што законы забяспечваюць цэласць і непарушнасць грамадзянскай свабоды і ствараюць умовы для агульнага дабрабыту, пры якіх кожны адчувае сябе абароненым ад ліхадзейства. Але нярэдка бывае, што і пасля законна вынесенага прысуду многія лічаць сябе пакрыўджанымі і пакаранымі беспадстаўна. Таму, каб законы, па сваёй сутнасці прызначаныя служыць апорай свабоды, не ўспрымаліся як інструмент крыўды і ліха, пры іх ужыванні трэба праяўляць вялікую асцярожнасць. Але нішто не можа служыць падставай, каб ганіць законы, заснаваныя на дабры і справядлівасці. Прычына таго, што законы, прызначаныя бараніць невінаватага, нясуць яму разарэнне і гібель, палягае, галоўным чынам, у зламыснасці або невуцтве суддзяў.

Многія знакамітыя філосафы дасціпна адзначалі, што амаль кожны закон мае хоць нейкую недасканаласць. Пры вялікай разнастайнасці чалавечай дзейнасці і ўсемагчымых яе абставінах ніводзін закон не можа быць бездакорным настолькі, каб не вымагаць ці настойліва не патрабаваць пэўнага свайго абмежавання. Часам суддзі, называючы сябе строгімі выканаўцамі пісанага закона ці проста па недасведчанасці, аказваюцца няздольнымі вызначыць, што ў той ці іншай справе найбольш адпавядае справядлівасці. І тады законы, закліканыя абараняць сумленнасць, робяцца небяспечнымі якраз таму, каму не павінны шкодзіць. Нездарма ў народзе з даўніх часоў ходзіць вядомая прымаўка: «Найвышэйшы закон — найвышэйшая несправядлівасць». Гэтая прымаўка, якая ўзнікла з жыцця, стала вынікам памылак і махлярства суддзяў. Бо калі суддзя ў разгляданай

справе не бярэ пад увагу асобу падсуднага і не ўлічвае іншыя акалічнасці, ён аказваецца не слугой правасуддзя, а служкай судзілішча, злоўжываючы аўтарытэтам законаў і чынячы несправядлівасць.

У свой час Арыстотэль сказаў, што права само па сабе ёсць дабро. Але разам з тым зазначыў, што дабро і справядлівасць — сутнасці болей высокія, чым права. Добрым Арыстотэль называў таго, хто ў дачыненні да правапарушальніка выступае не проста як строгі суддзя, а здольны адысці ад пэўнай прававой нормы, хоць закон пры гэтым для яго застаецца законам. Філосаф так выказваецца не дзеля таго, каб ва ўсякім судовым працэсе адвесці суддзю ад прававой нормы і дазволіць яму вырашаць справу, як уздумаецца. Ён мае на ўвазе магчымасць удасканальваць закон, калі гэтага патрабуе справядлівасць. Закон абагульняе з'явы рэчаіснасці і не знае выключэнняў. Таму ён не можа і не здольны ўлічыць усе адмысловыя акалічнасці, хоць патрэба ў такіх адрозненнях узнікае. Артыкулы закона ўказваюць на звычайныя, звыклыя падзеі, не закранаючы спецыфіку асобных з'яваў і здарэнняў. І тым не менш такі прававы акт застаецца законам, бо ў сваёй недакладнасці вінаваты не ён і не заканадаўцы, а тыя ці іншыя асаблівасці канкрэтных індывідаў. Закон мае справу з тыповымі акалічнасцямі. Але нярэдка асобныя з іх маюць такія атрыбуты, якія могуць нават пярэчыць агульнай канцэпцыі выпадку. Адсюль, зусім дапушчальна ўносіць папраўкі ў тую частку закона, дзе заканадаўца нешта апусціў, або ў чым-небудзь памыліўся, або што-небудзь занадта абагуліў. Дый сам заканадаўца, калі б ён прысутнічаў, параіў бы зрабіць тое ж самае. А ведаў бы ён пра гэтыя абставіны раней, то ўдасканаліў бы і юрыдычныя нормы. Закон гаворыць агульна, прытым толькі пра некаторыя выпадкі будзённага побыту. А калі нешта не адпавядае тыповаму паняццю і мае сваю асаблівасць, тут суддзя мусіць паразважаць, што зрабіў бы заканадавец, калі б

пісаў дадзены артыкул кодэкса, і адпаведна змякчыць суровасць закона. Але пры наяўнасці акалічнасцяў, на якія закон указвае канкрэтна, суддзя не мае права адыходзіць ад нарматыўнага акта. Падобны адыход ёсць найвялікшае злачынства.

Змякчэнне санкцый нарматыўна-прававога акта на аснове справядлівасці магчымае толькі тады, калі справа мае нейкую спецыфіку, абумоўленую асобай чалавека, а таксама акалічнасцямі часу, месца ды іншымі абставінамі. З гэтым пагадзіўся б і заканадаўца. Вось прыклад. Пры пакаранні зладзеяў многія народы ўжываюць закон, які патрабуе пазбаўляць такіх злачынцаў жыцця праз павешанне. Закон агульна гаворыць пра ўсіх, хто зламысна ўчыняе крадзеж. А калі цішком сцягнуць нейкую невялікую пажыву чалавека змушаюць беднасць і голад, ці ж у гэтым выпадку пакаранне не трэба зменшыць? Ці можна пазбаўляць жыцця небараку, які здзейсніў менш цяжкае злачынства, чым заняты крымінальнік? Але ўявім, што праўнік будзе трымацца літары закона і пакарае такога правапарушальніка смерцю. У такім выпадку будуць усе падставы сказаць, што суддзя не разумее сутнасці дабра і справядлівасці, а таму хутчэй парушыў закон, чым выканаў належным чынам усе яго патрабаванні.

Бадай, ніводзін закон не можа быць бездакорны цалкам. Час безупынку спараджае штосьці новае і патрабуе ўносіць у закон разумныя ўдакладненні. Рабіць іх павінны толькі разважныя добразычлівыя мужы. Але і ў гэтым выпадку не трэба думаць, што некалі знойдзецца такі дасціпны і пранікліві розум, які здолее ахапіць усе шматлікія, амаль бясконцыя жыццёвыя казусы нейкай нормай закона. Гуманная і мудрая ўлада мусіць разважна прыкладаць закон, як тую цяслярскую лінейку, да неаднолькавых рэчаў. Прыгадаем тут словы, прамоўленыя аднойчы Тэрэнціем: «Мне няма патрэбы рабіць усё ў адпаведнасці з маім правам». Слушна кажа пра гэта і Цыцэрон у трэцяй кнізе «Аб законах»: «Улада — гэта закон, які гаворыць. А закон — гэта нямая ўлада,

гэта — справядлівасць, якая не мае душы; гэта — усеагульнае прадпісанне». Па прычыне разнастайнасці рэчаў закон не можа вызначыць усё. Улада ж ёсць адушаўлёны закон. Узброеная слушнымі меркаваннямі розуму, яна інтэрпрэтуе няяснасці закона, ліквідуе двухсэнсоўнасць, радавое паняцце зводзіць да відавых, аналізуе ўважліва асобныя акалічнасці здарэнняў. Недарэмна некаторыя мудрыя філосафы хочуць, каб закон быў не жалезным, а свінцовым.

Дзеянні чалавека адбываюцца ў самых розных абставінах. Іх немагчыма ахапіць адной і той самай нормай закона. Таму суддзя пры разумным асэнсаванні справы павінен заўсёды кіравацца прынцыпамі дабра і справядлівасці, не пераступаць межы правасуддзя і праз гэта апошняе не ператвараць найвышэйшы закон у найвышэйшую несправядлівасць. Так вучаць знакамітыя філосафы, так вучыць Платон. Паводле Платонавага вучэння, «закон, хоць і ўтрымлівае ў сабе ўсё самае лепшае, самае справядлівае, але не можа заўсёды дзейнічаць належным чынам». Разнастайнасць чалавечых дзеянняў, нестабільнасць чалавечага жыцця, шматлікія асаблівасці рэчаў з'яўляюцца прычынай таго, што ніводная навука не можа ўстанавіць нешта простае, універсальнае, прыдатнае для ўсяго і ва ўсякі час. Так і заканадавец не можа прадбачыць дабро для кожнага, калі жадае тварыць дабро для ўсіх. Як паясняе Арыстотэль у першым раздзеле другой кнігі «Вялікая этыка», заканадаўца не мае магчымасці вызначыць рэч з усёю дакладнасцю, а гаворыць пра яе толькі наогул. Справядлівы ж суддзя канкрэтызуе прававую норму і выбірае тое, што стваральнік закона хацеў бы абазначыць, але не здолеў. Справядлівасць, якую грэкі называюць *epieikeia*, не парушае закона, а тлумачыць яго і ўдасканальвае. Удасканальванне, аднак, павінна ўжывацца толькі там, дзе шаля дабра і справядлівасці пераважвае артыкул закона. Пры гэтым неабходна ўважліва прааналізаваць час, месца, асобу чалавека.

Святое пісанне дае нам прыклады такой дабрыні і памяркоўнасці. Вядома, што Божы закон патрабуе, каб вінаваты ў забойстве расплачваўся галавой. Паводле гэтага закону забойцаў каралі смерцю. Але некалі сам Гасподзь Бог загадаў Майсею выбраць гарады, якія служылі б прыстанішчам для злачынцаў, што ўчынілі забойства не наўмысна, а па неасцярожнасці. Нямала падобных прыкладаў і ў творах паганскіх пісьменнікаў. Усе яны сведчаць, што многія судовыя справы вырашаюцца на аснове гуманнасці. Сапраўднае права, ці, па словах Цыцэрона, сапраўднае правасуддзе, нярэдка дзейсніцца не ў межах закона, а ў межах дабра і справядлівасці. У сваім выступленні ў абарону Цэцыны ён рэзка крытыкуе акуратыстаў, якія прытрымліваюцца літары закона і не ўлічваюць думкі, намеру і волі заканадаўцаў, што напісалі закон.

Правільна вырашаюць справу не акуратызм, не кручкатворства, не мудрагелісты і заблытаны закон, а дабро і справядлівасць. Кіравацца толькі напісаным — значыць скажаць ісціну. Разважны суддзя абараняе задуму і волю заканадаўцы. Такую справядлівасць, або *epikeian*, Юстыніян называе мудрасцю ўладароў. Гэтая мудрасць хаваецца ў сэрцах людзей і вызначаецца на падставе чалавечых учынкаў. Закон не можа даць яе дакладнага апісання. І не ўсякі чалавек можа яе спасцігнуць, тым не менш гэтая мудрасць ёсць стрыжнем усякага права. Платон у сувязі з гэтым кажа, што пазбыцца зла ў грамадстве можна толькі пры наступных умовах: альбо кіраванне дзяржавай у свае рукі возьмуць людзі, узброеныя правільнай філасофіяй, альбо дзяржаўныя мужы па нейкім боскім натхненні зробяцца філосафамі. Бо толькі такая філасофія вучыць кіраванню дзяржавай. Яна дапамагае пазнаць сутнасць законаў і авалодаць навукай права.

Калі чалавек не валодае такімі ведамі, нельга спадзявацца, што ён зможа чыніць справядлівы суд ці захоўваць у грамад-

стве ўзаемную згоду. Таму вельмі важна, каб да стырна ўлады дапускаліся асобы, якія валодаюць дакладным, бездакорным веданнем законаў. Калі ж такое немагчыма, то, па меншай меры, у справах правасуддзя дзяржаўныя мужы павінны звяртацца па разумную параду да юрыстаў і ў адпаведнасці з іх прапановамі і заключэннямі ўладжваць і вырашаць усе спрэчкі. У свой час рымскія імператары Аўгуст, Веспасіян, Траян, Гадрыян, Антоній, Аляксандр і іншыя кіравалі імперыяй вельмі добрапрыстойна, бо ў дзяржаўных справах заўсёды карысталіся надзейнай дапамогай юрыстаў. Найбольш эфектыўнай аказваецца ўлада, якая дзейнічае на аснове законаў. Разумна, правільна кіраваць грамадствам можа толькі ўладар, які выдатна арыентуецца ў законах, ведае, чым розняцца права, дабро, справядлівасць. Прававая недасведчанасць нярэдка становіцца прычынай цяжкіх пралікаў, якія наносяць вялікую шкоду людзям. Пра гэта ў дастатковай ступені сведчаць і падзеі сівой мінуўшчыны, і наша сённяшняе жыццё.

Рымскі імператар Манлій надзвычай строга прытрымліваўся літары сваіх эдыктаў і законаў. Ён настолькі ігнараваў прынцып справядлівасці, што ўрэшце гэта ператварылася ў прыказку, якая засталася жыць у пакаленнях. Калі нехта выдаваў жорсткія загады, пазбаўленыя ўсякай гуманнасці, іх называлі «манліевымі ўказамі». Аднойчы Манлію даручылі ўзначаліць войскі ў Лацінскай вайне. Ваяваць трэба было супроць суседзяў, якія па мове, звычаях, узбраенні, арганізацыі войска нічым увогуле не адрозніваліся ад рымлян. Каб унікнуць памылкі, консулы загадалі рымлянам змагацца супроць ворага толькі ў агульных шэрагах. Але сталася так, што Ціта, сына консула Манлія, паслалі ў разведку. Калі выведнік наблізіўся да стану ворага, на яго напаў лацін Гемін Месцый. У сутычцы Ціт забіў нападніка. Тады консул Манлій за непаслушэнства бацькоўскай і консульскай уладзе і парушэнне выдадзенага ім закона загадаў пакараць сына смерцю. Але ж як у двубоі Ціта з Месцыем, так і ў агульнай

бітве небяспека блытаніны, якую хацеў прадухіліць сваім законам Манлій, войску не пагражала. Ворага ўдалося перамагчы. Сын заслугоўваў не пакарання смерцю, а пахвалы і ўзнагароды. Консул аднак выканаў патрабаванне закона. Ён ужыў у дачыненні да сына артыкул, які строга караў воіна, калі той змагаўся па-за межамі агульнага шэрагу. Манлій занадта цвёрда трымаўся знешняй абалонкі закона, не паглыбляючыся ў яго сэнс і значэнне, і таму аказаўся бязлітасным паслугачом строгай дысцыпліны, а не сапраўдным абаронцам справядлівасці.

Нашмат мудрэйшыя былі арэапагіты. У многіх судовых справах яны без вагання ішлі на змякчэнне выраку, калі гэтага патрабавала справядлівасць. Вось адзін са шматлікіх векапомных выпадкаў, якія прыводзіць Валерый Максімус у першым раздзеле сваёй восьмай кнігі. Адна ўраджэнка Смірны забіла мужа і сына, калі даведалася, што яны забілі яе старэйшага сына, народжанага ад першага мужа. Справу перадалі Далабэлле, праконсулу Азіі, а той адаслаў крымінальную справу на судовы разбор і рашэнне арэапагітам у Афіны. Ён не мог вызваліць жанчыну, якая запляміла сябе двума забойствамі. Але не мог і асудзіць яе, бо забойствы былі ёю ўчыненыя ад гора і роспачы. Разгледзеўшы справу, ареапагіты загадалі, каб абвінаваўца і падсудная вярнуліся да суддзяў праз сто гадоў. Ускосна ўхваляючы дзеянні жанчыны, яны знялі з яе абвінавачанне ў злачынстве, паколькі забойства яна ўчыніла ў стане моцнага афекту.

Вось так разумная ўлада, якая ў пэўным сэнсе ўяўляе сабою жывы, адушаўлёны закон, выконвае належную ёй праваахоўную ролю. Яна не ўсюды і не заўсёды прытрымліваецца літары закона, а судзіць у адпаведнасці з яго духам і мэтанакіраванасцю. Усё гэта патрабуе добрага розуму і вялікай жыццёвай практыкі. Арыстотэль недарэмна лічыў судаводства надзвычай складанай справай. Святы Аўгустын у адным з твораў справядліва хваліць Піфагора за тое, што ён выкладаў сваім вучням навуку аб кіра-

ванні грамадствам як заключную дысцыпліну, калі слухачы былі ўжо адукаваныя, мелі рознабаковыя веды і спазналі сутнасць мудрасці і шчасця. Піфагор бачыў, што грамадству ўласціва шмат бурных нягод, і таму хацеў, каб да стырна дзяржаўнага кіравання дапускаўся чалавек, які зможа ўмела ўхіліцца ад усіх скал і рыфаў або, пры неабходнасці, сам зрабіцца скалой, каб супрацьстаяць разлютаванай стыхіі.

А ў нашым грамадстве на пасаду суддзяў і чыноўнікаў прызначаюцца людзі, сярод якіх многія зусім не дасведчаныя ў грамадскіх справах. Гэтыя назначэнцы вучацца судзіць і кіраваць толькі з уласнай практыкі. Выконваючы свае абавязкі, яны вельмі часта знаходзяцца пад уплывам сімпатыяў, антыпатыяў, злосці, сквапнасці і іншых падобных чалавечых заганаў. Калі яны вырашаюць спрэчкі і пішуць дэкрэты, імі кіруюць не закон і справядлівасць, а сляпыя і легкадумныя парыванні.

У нашых судах мала звяртаюць увагі на справядлівасць. Суддзі не лічаць правамерным хоць у нейкай меры адступіцца ад агульнай юрыдычнай нормы нават тады, калі сапраўднае правасуддзе раіць іншае і ясна паказвае на магчымасць адступлення ад літары закона. Яны самі шмат разоў прызнаваліся, што каралі невінаватых і наносілі гэтым вялікую шкоду асудджаным. Але паколькі голас закона знешне прадпісвае пэўную юрыдычную форму, то суддзі заяўляюць, што намераныя і далей трымацца гэтае формы, не зважаючы на магчымасць змякчэння выраку на аснове прынцыпу справядлівасці. Усё гэта адбываецца з прычыны прававога невуцтва. А без прававой адукаванасці нельга спадзявацца, што для грамадзян калі-небудзь настануць дабрабыт і шчасце.

Як кажа вуснамі Ксенафонта Сакрат, было б аблудаю думаць, што без настаўніка немагчыма дасягнуць майстэрства ў нескладаных рамёствах. Але будзе крайняю дурасцю меркаваць, што кожны сам па сабе здольны кіраваць дзяржавай. Караблю

без спрактыкаванага стырнавога ў бушуючым моры пагражае сур'ёзная небяспека. Так і грамадства пры дрэнным кіраванні зазнае найгоршыя злыбеды. Пазбегнуць гэтага можна толькі тады, калі грамадствам будзе кіраваць чалавек, які з'яўляецца мудрым правіцелем, дасведчаным ахоўнікам законаў і разумным іх інтэрпрэтатарам. Платон у «Меноне» зазначае, што справядлівасць захоўвае ў цэласнасці і грамадства, і многае іншае, а несправядлівасць усё разбурае. Аднак ва ўсякім чалавечым грамадстве справядлівасць можа існаваць пры ўмове, што ў ім ёсць законы, створаныя на карысць грамадзян, і што ўладатрымальнікі накіроўваюць гэтыя законы на паспалітае дабро.

# Раздзел XV

## Законы не садзейнічаюць захаванню грамадзянскай свабоды, калі няма ўлады, якая сочыць за іх выкананнем

Ніякае грамадства, ніякая грамадзянская супольнасць, ніякі мір і спакой паміж людзьмі не могуць існаваць без законаў. Ніякі чалавек з нармальным розумам не падумае аспрэчваць, што дабрадзейства свабоды залежыць ад правільнага і ўпарадкаванага заканадаўства. Паводле Плутарха, мэтай законаў ёсць справядлівасць. А справядлівасць патрабуе сумленна жыць, нікому не чыніць шкоды, кожнаму аддаваць тое, што яму належыць па праве, за добрыя справы ўзнагароджваць, а за дрэнныя — караць. Сапраўдную свабоду мае толькі той, хто не баіцца над сабой ніякага гвалту і вядзе спакойнае бяспечнае жыццё, у якім няма месца ліху. Вядома, аднак, разумнае, слушнае выказванне Пампонія, у якім ён сцвярджае, што адно толькі існаванне законаў мала значыць для грамадства, калі ў ім адсутнічае правасуддзе. З гэтай прычыны кожнае грамадства павінна як мага болей прадумана і руплліва паклапаціцца аб стварэнні інстанцыяў нагляду і аховы правапарадку. Яны павінны садзейнічаць выкананню грамадзянамі ўсяго карыснага, што патрабуюць справядлівыя законы, і стрымліваць асоб, ахвочых да правапарушэнняў, пагрозай магчымага пакарання.

Красамоўна выказваецца наконт закона Дэмасфен: «Нельга чакаць, што законы прыбягуць самі і сваёю прысутнасцю дапамогуць несправядліва пакрыўджанаму, які просіць заступніцтва. Яны складаюцца з літар і ёсць, па сутнасці, усяго толькі пісьмовымі знакамі. Законы робяцца дзейснымі, калі вы, суддзі, пацвердзіце іх і пакажаце, што яны заўсёды абараняюць таго, хто мае ў гэтым патрэбу. Вось так законы набіраюць моц праз вас, а вы мацнееце праз моцныя законы».

Такога ж меркавання трымаліся і ўсе знакамітыя філосафы. Платон у шостай кнізе «Законаў» гаворыць, што мала карысці ад добрых законаў там, дзе няма добрай улады, якая магла б ахоўваць і здзяйсняць іх. Ахоўнікі і здзяйсняльнікі законаў павінны мець вострае вока, ведаць сапраўдны стан рэчаў і праяўляць мудрасць у вырашэнні справаў, каб праз памылку ці невуцтва не нанесці грамадзянам вялікай шкоды і цяжкай страты. Падчас моцнага шторму на моры неспрактыкаваны стырнік або перакуліць карабель, або разаб'е судна аб скалы. Так і галоўны ахоўнік дзяржавы і законаў кіне грамадства ў бездань цяжкіх бедстваў, калі не валодае мудрасцю суцішаць хваляванні і ўтаймоўваць смуты і не скіроўвае ўсе свае памкненні і думкі на забеспячэнне дабрабыту грамадзянаў.

З мудрасцю суседзіць дабрачыннасць. У спалучэнні з мудрасцю дабрачыннасць заўсёды захоўвае грамадства цэлым, здаровым і непарушным. Існуе шмат відаў дабрачыннасці, якімі павінна вызначацца ўлада. Але справядлівасць і цвёрдая воля з'яўляюцца тут галоўнымі чыннікамі. Без іх немагчыма правільнае рашэнне справы. Яны ёсць вартасці, без якіх службовая асоба не можа адпавядаць свайму званню і пасадзе. Само слова «справядлівы» абазначае таго, хто судзіць і выносіць рашэнне на аснове справядлівасці і ў адпаведнасці з законам. Калі ж суддзя адыходзіць ад справядлівай законнасці, то ён не варты свайго наймення. Нездарма Арыстотэль называе суддзю адушаўлёным законам. У сугучнасці з ім Цыцэрон лічыць, што ўлада — гэта закон, які гаворыць уголас, а закон — гэта нямая ўлада.

Цвёрдасць волі азначае здольнасць асобы не паддавацца ніякім мальбам і просьбам, ніякім запалохванням і пагрозам мацнейшых, якія хацелі б перашкодзіць законнаму правасуддзю. У сваёй прамове «У абарону Сестыя» Цыцэрон раіць усім, хто пры ўладзе, засяроджваць свае намаганні на прымнажэнні паспалітых выгодаў. Нярэдка здараецца, што суддзя мусіць

цярпець у імя грамадства беды, весці вайну і варагаваць з многімі нахабнікамі і нягоднікамі, а часам і з тымі, хто мае сілу.

Старадаўнія мысліцелі калісьці казалі, што ўсім судам уласцівыя чатыры галоўныя заганы, а менавіта любоў, нянавісць, подкуп і страх. Справядлівасць у спалучэнні з цвёрдасцю волі робіць чалавека трывалым, узбройвае яго разнастайнымі сродкамі абароны, і ён аказваецца здольным адбіць лавіну гэтых ліхтугаў. Вось чаму кожны, хто зычыць грамадству дабра і шчасця, павінен заўсёды як мага руплівей дбаць, каб суддзямі працавалі людзі высокіх маральных якасцяў, поўныя рашучасці ні на ёту не адыходзіць ад законнасці і справядлівасці і не браць пад увагу магчымасць атрымаць узнагароду ці ўзбіцца ў чыюнебудзь прыхільнасць.

Вялікай пахвалы за свабодалюбства заслугоўвае шляхта нашага народа. Яна мае права выбіраць суддзяў свабодна, гэта значыць па сваім уласным жаданні, без чужой ласкі і волі. З вялікага мноства народу не так ужо цяжка выбраць чалавека, які вызначаецца розумам, дабрадзейнасцю, вераю і руліцца найперш не пра свае выгоды, а пра дабрабыт грамадзян усёй краіны. Пажадаць можна хіба толькі больш прыстойнай, зладжанай арганізацыі выбараў, каб пазбавіць іх усякай мітусні і неразбярыхі. Бо пакуль што абранне адбываецца выкрыкамі з натоўпу. Сярод рознагалосых меркаванняў і пажаданняў немагчыма выбраць нешта пэўнае і дакладнае. І часцяком здараецца, што ўсё вырашае тлумнае зборышча, а не разумныя, дасведчаныя мужы Уладу атрымліваюць людзі, якія гэтага не заслугоўваюць. А тым часам асоб вартых увагай звычайна абдзяляюць.

У грамадстве вэнэтаў, напрыклад, захавалася вельмі карысная практыка, якая дазваляе ўнікнуць такога бязладдзя. Хоць выбары органаў улады там ёсць прывілеем знаці, але ўдзельнічае ў іх не ўсё бясконцае мноства нобіляў, а толькі іх абмежаваная колькасць. Падчас каміцыяў, калі паўналетнія нобілі збіраюцца

на выбары ў магістрат, у цэнтры выбарнікаў ставяць урны са срэбнымі шарыкамі ўперамешку з нешматлікімі залатымі. Колькасць усіх шарыкаў адпавядае колькасці прысутных. Кожны мае права выцягнуць адзін шарык. Калі нобіль выцягвае срэбны шарык, ён пазбаўляецца вотуму, страчвае права голасу і выпадае. Галасаваць можа толькі той, каму пашанцуе выцягнуць залаты шарык. Такім чынам атрымліваецца, што кожны мае права аказацца пры ўладзе, але непасрэдна ўдзельнічаць у дзяржаўных справах могуць нямногія. І ўсё гэта адбываецца без усякага тлуму і буйства. Калі б і мы выбіралі ўладу і прымалі ўставы так, як гэта адбываецца ў славутым Венецыянскім грамадстве, дык не марнавалі б столькі часу на нашых соймах і намнога дзейней спраўляліся б з бясконцаю плынню спраў.

Але якім бы спосабам ні выбіралі вярхоўных асоб судовай улады, усё адно — з прычыны вялікай заганнасці чалавечага роду выбраць суддзю ва ўсіх адносінах дасканалага і заўжды бездакорнага немагчыма. У галовах людзей тоіцца шмат аблудаў і забабонаў. І забабоны гэтыя, тлумячы чалавеку розум, збіваюць з тропу і перашкаджаюць убачыць ісціну. Дзеля магчымасці скасаваць памылку, дапушчаную недасведчанымі ці занадта строгімі суддзямі, у нас з нечай разумнай ініцыятывы выдадзеныя законы, згодна з якімі незадаволены судовым рашэннем можа падаць апеляцыю ў вышэйшую інстанцыю. Ніхто не павінен цярпець урон і пакуты ад прысуду цвердалобага ці падкупленага суддзі. Апеляцыйная практыка прысутнічае і ў іншых грамадствах, якія даражаць грамадзянскай свабодай.

Ажыццяўленне паспалітага правасуддзя без ніякага двурушніцтва, на аснове закона з'яўляецца вельмі істотным для грамадзянскай свабоды. І няма больш дзейснага сродку адмены несправядлівых прысудаў, чым прыпыненне юрысдыкцыі ніжэйшага суддзі праз апеляцыю да вышэйшага. Паколькі ж у розных народаў у якасці вышэйшых інстанцый выкарыстоўваюцца

розныя інстытуцыі, будзе дарэчы прыгадаць, што робіцца ў гэтай галіне ў іншых грамадствах, і шляхам параўнання выбраць найбольш прыдатнае для нас.

У нашай краіне апеляцыі з усіх судоў ідуць у Трыбунал самога караля, і бясконцыя цяжбы вырашае адзін чалавек. Ці гэта нармальна? У народзе такую апеляцыю называюць стогадовай адтэрміноўкай прававога рашэння. Судовыя справы, пачатыя яшчэ нашымі продкамі, ператварыліся ўжо ў хадзячыя прымаўкі. Яны застаюцца нявырашанымі дагэтуль, і невядома, ці будуць закончаныя хоць калі-небудзь. Не трэба, аднак, думаць, што прычына тут у нядобразычлівасці або марудлівасці караля. Нават калі б кароль, знаёмячыся з апеляцыямі, быў такі старанны і руплівы, што спаў бы не больш, чым патрабуецца для здароўя, і не дазваляў бы адрываць сябе ад працы на розныя прыемныя ўцехі, дык і тады яму аднаму немагчыма было б асіліць усю процьму дасланых справаў. Нават калі б ён працаваў не пакладаючы рук, шчыраваў безупынку аж да сёмага поту, усё роўна не змог бы адзін адолець бясконцую лавіну разнастайных справаў і ўладзіць агромністае мноства ўсялякіх спрэчак.

Пра гэта сведчыць і прыклад славутага правадыра ізраільскага народа Майсея. Ён з такою гарлівасцю і самаадданасцю аддаваўся вырашэнню спрэчак і разнастайных судовых справаў, што цэлы дзень толькі тым і займаўся. Потым, аднак, зразумеў, што яму не пад сілу такая непад'ёмная ноша. Параіўшыся з цесцем Ёрам, ён выбраў з народа вялікую колькасць людзей, якія вызначаліся жыццёвым досведам, разважнасцю і богабаязнасцю. Яны ўзвалілі на свае плечы ўвесь цяжар апеляцыяў. Майсею перадавалі толькі найбольш сур'ёзныя справы.

Вярхоўны ўладар у грамадстве мае ўдосталь і іншых клопатаў. Гэта і захаванне цэласнасці рэлігіі і непадкупнасці судоў; гэта і стварэнне дзейснай улады, здольнай абараніць краіну ад знешняй пагрозы; гэта і пабудова замкаў і крэпасцяў, забеспячэнне іх

на выпадак вайны зброяй, амуніцыяй, правіянтам, грашыма. Для апеляцыйных справаў павінны назначацца нешматлікія чыноўнікі, якія, падзяліўшы паміж сабой абавязкі, змогуць разгледзець і давесці да ладу тое, што адзіночку зрабіць вельмі складана. Але мы сёння хочам, каб пра ўсё дбаў адзін чалавек. У выніку, нідзе нічога не робіцца. Вялізная глыба справаў, пазбаўленая апірышча, пачынае ўрэшце хістацца, а потым рушыцца ў бездань. Закон, як бачым, не забяспечвае грамадзянам міру й спакою. І адбываецца так таму, што расчараваныя скаржнікі, страціўшы ўсякую надзею на судовае рашэнне спрэчак, лічаць за лепшае самім пакараць крыўдзіцеля, чым цярпець ад яго шкоду. Калі чалавеку нанеслі цялеснае пашкоджанне або прычынілі ўрон ягонай маёмасці, сёння лічыцца ледзь не нармальным брацца за зброю замест таго, каб звяртацца да закона, які без улады ўсё адно не мае ніякай сілы. Мне сорамна згадваць шматлікія забойствы апошніх гадоў і пералічваць вялікую колькасць разрабаваных вёсак і замкаў. Усё гэта чынілі, у тым ліку, і тыя пакрыўджаныя, хто, страціўшы апошнюю надзею на закон і справядлівасць, рашылі дабівацца праўды з дапамогай зброі. Залішне называць імёны знатных людзей, якія патрацілі ўсё багацце на бясконцыя спрэчкі ў судах і дажываюць жыццё ў беднасці і нястачы. Гэтае ліха спасцігла, мусіць, ужо большую частку нашых грамадзянаў і безупынна душыць іх цяжкім рабскім прыгнётам.

Нашае жаданне славіцца сваёю свабодай будзе марным, пакуль мудрэйшыя прадстаўнікі нашай знаці дзякуючы сваёй разважнасці не знішчаць гэтае зло цалкам. Прычым я не думаю, што на пошук лекавых сродкаў спатрэбяцца нейкія празмерныя намаганні. Слаўныя хрысціянскія грамадствы даюць нам найвыдатнейшыя ўзоры арганізацыі сваіх судоў. Праўда, пераняць гэтыя ўзоры цалкам нашаму народу не дазваляць празмерная колькасць судовых справаў і пэўныя іншыя перашкоды. Але ж унёсшы нязначныя змены, мы маглі б пабудаваць форму

судовага працэсу, якая мала чым адрознівалася б ад прапанаваных мадэляў. Прыклад, варты пераймання, дае нам славутая Парыжская курыя парламента Францыі. Яна мае назначаных суддзяў, якія працуюць у ёй пастаянна, рашаючы ўсе судовыя справы, што накіроўваюцца ім у парадку апеляцыі. У належнай паслядоўнасці яны засядаюць у трох палатах. У першую палату прызначаюцца трыццаць суддзяў з чатырма старшынямі. Яны выслухоўваюць спрэчкі бакоў, накіроўваюць дасланыя апеляцыі іншым суддзям, вызначаюць тэрміны судовага разбору справаў, прычым менш складаныя разбіраюць і вырашаюць самі. Другая і трэцяя палаты налічваюць па восемдзесят суддзяў з чатырма старшынямі ў кожнай палаце. Усе яны суддзі высокай кваліфікацыі і аналізуюць справы надзвычай уважліва. Пасля адпаведнага рашэння або выраку трэцяя палата назначае бакам дзень абвяшчэння прысуду. Французы называюць такі прысуд *arrestum*, ці то канчатковым вердыктам, які не падлягае абскарджанню. Той, каго суддзі прызнаюць вінаватым, павінен выплаціць курыям шэсцьдзесят турынскіх ліўраў. Калі чалавек лічыць, што ягоную справу зразумелі няправільна ці прааналізавалі недастаткова, ён мае права накіраваць матэрыял зноў у суд. Але папярэдне мусіць заплаціць суддзям падвойную грашовую суму.

У чацвёртай палаце суддзяў шэсць. Гэта так званыя Дварцовыя міністры. Яны прымаюць да разгляду справы асоб, падначаленых каралю, або тых, хто мае пэўныя прывілеі і на іх не распаўсюджваецца юрысдыкцыя іншых курыяў. Гэтыя асобы могуць дасылаць апеляцыю ў Парламент. Справа перадаецца ў Сенат, калі выявіцца, што яна закранае інтарэсы ўсяго грамадства або з'яўляецца складанай ці важнай і патрабуе скрупулёзнага аналізу. Усе пастановы згаданых інстанцыяў выконваюцца няўхільна. У парламенце ёсць асэсары, або памочнікі суддзяў. Іх называюць яшчэ пэрамі Францыі. Усяго пэраў дванаццаць. Назначаюцца яны з найвышэйшай эліты: шасцёра — духоўнага

стану, шасцёра — свецкага. Прысутнічаючы на пасяджэннях, яны сядзяць першымі пасля старшыняў, з якімі абмяркоўваюць справы, падсудныя пэрам і каралю. Праўда, цяпер аўтарытэт пэраў з вядомых прычынаў паменшыўся. Вось так выглядае працэс разгляду апеляцыйных справаў у французскім правасуддзі.

Гішпанцы маюць амаль такія самыя інстытуцыі. У Гішпаніі дзейнічаюць юрыдычныя Канвенты, з якіх асабліва вылучаюцца два: Вальядалідскі і Гранадскі. У кожны з гэтых Канвентаў выбіраюцца па семнаццаць слухачоў, або суддзяў, глыбока абазнаных у юрыспрудэнцыі. Суддзі, раздзеленыя на чатыры класы, вырашаюць усе грамадзянскія справы, прымаюць да разгляду апеляцыі, пацвярджаюць рашэнні іншых суддзяў альбо ўносяць у іх пэўныя карэктывы. Апеляцыя на вердыкт суддзяў Канвента не дапускаецца, аднак падача просьбы ў Канвент дазваляецца.

Вывучаючы юрыдычныя інстытуцыі двух гэтых славутых хрысціянскіх грамадстваў, мы, змушаныя да гэтага крайняю неабходнасцю, маглі б таксама стварыць нейкую падобную форму судовае працэдуры, якая адпавядала б звычаям нашага народа. Але ж пакуль нашы грамадзяне ўсіх станаў, распачаўшы судовую цяжбу і змардаваўшы сябе разнастайнымі выдаткамі, пачынаюць лютаваць і забіваць адзін аднаго ў міжсобных бойках і звадах. Гэтае вялікае няшчасце настойліва патрабуе як мага хутчэйшага лекавання. Не трэба слухаць легкадумаў, якія хочуць узваліць увесь цяжар лекавання на караля, быццам на нейкага Атланта, які павінен трымаць неба. Само жыццё паказвае, што адзін чалавек не здольны справіцца з агромністаю лавінай апеляцыяў. Пра тое ж сведчаць і ўмудроныя багатым вопытам слаўныя старажытныя грамадствы. У іх заўсёды лічылася, што манарх не можа асіліць такую ношу. Дык не будзем пагарджаць мудрымі парадамі старажытных законнікаў, а скарыстаемся з іх цудоўных узораў вядзення судовых справаў.

Паколькі вярхоўны ўладар не здольны разгледзець вялікае

мноства апеляцыяў, трэба, каб за дзяржаўны кошт выкананне гэтых абавязкаў было альбо ўскладзенае на кожнай канкрэтнай тэрыторыі на суддзяў, або каб у асобных княствах былі створаныя галоўныя кансісторыі, у склад якіх увайшлі б некалькі юрыстаў і столькі ж прадстаўнікоў шляхты, а таксама ваявода ці кашталян у якасці старшыні. Яны будуць знаёміцца з апеляцыйнымі справамі і сумесна выносіць рашэнне па скаргах бакоў. Ёсць яшчэ Калегіумы так званых канонікаў. Але мне думаецца, што каноніkі не надта падыходзяць на гэту важную дзяржаўную пасаду.

Створаныя ўстановы далі б магчымасць і ашчадней траціць дзяржаўныя сродкі, і далучыць нічым не занятых спецыялістаў, глыбока абазнаных у пытаннях Божага і чалавечага права, да пачэснай, так неабходнай грамадству і карыснай дзяржаве дзейнасці. Разам з тым доступ да гэтай пасады будзе закрыты ўсякаму нікчэмнаму трутню, бо складанасць звязаных з ёю абавязкаў патрабуе сапраўднай вучонасці, уласцівай толькі чалавеку выключнай пабожнасці і вялікай эрудыцыі.

Пры вырашэнні апеляцыйных справаў трэба сачыць, каб той, хто хоча ўнікнуць судовых санкцыяў, не злоўжываў выгодамі апеляцыі, створанай выключна дзеля таго, каб пазбегчы магчымай несправядлівасці суддзяў. Як юрыдычны сродак яна прадугледжаная для дапамогі сумленнаму пацярпеламу, а не для патурання свавольніку, які не падпарадкуецца суду. Немэтазгодна дазваляць апеляцыю па справе, акалічнасці якой пераканаўча пацвярджаюцца паказаннямі сведкаў, а таксама іншымі судовымі доказамі. Калі суддзя судзіў справядліва, калі не было ніякага гвалту ці пагрозы ўжывання гвалту, пададзеная апеляцыя мусіць лічыцца неабгрунтаванай і беспадстаўнай. Каб запабегчы падачы такіх апеляцыяў, ёсць досыць дзейсны сродак: калі падаўца апеляцыйнай скаргі прайграе справу, ён па рашэнні суда павінен кампенсаваць страты супраціўнаму боку.

Нічога гэтага нашы законы не прадугледжваюць. Адсюль і неймавернае мноства судовых суцяжніцкіх справаў, якія, здаецца, не завершацца ўжо ніколі. Ад такой неразбярыхі невінаваты бок церпіць шкоду і страты. Нельга абмінуць маўчаннем і той адчувальны ўрон, які наносіцца зыскоўцу марудным, зацяжным судаводствам, а таксама дзеяннямі адказчыка, які па даўняй заганнай завядзёнцы ўсяляк перашкаджае зыску. І адно і другое прыводзіць да таго, што зысковец, без перадыху заняты апастылымі ўжо клопатамі і выдаткамі, траціць апошнюю надзею на справядлівасць і вымушаны адмовіцца ад судовай справы. У крымінальным судаводстве, прызначаным для пакарання злачынцаў, усё робіцца хутка: заяву аб узбуджэнні крымінальнай справы можна падаць замкаваму старосту ў любы час. А вось на падачу грамадзянскіх зыскаў, у якіх вырашаюцца спрэчкі паміж людзьмі, прызначаны пэўны тэрмін, бо судовыя слуханні адбываюцца толькі тры разы ў год. Такія пасяджэнні было б нялішнім і карысным для ўсіх праводзіць часцей, каб несправядліва пацярпелы бок не быў вымушаны заставацца пакрыўджаным надта доўга.

Трэба вынішчыць шкодную звычку, калі адвакаты-кручкатворы могуць звесці пададзены зыск на нішто. Яны пільна вызіраюць самыя нязначныя хібы і за нейкае адно прапушчанае ці памылкова напісанае слоўца пазбаўляюць зыскоўца права на зыск. Часта бывае, што праз хітрамудрыя выкрутасы юрыдычных кручкатвораў ці, хутчэй, па недасведчанасці суддзяў, якія дазваляюць нахабнікам здзекавацца з сабе, справы зацягваюцца на доўгі час і не могуць дайсці да суда. Хоць суды і створаныя для хуткай і дзейснай дапамогі пацярпелым, але па нейкай недарэчнай завядзёнцы яны абарочваюцца ў сваю процілегласць. Праз патуранне самавольству настырных прахвостаў суды ператвараюцца ў месца, у якім дапускаецца крывадушная і блытаная інтэрпрэтацыя справаў і чыніцца несправядлівасць.

Калі матывы зыску выкладзены ясна, адказчык не мае права без важкай прычыны ўнікаць судовага працэсу. Гэтаксама і ў крымінальных справах — нельга чакаць, пакуль абвінаваўца ці скаржнік давядуць справу да ведама суда. Здараецца, што яны адсутнічаюць ці чагосьці баяцца, або па іншай прычыне не паведамляюць пра злачынства, куды трэба. Тады суддзя ў парадку выканання свайго службовага абавязку павінен сам праводзіць расследаванне і рабіць здзейсненае злачынства прадметам судовага разбору.

Эсхін мае рацыю, калі кажа, што ад грамадства, якое не валодае сродкамі сілавога ўздзеяння на злачынцаў, няма карысці. І ў такім грамадстве, дзе зламысьнікам за іх ліхадзейства не пагражае адпаведная кара, ніхто не можа сябе лічыць свабодным.

Калі б спалучыць усё сказанае тут з тымі законамі і звычаямі, на якіх ужо грунтуецца свабода нашага народа, мы атрымалі б, напэўна, найлепшае і найшчаслівейшае з грамадстваў. Бо і цяпер няма ніводнага народа на ўсёй зямлі, які мог бы ці наогул адважыўся б супрацьпаставіць сваю свабоду нашай.

# Пра шчаслівае жыццё або найвышэйшыя чалавечыя вартасці

## Дыялог

*Знакамітаму сваёй знатнасцю,*
*дабрачыннасцю, вучонасцю і пабожнасцю*
*дарагому, шаноўнаму сябру і сваяку*
*пану Марціну Букавецкаму*

У жыцці няма нічога прыемнейшага за сяброўскую кампанію. І я, мой слаўны, дарагі Букавецкі, часта журуся, што мы разлучаныя такою адлеглаю даллю і не можам сапернічаць у дружбе й сяброўстве. Падабенства звычак, інтарэсаў мацней яднае тых, хто мілы адзін аднаму сэрцам. Мне думаецца, якім бы салодкім было маё жыццё, калі б я мог часта сустракацца з табою, адчуваць прыемнасць нашае дружбы і адпачываць у душэўных размовах з табою. Мне не аднойчы даводзілася бачыць цябе і размаўляць з табой на важных Соймах Каралеўства. І я, бадай, паспеў зведаць і здольнасці твайго розуму, і тваю вучонасць, і тваю пабожнасць. У нас амаль поўнае супадзенне поглядаў і пачуццяў. Якое было б шчасце ў жыцці, калі б наша першае знаёмства і дружба дапаўняліся частымі сяброўскімі сустрэчамі. У дадатак (а гэта павінна яшчэ больш умацоўваць нашу дружбу) твой бацька, чалавек знатны і прыстойны, шчыра сябраваў са мной, калі мы былі яшчэ хлапчукамі і вучыліся ў аднаго і таго ж настаўніка. З пісьмаў, якія ты прыслаў мне, я таксама даведаўся, што маці твая, найшляхетнейшая жанчына (з ёю лучыць мяне

пэўнае радства), лічыць нас сваякамі. Гэтым яна сцвердзіла вялікі закон дружбы, якая існуе паміж намі.

Але я ўжо казаў, што вялікая адлегласць з яе нялёгкімі шляхамі пазбаўляе нас непасрэднай блізкасці і звычайных сяброўскіх сустрэчаў. Аднак і далеч не можа адняць у нас магчымасці з дапамогаю пісем засведчыць нашу ўзаемную любоў і праз іх пасярэдніцтва весці частыя размовы. Як мне стала вядома, ты цікавішся маімі тэкстамі. Да гэтага, напэўна, спрычынілася больш твая прыхільнасць да мяне, чым мае творы. Што карыснага можа даць вучоным мізэрны, кволы талент, не навучаны амаль ніякім навукам? І ўсё ж я рашыў далучыць да пісьма свой невялічкі твор, які напісаў не так даўно. Але не таму, што лічу сябе здольным даследаваць гэтую праблему дастойным чынам, а проста, каб не парушаць маю звычку нешта пісаць, калі надараецца часіна, свабодная ад штодзённых клопатаў. Мне, які мае за плячыма столькі гадоў і стаіць ужо на схіле жыцця, нічога так не пасуе, як разважаць аб узнёслых, нябесных рэчах і на ўсіх вёслах і ветразях, паколькі наперадзе засталося нямнога шляху, імкнуцца дасягнуць прыстанку найвышэйшага чалавечага спакою і шчасця. Я не сумняваюся, што з дапамогаю міласэрнага Бога і Боскіх павеваў спадарожнага ветру дасягну сваёй мэты.

А ты напаўдарозе. У цябе яшчэ многа маладых сілаў. Збіраючыся пераадольваць бурнае мора сучаснага жыцця, заўсёды май на ўвазе той прычал, які ўратуе цябе ад небяспекі. Жадаю, каб ты з Божай ласкі быў доўга яшчэ побач і разам са мною, каб табе пастаянна шчасціла, каб дапамагаў радзіме і сябрам ва ўсім, што для іх карысна. І няхай тая дабрачыннасць, якую ты праяўляеш да маёй асобы, застанецца і маім блізкім.

Гэты невялічкі твор, які прысвячаю табе, чытай у асяродку нашых сваякоў ці сяброў. Перадай ім мае найлепшыя пажаданні. Хацеў бы таксама, каб да цябе далучыўся наш агульны родзіч, сусед твой, Мацяш Сарэмскі. Хай бы ён толькі паправіўся ад

сваёй цяжкай хваробы. Я вельмі паважаю і люблю гэтага чалавека за яго бездакорны лад жыцця, эрудыцыю, пабожнасць і выключную да мяне прыхільнасць. Хацеў бы таксама выказаць найлепшыя пажаданні адважным магутам Вастрарогам і Краташынскім, ад якіх ты перадаваў мне прывітанне ў сваім нядаўнім лісце. Дай Божа, каб яны сваімі подзвігамі набылі такую славу, якую заслужылі калісьці іхныя продкі. Здароўя ім і сілы. Хай будуць моцнай апорай царквы і дзяржавы.

Усяго добрага табе, мой найдаражэйшы дружа.

Любі мяне, як любіў заўсёды.

Адпраўлена з маёнтка майго Біюцішкі
2-га лютага, 1596 г.

*З любоўю да цябе,*
*Андрэй Волян*

## Суразмоўнікі

*Эвэргет, Філахрэмат, Яўгеній,*
*Філацім, Эўсэбій, Філідон*

ЭЎСЭБІЙ. Выказванне, згодна з якім для чалавека найлепшае — альбо не нарадзіцца зусім, альбо як найхутчэй памерці, спрадвеку вядомае ўсім і паўтаралася ў многіх прамовах і творах. Сэнс гэтага выслоўя мне бачыцца ў тым, што жыццё кожнага чалавека надзвычай благое і няшчаснае: ледзь ён паспявае ўбачыць гэты свет і глынуць першы раз жыццядайнага паветра, як на яго навальваецца ўсякая навалач. І пачынаючы з гэтага моманту на ўсім жыццёвым шляху яго, нібыта ў бушуючым моры, кідаюць і круцяць віхуры будзённых навальніцаў. Чалавека не адпускаюць трывога і страх. Ён носіць у сваім целе безліч хваробаў, якія неўзабаве пускаюць парасткі, набіраюць сілу і пачынаюць грызці яго нутро. І ў такім стане бедалага мусіць гібець у сваім мізэрным, пакутным жыцці, поўным горычы і смутку. А што казаць пра разнастайную небяспеку, якая ўвесь час і адусюль падпільноўвае чалавека і, яшчэ не настаўшы, безупынку даймае і мучыць яго бояззю магчымай бяды, а ўжо спаймаўшы і засіліўшы гаротніка, асуджае на самыя цяжкія пакуты.

Выглядае, што прызначэнне і лёс, наканаваныя чалавеку ў яго жыцці, зводзяцца да таго, каб пастаянна змагацца з хваробамі і страхамі. Калі ж надарыцца нешта радаснае, гэта лепш разглядаць як знак нейкай яшчэ большай будучай злыбеды. Нездарма той малады камедыянт, які даў сябе падмануць фальшывай праяве шчасця і сам віншуе сябе з такою ўдачай, жадае хутчэй памерці, а не застацца жыць, каб нейкая новая скруха не

азмрочыла яго радасці. Гэтак сама і ад смяротных, якія марнеюць у немачах і напасцях, нярэдка можна пачуць, што яны хочуць хутчэй памерці, бо смерць азначае канец усім пакутам і бедам і вызваляе ад усякай болі. Праўда, само паняцце смерці настолькі супярэчыць чалавечай прыродзе, што яе клічуць, бадай, толькі прытворшчыкі. Гэта пацвярджае і наступная прыпавесць.

Стары дзед нёс вязанку галля. Праз нейкі час ён так знямогся, што скінуў ношу долу і ў роспачы пачаў клікаць смерць. А калі тая раптам з'явілася і спытала, чаго ён яе клікаў, стары, стараючыся неяк ад бязносай ухіліцца, сказаў, што клікаў яе, каб дапамагла падняць з зямлі ношу.

Смерць кідае чалавека ў жах. Сярод шматлікіх ліхтугаў, якія чорнаю хмарай вісяць над людзьмі, страх смерці за ўсё мацнейшы. Гэтаму не супярэчыць і факт, што некаторыя вар'яты, а таксама тыя, чыё сумленне точыць незагойная рана, часам накладаюць на сябе рукі. Іх глузды затлумленыя настолькі, што яны спадзяюцца ўсыпіць той страх, які не могуць адолець розумам. Але і рынуўшыся насустрач пагібелі, самагубцы не здольныя цалкам вызваліцца ад жуды і не адчуваць, нават уцякаючы ад пакутаў, дзікага перадсмяротнага жаху. Дый людзі старыя, лядашчыя не маюць асаблівага жадання паміраць. Прыгнечаныя мноствам хваробаў і старэчаю немаччу, дзяды ўсё роўна баяцца смерці, і чым яна бліжэйшая, тым больш іх апаноўвае страх. Хоць няма ніякіх прычынаў, каб больш ці нават менш старацца зберагчы такое жыццё. Бо калі яно згасае, слабнуць і ўсе пачуцці: вочы слепнуць, вушы глухнуць, рукі дрыжаць, а хісткія ногі ледзьве трымаюць хворае цела. Як кажа Эклезіяст, замест хрусткага перамолвання ежы зубамі бачна слабое, ледзь улоўнае комчанне бяззубага рота. Так жуючы, старэча глытае страву вельмі марудна і з вялікаю цяжкасцю. У яго бы падманам адымаюць харчы, і яму пагражае галодная смерць. Апошняя сцэна старэчага жыцця — суцэльныя хваробы й пакуты. Няшчасны, нямоглы, нyздольны пацешыцца

вясёлым ззяннем святла, пазбаўлены ўсіх колішніх сваіх радасцяў, ён гібее амаль у беспрасветнай цемры.

Але і маладосць не засцерагае чалавека ад разнастайных бедаў. Наадварот, самага здаровага чалавека, чые органы пачуццяў служаць яму беззаганна, яна гоніць у пашчу віхураў лёсу, шпурляе на скалы фартуны, кідае на іклы самай страшнае небяспекі. І агорнуты жахам, ён апынаецца ў бушуючым віры чарговай навалы.

Прырода падарыла людзям сон, каб яны, знясіленыя і змардаваныя дзённаю працай, хоць на кароткі час пазбавіліся ўсякай мітрэнгі. Але і ў начным адпачынку чалавеку нярэдка мрояцца жахі. Складаецца ўражанне, што і начны адпачынак даецца смяротным не дзеля таго, каб яны маглі хоць на час унікнуць шматлікіх турботаў, а, бадай, каб узвалілі на сабе новыя. Вечны рупесак, пачварны страх і жудасныя прывіды не пакідаюць чалавека ні днём, ні ноччу. І няма яму ні душэўнага спакою, ні суцішэння. Так што, па-мойму, памыляюцца мудрагелі, якія сцвярджаюць, нібыта ёсць сродак, з дапамогай якога можна ўрэшце здабыць шчаслівае і светлае жыццё. Хіба можа быць шчаслівым гаротнік, якога ўвесь час даймаюць нялёгкі клопат, пастаянная трывога і хворасць? Бадай, справядліва казаў паганскі паэт: да скону і пахавання шчаслівым нельга назваць нікога.

ФІЛІДОН. Але ж стоікі і іх паслядоўнікі, здаецца, адкрылі слушную дарогу да шчаслівага жыцця. Яны кажуць, што ўзброілі чалавека філасофіяй, якая дае магчымасць пазбегчы сумнага і пакутлівага існавання пры ўмове, што кожны прывучыць сябе строга выконваць прадпісанні іхняй навукі.

ЭЎСЭБІЙ. Я знаёмы з іх выдумкамі. Стоікі даводзяць, што галоўнае ў чалавеку — розум. Паводле іх вучэння, найвышэйшае чалавечае шчасце ў здаровым розуме, іначай кажучы — у правільным мысленні і беспамылковых канклюзіях. А што да матэрыяльных і фізічных дабротаў, то гэтым атрыбутам стоікі

раяць вялікага значэння не надаваць. Яны, маўляў, ад чалавека не залежаць і яму непадуладныя. Калі з целам здараецца нешта нядобрае ці нейкая навала нішчыць тваё майно, — не варта бедаваць, падрываючы сэрца душэўнымі перажываннямі. Усё гэта не тваё. А па чужому гору не плачуць.

Розум у такім стане, маўляў, набывае абсалютны спакой і дасягае поўнай апатыі. Апатыю ж стоікі цэняць надзвычай высока. Яны лічаць, што акурат апатыя і ёсць найвышэйшае дабро і сапраўднае чалавечае шчасце.

ФІЛІДОН. А па-мойму, гэта проста прыгожае пустаслоўе, а не правільнае мысленне. Стоікі прапануюць парадоксы, якія не адпавядаюць чалавечай прыродзе і не знаходзяць пацверджання ў чалавечым грамадстве. Сам Бог стварыў чалавека такім, што яго прырода складаецца не толькі з духоўнага, але і з цялеснага. Цела ж не можа быць здаровым, калі яго пазбавіць такіх рэчаў, як ежа, адзенне. У сваю чаргу, і душа з прычыны сваёй цеснай повязі з целам таксама церпіць, калі чалавек пакутуе ад холаду, голаду ці іншых нягодаў. Адмаўляць такое — значыць прыпадобніць чалавека да нейкага цурбана ці каменя, які не адчувае ні пакутаў, ні радасцяў, ні асалодаў. Паўсядзённая рэчаіснасць сведчыць, што з'явы прыемныя прыносяць задавальненне і розуму, а непрыемныя, благія прычыняюць яму расстройства. Таму меркаванне стоікаў бачыцца мне абсурдным. Каб пазбавіць чалавека душэўных узрушэнняў, яны адымаюць у яго здольнасць успрымаць боль. Ды такі стод ужо і не чалавек, а, хутчэй, валун ці бервяно.

На мой погляд, геданісты робяць слушней. Яны не аб'яўляюць вайны прыродзе і не пнуцца адмовіць тое, што прырода адмовіць не дазваляе. Кожны з іх проста стараецца ўнікнуць душэўнай трывогі. Кожны жыве вясёлым шчаслівым жыццём, поўным уцех і прыемных пачуццяў. Напэўна, менавіта гэта меў на ўвазе мудрэц, калі ў Эклезіясце казаў, што сярод мноства

чалавечых памкненняў самым сапраўдным шчасцем для чалавека ёсць магчымасць добра паесці і выпіць, павесяліцца, напамадзіцца, апрануцца ў дарагое адзенне, спачыць у абдымках каханай, словам, шчасце — гэта ўсё, што прыносіць прыемнасць і асалоду. На дасягненне такога шчасця і трэба скіроўваць свае намаганні.

Чалавечая прырода не церпіць болі і праціўіцца ўсякай нястачы. Таму чалавек больш за ўсё любіць уцехі. Яны поўняць яго слодыччу і радасцю жыцця, лагодзяць і песцяць ягонае цела, ствараюць яму добры настрой. Нездарма ж маладзёны (Кн. выслоўяў, 2) бачаць найвышэйшае дабро ва ўцехах. Яны пастаянна падахвочваюць адзін аднаго лавіць усякую мімалётную асалоду, цешыць сваё цела вінам і песціць разнастайнымі пахамі й масцямі. Нікога нельга пазбаўляць прыемных пачуццяў. Кожны павінен пакідаць пасля сябе весялосць. Гэта іх лёс, гэта іх прызначэнне.

ЭЎСЭБІЙ. Але ж мудрэц гаворыць, што гэты голас — голас бязбожнікаў. Асепленыя жывёльнаю жарсцю, яны, бы ашалелыя, імкнуцца яе задаволіць. Ніхто не страшыцца Божага суду, не зважае на веліч закладзенай ім у чалавека прыроды, а безаглядна апускаецца ніжэй за ўсякае быдла. І нічога дзіўнага, калі гэтае быдла, пазбаўленае розуму і агорнутае неўтаймоўным пачуццем, горача прагне цялесных уцехаў.

Але Саламон у Эклезіясце гаворыць не ў прамым сэнсе. Сярод іншых марных чалавечых памкненняў ён пералічвае самыя нізкія чалавечыя вады. Бывае, што чалавек усё жыццё ганяецца за прыемным і, забыўшыся пра блізкі Божы суд, легкадумна аддаецца распусце. Хлопца, які, упіваючыся сваёй маладосцю, прабаўляе ўвесь час у пачуццёвых уцехах, вяселлі і пацешных забавах, прапаведнік папярэджвае, што за ўсё гэта давядзецца адказваць перад Богам. Дый сёння ў час сваіх вакханаліяў чалавек не настолькі страчвае розум, каб не адчуваць дакору

сумлення і не думаць з жахам, што на яго можа абрынуцца Божы гнеў. Сёння нікому не трэба казаць, што следам за мімалётнаю асалодай заўсёды ідзе пакута і вусціш. Брыдкія, занадта вольныя паводзіны азмрочваюць і трывожаць душу. А вось памяркоўная стрыманасць заўсёды дорыць і ахоўвае душэўны спакой.

Жыццё рабоў, якія страцілі свабоду і вымушаныя служыць прыхамаці гаспадароў, вартае жалю. Але хіба не меней няшчасны той, хто трапіў ва ўладу найдзічэйшых уцехаў і стаў ахвярай гэтых сваіх лютых катаў? Чалавек спачатку паддаецца неадольнай спакусе, але потым яго спасцігае суровая кара. Плутарх цалкам слушна кажа, што ўцехі нават шкодныя чалавеку, бо змяншаюць яго трываласць і сілу. А гэта спараджае шматлікія немачы і хваробы, і чалавек ужо ў маладосці пачынае старэць. З меркаваннем Плутарха сугучныя выказванні Цыцэрона, па словах якога распусная маладосць цягне за сабою лядачую старасць. Калі ж хто сцвярджае, што ў пачуццёвых уцехах заключаецца найвышэйшае шчасце, то ён гаворыць голасам не чалавека, а, бадай, жывёлы. На думку Архіта Тарэнцкага, няма большага зла, закладзенага прыродай у чалавека, чым ягоная прага да ўцехаў. Уцехі ёсць вораг розуму і путы развагі. Яны слепяць чалавечую свядомасць і не маюць нічога агульнага з найвышэйшымі каштоўнасцямі. Там, дзе прага да ўцехаў перамагае, усе магчымыя чалавечыя вартасці аказваюцца занядбанымі.

Але на маю думку, прырода тут невінаватая, хоць, напраўду, кожны наш орган станоўча рэагуе на ўсё прыемнае. Галоўная прычына — у злоўжыванні ўласцівасцямі чалавечай натуры. Шмат хто, папускаючы сваім жаданням і жарсцям, не вытрымлівае ўмеркаванасці, якой патрабуе прырода. І тады асалода, прызначаная на ўмацаванне цела, нясе яму гібель. Ёсць рэчы для цела прыемныя і заўжды неабходныя — напрыклад, ежа, адзенне. Без іх чалавек жыць не можа. Але ў іншых ніякай жыццёвай неабходнасці няма. Сярод можна назваць пераяданне,

абжорства, непрабуднае п'янства, любоўную разбэшчанасць. Усё гэта не толькі не садзейнічае ўмацаванню здароўя, падтрыманню і захаванню чалавечай натуры, а наадварот, нясе вялікую шкоду. Тым не менш, людзі не ў меру ласыя на асалоду, пагрузаюць у разнаітых уцехах і стараюцца ўволю насыціцца імі. Яны падманліва лічаць сябе найшчаслівейшымі, хоць напраўду — самыя што ні на ёсць няшчасныя. Няхай жа гэтая аблуда абміне кожнага прыстойнага чалавека. А згаданым вышэй заганам месца, хутчэй, у свінарніку, а не ў чалавечай супольнасці, дзе кожны хоча жыць у згодзе са сваёю прыродай і быць такім чынам шчаслівым.

ФІЛАЦІМ. Я, Эўсэбій, цалкам з табою згодзен і галасую за твае прапазіцыі, як той казаў, абедзвюма рукамі. Па-мойму таксама, людзі, у якіх галоўная мерка ва ўсім — асалода, заслугоўваюць ганьбавання. Салодкія ўцехі, як справядліва адзначае Саламон, нясуць жывому целу пагібель. Урэшце ўсе яны змяняюцца смуткам, бо выклікаюць у чалавека, хутчэй, пачуццё раскаяння, чым прыемны ўспамін.

Мяне вабіць іншае. На маю думку, самы шчаслівы — той чалавек, які, дасканалячы свае вартасці, дасягае вяршынь і заслугоўвае найвышэйшую пашаноту. Яго ўсхваляюць, на яго глядзяць, як на бога, яму пяюць славу і выконваюць ўсе яго настаўленні. Менавіта таму самыя разумныя і таленавітыя, прыносячы сваімі думкамі і ўчынкамі шмат карысці грамадству, тым не менш мэту сваіх высілкаў бачаць у тым, каб здабыць як мага шырэйшую вядомасць свайму імю і ўславіць у вяках сваю смеласць і мужнасць. Цары, імператары, ваяводы, воіны, філосафы, прамоўцы не сядзяць, ганебна склаўшы рукі, і не аддаюцца марнаму летуценню, а імкнуцца да вышынь дабрачыннасці і, ператварыўшыся ў светачаў сярод агульнай цемры, ззяюць нязгасным агнём, застаючыся ў памяці і на вуснах людзей. А сталыя наведнікі корчмаў, прытонаў, прасталюдзіны, занятыя чорнай

работай, і ўсякія іншыя, хто да пашанот не ахвочы, праходзяць незаўважанымі. Само жыццё такіх людзей нагадвае смерць. Іх, нічым не адметных, амаль ніхто і не ведае. Выглядае, быццам яны і не жылі на свеце.

ЭЎСЭБІЙ. Так ужо яно заведзена ў людзей, што не кожны можа рабіць тое, што робіць іншы. У залежнасці ад здольнасцяў і дастатку кожны займаецца сваёй справай. З усяе разнастайнасці людскіх заняткаў чалавек выбірае той, да якога найболей здатны. Але на маю думку, славалюбы вельмі памыляюцца, калі бачаць шчасце ў пашане і так за ёю ганяюцца. Бо нярэдка такія асобы, наадварот, трапляюць у пастку розных заганаў і самі пазбаўляюць сябе свабоды. А свабода павінна быць чалавеку даражэйшая за ўсё. Калі ж ён разам з тым хоча карыстацца і добраю славай, то абавязаны клапаціцца пра дабрабыт грамадства. У вольны час ён не павінен ухіляцца ад спраў, аддаючыся млявасці і бяздзейнасці.

Паўсядзённы вопыт паказвае, што ўсе сферы адміністрацыйнага кіравання звязаныя з вялікімі клопатамі і турботамі. Асабліва многа мітрэнгі маюць тыя, хто па сваіх годнасці й званню стаіць на вышэйшай ступені. Рэзідэнцыя ўладара знаходзіцца ў безупыннай аблозе натоўпу, безліч людзей патрабуюць яго аўдыенцыі. І манарх не можа спасылацца на адсутнасць вольнага часу. Іначай яму давядзецца пачуць тое, што аднойчы пачуў імператар Адрыян, да якога прыйшла з просьбай жанчына. Калі Адрыян сказаў, што ў яго няма часу, то ў адказ атрымаў: «Дык не будзь імператарам». Гэтыя словы прымусілі такі імператара спыніцца і выслухаць жанчыну.

У кіраўніка дзяржавы такая безліч усялякіх справаў, што Дэмасфен у свой час ахарактарызаваў яго становішча такім параўнаннем: «Калі б на ростанях пачыналіся дзве дарогі, з якіх адна вяла б на трон, а другая ў апраметную, то мудрэц абраў бы апошнюю». З гэтым сугучныя і словы аднаго цара, прамоўле-

ныя падчас уручэння яму дыядэмы. Кажуць, што, прыняўшы дыядэму і крыху патрымаўшы яе ў руках, цар сказаў: «О, тканіны ласкут! Калі б хто-небудзь ведаў, колькі трывог, небяспекі й няшчасцяў звязана з гэтым вянцом, то не падняў бы яго, нават калі б той проста ляжаў на зямлі».

Манарх шчаслівы тады, калі яго лічаць дастойным кіраваць дзяржавай, а ён, у сваю чаргу, скіроўвае ўсе свае думкі на паляпшэнне дабрабыту грамадства, а не на сваю карысць. Тыя ж, хто імкнецца толькі да пашанотаў, але не дбае пра ўсеагульнае дабро і не рупіцца пра заможнасць сваіх грамадзянаў (часам нават сабе ва ўрон), — такія шчасця здабыць не змогуць. Такога ўладара немінуча напаткаюць ўсе магчымыя беды: ён сам накліча іх на сваю галаву.

Што можа быць горш за нялюбасць народа і ўсведамленне, што цябе ўсе ненавідзяць, няслявяць і ганяць апошнімі словамі? Бо, вядома ж, свайму ненавісніку людзі жадаюць найгоршага. І таму гэтага чалавека заўсёды мучыць вялікі страх. Ён ведае, што супроць яго плятуцца інтрыгі. Нават калі сапраўднай змовы няма, усё адно надта многія грамадзяне хочуць ягонай смерці. Знакаміты паэт-трагік, разважаючы пра найвышэйшае шчасце, зазначаў, дарэчы, што для Юпітэра няма большай і лепшай ахвяры, чым несправядлівы цар. Сам той паэт аддаваў перавагу не багаццю цароў, не пурпурным убранням і не палацам у залатым ззянні, а спакою і цішы. І ў старасці ён хацеў бы памерці ў ціхім закутку як просты чалавек.

Сказанае пра ўладароў тычыцца кожнага, хто кладзе ўсе сілы і сродкі, каб узняцца да славы, але разам з гэтым робіцца адкрытай мішэнню для стрэл ненавіснікаў і злых языкоў нядобразычліўцаў. Бо ў вачах такога прадажнага суддзі, як натоўп, жыццё знакамітых людзей абуджае не так ухваленне, як зайздрасць. І як толькі славалюб развітваецца з гэтым светам, ужо амаль ніхто і не памятае, ці ён жыў.

ФІЛАХРЫМАТ. Ну, калі такое адбываецца з усімі, хто хоць нейкім бокам дакрануўся да славы, то, па-мойму, шчаслівымі могуць быць прынамсі тыя, хто не лезе ў палітыку, а ўсе сілы аддае прымнажэнню багацця і грошай. Грашавітыя людзі абароненыя ад злыбедаў лёсу. Іх ніколі не гнятуць нястача і беднасць. Яны заўсёды маюць усё патрэбнае ў такой меры, што не баяцца голаду і іншых бедаў, якімі пагражае нэндза. Усе лічаць галечу за пакутны цяжар, а з гэтага вынікае, што шчасцем, відаць, ёсць багацце і поўны дастатак. Па прыклады далёка хадзіць не трэба. У цяперашнім грамадстве бедны не можа пабудаваць добры дом, аздобіць цела дарагім шыкоўным убраннем, жыць, як душа жадае. А багаты здольны нават на большае: калі ёсць ахвота, ён можа скарыстаць свае сродкі на якую заўгодна раскошу і ўцехі.

ЭЎСЭБІЙ. Але ж Бог, дэміург усяго існага, стварыў чалавека такім, што ён задавольваецца і малым — самым сціплым адзеннем і нязначнаю колькасцю ежы. Чалавечая прырода патрабуе столькі, колькі вымагае неабходнасць, а не панада і прыхамаць. Чалавек, які жыве ў згодзе з прыродай, робіцца свабодным ад турботаў і клопатаў, звязаных з набыццём рэчаў, і мірна цешыцца душэўным спакоем, без якога немагчыма шчаслівае жыццё. А той, хто займаецца збіраннем і прымнажэннем і без таго немалых грошай, толькі мардуе сябе няспыннымі трывогамі і бяссоннымі начамі. Яму ніколі няма спачыну. Такі руплівец сам сябе пазбаўляе прыемнасці чалавечага існавання.

Усе багацеі аднолькавыя: чым больш яны багацеюць, тым мацнейшую адчуваюць прагу да золата. Ёсць людзі, якія, імкнучыся ўсімі спосабамі разбагацець, жывуць, аднак, сціпла і адмаўляюць сабе нават у самым неабходным. Іх ежа, адзенне сведчаць пра вялікую беднасць. З кожнага кут у іх доме крычыць убогасцю і нястачай. Пра такіх багацеяў можна сказаць, што яны багатыя не для сябе, а для іншых. Калі яны памраюць,

іх багацці, здабытыя імі ў поце чала, забіраюць тыя, хто іх перажыў. А пакуль яны жывуць па прынцыпе: і сам не гам, і другому не дам, — і пастаянна баяцца падпусціць да сябе каго-небудзь блізка. Акурат, як сабака, што ляжыць у хляве на сене: і сам сена не есць і валу есці не дазваляе.

Прыгадаем Тантала, якога часта згадваюць паэты. Знаходзячыся ў апраметнай і маючы вакол мноства пітва і ежы, ён увесь час мусіў пакутаваць ад голаду і смагі. Тое самае і багацей: жыве мізэрным, убогім жыццём, недаядае і галадуе — абы зэканоміць. Такое ж становішча і ў гаротніка асла, які на сваёй хрыбетціне носіць правізію і іншы цяжар, а корміцца жухлай травой, якую яму кладуць на подсціл.

Зрэшты, ёсць і іншыя багацеі, для якіх багацце ёсць сродкам жыць у раскошы і шыку. Яны не саджаюць свайго Плутаса ў вязніцу, а, выцягнуўшы са схова, прымушаюць служыць салодкім разгульным забавам. Але ад такога жыцця мы ўжо адмовіліся, паказаўшы, якія згрызоты сумлення мучаць пасля маталыгу, што аддаўся ўцехам і блуду. Нельга лічыць шчаслівым чалавека, які валодае агромністымі багаццямі, — усё адно, ці дасталося яно ад продкаў, ці ён сам нажыў яго сваёй працай і розумам. Акрамя ўжо згаданых заганаў, багатыя маюць яшчэ адну, пра якую народная прымаўка кажа: усякі багацей або сам няправедны, або ўладальнік няправеднага. Немагчыма, каб нейкі сярмяжнік без падману і гвалту стаў раптам заможны, прыдбаў добрае імя і аказаўся надзвычай багатым. Мабыць, і Сулла ў свой час небеспадстаўна пачуў папрок: «Як магло стацца, што ты стаў знянацку такі багаты і знатны, калі бацькі нічога табе не пакінулі?»

Але дапусцім, што чалавек набыў багацце без крутельства, сваім мазалём. Тады цяжка нават пералічыць, колькі яму, ахвочаму разбагацець, давялося пеpажыць нягодаў, сцярпець пакутаў і праліць поту. Ужо сама няўтольная прага да набыцця

заўсёды ўзбуджае і нікому не прыносіць душэўнага заспакаення. А ў змардаваным розуме і целе, як сведчыць Цыцэрон, здароўя быць не можа. Чалавека, чый розум страчвае стабільнасць і раўнавагу, філосафы называюць вар'ятам. Вось чаму, калі апантанаму прагаю да нажывы хочуць ліха, яму зычаць доўга жыць — каб ён яшчэ многія гады цярпеў душэўныя пакуты, трывогі і хваляванні. Бо апроч бясконцага карпення дзеля здабыцця ўсё новай маёмасці, не меншым злом ёсць і вечны страх за сваё дабро. Гэтае пачуццё скоўвае чалавечы розум і пазбаўляе яго рашучасці. Багач увесь час баіцца, што праз падман ці якую неспадзяванку ўвесь яго скарб зараз знікне ці кудысь прападзе. А калі такое сапраўды здараецца, душу скнарліўца пачынаюць душыць і мучыць незлічоныя хваробы, нядужасць і немач. Дык ці можна назваць чалавека шчаслівым, калі ўсе яго памкненні і думкі прасякнуты страхам і пакутнаю горыччу? Не, ён хутчэй гарапашнік. Ужо куды болей шчаслівы той, чыё вечна жывое сэрца безупынку раздзірае ў апраметнай арол, ці той, што, ніколі не ведаючы спачыну, мусіць варочаць кавалак скалы, штурхаючы яго да вяршыні.

Бо як ні круці, скнарліўца чакае смерць, ад якой не адкупішся ніякім золатам. Яна, як кажа Гарацый, косіць і малых і вялікіх. Багацей усё жыццё мардуе сябе марнай і няўдзячнаю працай, а потым у адну фатальную хвіліну мусіць пакінуць раптам усё, што так доўга збіраў. У адным сваім творы Аўсоній памяшчае найбагацейшага з цароў Крэза ў апраметную, дзе той сустракаецца з Дыягенам Цынікам, які аднойчы, яшчэ пры жыцці, з'едліва з яго пасмяяўся. І тут мудрэц зноў звяртаецца да Крэза з такімі словамі: «О, Крэзе, найбагацейшы з цароў, якая карысць табе цяпер ад твайго багацця? Ты цяпер гол як сакол і нават бяднейшы за мяне. Я чым быў багаты, тое маю і сёння. А ў цябе з былых скарбаў не засталося нічога».

Сапраўды, чалавек сярэдняга дастатку не жадае нічога больш,

апроч спрыяльнага лёсу. Ён задаволены тым, што мае, і стаіць нават вышэй за самога Аляксандра Македонскага. Таму было мала зямное кулі. Ад сытасці ён, як казалі скіфы, адчуваў голад. Меў рацыю паэт, калі пісаў, што ўладальніка вялікіх багаццяў не назавеш шчаслівым. Слова *шчаслівы* больш пасуе чалавеку, які разумна карыстаецца дарункамі багоў і ўмее трываць нават крайнюю нэндзу. Так і Біблія прадпісвае багатым ліць слёзы. Смеючыся з іх золата і срэбра, Святое пісанне прарочыць ім жалю варты лёс на тым свеце ўжо з тае прычыны, што багацце для багатых стала богам, а не сродкам дабрачыннасці. Нездарма скупасць называюць ідалапаклонствам. Усе думкі і клопаты багацея прыкаваныя да яго скарбу. Ён перакананы, што яго дабрабыт залежыць не ад Бога, а толькі ад куфра з грашыма.

ЯЎГЕНІЙ. А што ты думаеш пра шчасліўцаў, якія нарадзіліся ў знатнай сям'і і атрымалі знатнасць яшчэ ў матчыным улонні? Іх лічаць шчаслівымі, бо яны заўсёды на вачах у людзей і пра іх усё ведаюць Ад нараджэння ўзнесеныя да слаўных вяршыняў, яны лёгка бароняць сябе ад усялякае варажнечы і паўсюль аказваюцца першымі.

ЭЎСЭБІЙ. Вядома, Фартуна шмат паспрыяла такім спадкаемцам, адразу ўзнёсшы іх на пачэснае, ганаровае месца. Але ж адначасова пад пагрозаю страты добрага імя яна загадала ім быць узорам той дабрачыннасці, дзякуючы якой іх продкі здабылі пашану і славу. Калі ж знатны нашчадак аказваецца гультаём і лодырам, калі ён загразае ў распусце і блудзе, то вядомасць продкаў не толькі не дапамагае яму, а наадварот — выкрывае і высвечвае яго ліхія ўчынкі тым выразней, чым ярчэйшаю была слава яго бацькоў і дзядоў. Рымлянін Марый, які вызначаўся высокімі вартасцямі, слушна кляйміў сваіх зласліўцаў за іх фанабэрыю. Гэтыя зайздроснікі патрабавалі сабе ўшанавання як нечага натуральнага і абавязковага, а да яго, чалавека новага, не радавітага, ставіліся з пагардай. «Хіба гэта не крывадуш-

насць? — гаворыць Марый. — Яны аднолькава імкнуцца да ўзаемавыключальных рэчаў: да салодкіх уцех і да пашаны за добрапрыстойнасць. Выступаючы з прамовамі ў вас у Сенаце, яны да нябёсаў узносяць подзвігі сваіх продкаў і лічаць, што за гэта і яны дастойныя славы. Але сапраўднае становішча зусім не такое: чым лепш ім жывецца, тым большай робіцца іх разбэшчанасць». І такое здараецца нярэдка.

Слава продкаў служыць патомкам як светач. Яна не дазваляе рабіць употай ні добрае, ні дрэннае. Пра гэта высакамоўна гаворыць і паэт Ювенал: «Калі ты, бы ўтрапёны, прагнеш пашаны і славы, калі да крыві лупцуеш сваіх памагатых, калі цябе цешыць, як ліктар апускае бяздушны тапор, тады знатнасць тваіх продкаў паўстане супроць цябе і зырка асвеціць твае брудныя ўчынкі». Чым вышэйшы статус ліхадзея, тым болей яўнымі, болей відочнымі будуць ягоныя ліхадзействы.

Знатнасць нікому не гарантуе непахіснай славы. Больш за тое, яна чарніць і пляміць чалавека, які здзейсніў гнюсныя злачынствы. Смеху варты той, хто хоча, каб яго лічылі знатным за адно толькі паходжанне, а сам не імкнецца да беззаганнага, прыстойнага жыцця, не дбае, каб вызначыцца адметнаю чыннасцю, і нічога не робіць, каб прымножыць славу свайго роду. Такая фанабэрыя ўкаранілася ў свядомасці некаторых настолькі, што яны атаясамліваюць радавітасць з дабрадзейнасцю і мяркуюць, што для значнасці іх персоны не патрэбныя ні розум, ні праца, а дастаткова толькі нарадзіцца нобілем.

Па цяперашнім звычаі знатным, ці шляхціцам, лічыцца той, хто валодае пэўнай зямлёй і маёнткам і, калі патрабуе дзяржава, служыць у войску. Але ў сваёй пераважнай большасці гэта людзі, як правіла, малавядомыя, бедныя. Яны жывуць, як звычайныя сяляне, не ведаюць свайго радаводу і не могуць згадаць ні багацця, ні подзвігаў сваіх продкаў, каб хоць гэтым адным, як кажа філосаф, засведчыць сваю знатнасць. І так ужо павялося, што

мы знатных шукаем сярод знатных. Уведзеныя ў зман чалавечай аблудай, мы лічым знатнымі аднолькава і людзей слынных, і людзей простых.

Кожны, хто хоча пакрыць сябе нязгаснай, неўміручаю славай і выцягнуць свой род з цемры да святла, павінен імкнуцца чыніць дабро. На думку вучоных мужоў, чалавек, які вылучаецца найбольшаю дабрачыннасцю, якраз і набывае найбольшую знакамітасць. А паэт заўважыў, што дабрачыннасць і ёсць знакамітасць.

ЭВЭРГЕТ. Я ўважліва слухаў, як ты разважаў над рознымі асаблівасцямі чалавечай натуры. Некаторыя ты ўхваляў, іншыя ганіў, і ўрэшце я прыйшоў да высновы, што чалавек можа стаць шчаслівы толькі тады, калі ўсімі ягонымі думкамі і ўчынкамі будзе кіраваць дабрачыннасць. Я сапраўды лічу, што шчаслівы толькі той дабрадзей, які не дазваляе сабе адыходзіць ад разумных правілаў прыстойнасці і ўсякую чумную разбэшчанасць, што пануе ў галовах людзей, стараецца ўтаймаваць і падпарадкаваць здароваму сэнсу. Такім вось чынам, такім, як мне здаецца, манерам і можна здабыць душэўны спакой і дасягнуць рэальнага шчасця.

ЭЎСЭБІЙ. Ты разважаеш слушна. Толькі дабрадзейства адкрывае дарогу да шчасця. І людзей дабрадзейных заўсёды чакаюць пашана і слава. Але чалавечы розум такі слабы і недасканалы, што сам не здольны разабрацца ладам, дзе тое дабро, да якога трэба імкнуцца. Чалавек памыляецца, і нярэдка, прыкінуўшыся дабром, яго апаноўвае зло. І нават калі розуму, асвечанаму Божаю мудрасцю, адкрываецца дабро праўдзівае, ён усё адно не можа ўстояць перад шкоднымі, згубнымі прыхамацямі чалавечай волі. Будучы разбэшчанай, воля не зважае на тое, што розум ухваляе і прапануе, а апантана імкнецца да таго, што ён ганіць і не прымае. Дасягнуўшы сваёй мэты і паспытаўшы асалоды, яна ўжо не можа пазбыцца гэтай заганы, быццам яна і ёсць вяршыня шчасця.

Многія людзі жывуць у варажнечы. І разам з тым горка аплакваюць сваю няшчасную долю, скардзячыся, што страсці, якія іх апаноўваюць і збіваюць з тропу, аддаляюць іх ад узнёслых намераў. Чалавек не робіць нічога добрага, бездакорнага, вартага пахвалы. Тое, чаго ён выракаецца як нейкай погані, ён сам жа прагне атрымаць па сваёй волі. У агромністай людской грамадзе не знойдзеш разумніка, які ад прыроды, з жыццёвага досведу ці праз навуку аказаўся б такім дасведчаным, каб ні разу не парушыць маральны закон і не кінуцца безаглядна ў грэх. Але не будзем чапаць маральных канонаў, якіх патрабуе праўдзівая рэлігія. Засяродзімся на крытэрыях, неабходных для захавання грамадзянскай супольнасці.

Перадусім пакажыце мне чалавека, які ва ўсіх сваіх рашэннях нязменна вылучаўся б разважнасцю, ва ўсіх непамысных абставінах праяўляў бы цвёрдасць характару, заўсёды служыў бы прыкладам сумленнасці, справядлівасці і, у дадатак, умеў бы ўтаймоўваць свае жарсці, ніколі ні ў чым не схібіўшы і трымаючыся ва ўсім памяркоўнасці так, што ўсё яго жыццё ўвасабляла б узор дабрачыннасці.

Каб стаць бездакорным нават у адной са шматлікіх праяў дабрачыннасці, трэба прыкласці шмат намаганняў. Яшчэ цяжэй быць дабрачынным у многіх сферах і пры гэтым ніколі не пакрывіць душой. І калі некаму ўдаецца хоць бы ў нечым адным вызначыцца сапраўды выбітнаю чыннасцю, гэтым самым ён ужо ступае на ўвенчаную славай сцяжыну, да якой ідзе кожны, хто імкнецца дасягнуць у жыцці шчасця. Як казаў Цыцэрон, слава — не прывід, а сапраўды рэальная рэч. Слава — гэта ўсеагульная ўхвала выбітных учынкаў асобы, чыю вартасць пацвярджаюць і непадкупныя суддзі. Слава — гэта, так бы мовіць, своеасаблівы адбітак дабрачыннасці. І такую адзінадушную ўхвалу найлепшых мужоў атрымлівае толькі той, хто кіруецца ў сваіх учынках патрабаваннямі Божага розуму, хто

вылучаецца дасканаласцю мыслення і таленту, хто ў асабістых і грамадскіх справах клапоціцца найперш пра паспаліты дабрабыт і ўмацаванне аўтарытэту дзяржавы і хто не пераступае закон. Усе разнастайныя праявы дабрачыннасці знаходзяцца між сабой у такой цеснай сувязі, што без узаемнай падтрымкі не могуць выконваць свайго прызначэння і садзейнічаць гармоніі розных відаў чалавечай дзейнасці.

Чалавек павінен заўсёды звяртацца да вышэйшага розуму, каб той праменнем сваім азарыў яго думкі і паказаў шлях да так жаданай гармоніі жыцця. А ўсё, што не адпавядае здароваму сэнсу, што супярэчыць вучонай мудрасці, — не павінна заслугоўваць пахвалы. Але ў зямным жыцці ідэя абсалютнай дабрачыннасці — неспасцігальная для чалавека. Хоць невялікая іскарка Божага святла ў галовах людзей усё ж ёсць. Тым больш чалавек варты ўсякага асуджэння, калі і гэтая светлая кропка мала адпавядае свайму прататыпу. Пацвярджаць гэта нейкімі прыкладамі няма патрэбы. Пра гэта сведчыць сама рэчаіснасць.

Як вядома, здаровы розум раіць не рабіць неабдуманых учынкаў і праяўляць усю сваю мудрасць, каб прадбачыць іх магчымыя, спрыяльныя і неспрыяльныя, наступствы. Трэба ўсё ўзважваць і разважаць правільна. Але чалавечы розум часцяком памыляецца. Калі яму трэба выбраць між дабром і злом, ён нярэдка кіруецца фальшывымі, аблуднымі меркаваннямі. У выніку ўсе чалавечыя задумы рушацца. І нябога расплачваецца цяжкімі маральнымі пакутамі.

Цыцэрон, які вызначаўся вялікім талентам, высокай адукаванасцю і багатым жыццёвым вопытам, тым не менш аднойчы прызнаў, што і яго розум недасканалы. Вось гэтыя красамоўныя словы: «О, які ж я нязменны дурань! Як часта тое, чаго няма, беспадстаўна лічыцца існым. Як моцна ты, рымскі народ, памыляешся на мой конт. О, мая горкая заўчасная старасць, спрычыненая легкадумна праведзенымі гадамі!»

Чалавечы розум занураны ў густы туман невуцтва і ахутаны моракам шматлікіх аблудаў, таму не дзіва, калі чалавек пачынае вярзці несусвецiцу ці апынуўшыся на раздарожжы, не ведае, куды далей ісці. Бадай, Ювенал меў рацыю, калі пісаў:

Спрэс на абшарах зямель ад Гадаў на ўсход і да Ганга
Мала хто выбрацца мог з туману аблудаў і здолеў
Адрозніць, што ёсць дабро, а што сапраўднае ліха.

Толькі магутны велічны неперароможны розум можа вытрымаць усе нягоды і горасці. Нават пад пагрозаю смерці ён не адыдзе ад высакароднай мэты і хутчэй абярэ смерць, чым будзе ратавацца ганебнымі ўцёкамі. Гэта — маральныя якасці годнага чалавека. Але ці шмат хто меў такую сілу розуму, ці шмат хто ў фатальных абставінах быў такі моцны, каб без усякай боязі рынуцца ў пашчу небяспекі, насустрач смерці? У галовах людзей жыве прыроджаны страх, і калі навальваюцца цяжкасці, іх рухі скоўвае аняменне. Бывае, у крытычных абставінах і моцны духам не праяўляе той смеласці і рашучасці, якіх патрабуе сапраўдная мужнасць.

Але бывае і наадварот — чалавек, апынуўшыся ў цяжкім становішчы, дзейнічае так актыўна і праяўляе такую сілу духу, што, здаецца, яго не зламіць ніякай навале. А ў спрыяльных умовах пачынае паводзіць сябе вельмі пыхліва і фанабэрыста: ганарлівец не можа спакойна чуць нават самага малога папроку да сваёй асобы і праз любую дробязь здольны страціць самавалоданне і ўчыніць гучную сварку.

Гэтаксама цяжка чалавеку заставацца абыякавым да разнастайных прывілеяў, быць раўнадушным да багацця і, бачачы ці маючы ўсё гэта, захоўваць душэўны спакой і разважнасць здаровага розуму. Аляксандр Македонскі, які пагарджаў небяспекай і цяжкасцямі, быў заўсёды ўзорам мужнасці і адвагі ва ўсіх сваіх чыннасцях. Калі ж яму спрыяла Фартуна, ён рабіўся надзвычай амбітным. Аднойчы ён, зусім не саромеючыся, аб'явіў сябе...

сынам Юпітэра. Так паводзяць сябе і іншыя. У неспрыяльных, складаных абставінах яны праяўляюць непахісную цвёрдасць, здольнасць трываць любыя напасці і беды, якія на іх абрынаюцца. А вось калі ім спадарожнічае ўдача, становяцца такімі пыхлівымі і жорсткімі, што не спыняюцца і перад гвалтам.

А што казаць аб справядлівасці, якой у шэрагу чалавечых вартасцей належыць першае месца. Калі чалавек у грамадзянскай супольнасці лічыцца справядлівым, яго ўжо за адну гэтую дабрачыннасць можна называць добрым. Але ў паўсядзённым жыцці наўрад ці знойдзецца такі ідэальны тып, які заўсёды выконваў бы свой абавязак сумленна і чэсна, цвёрда трымаўся б справядлівасці і ніводнага разу яе не парушыў бы.

Справядлівасць заключаецца ў тым, каб пашанаваць і паважаць Бога, любіць бацькоў і айчыну, у абыходжанні з людзьмі ніколі нікога не крыўдзіць і не прыніжаць не толькі ўчынкам, але і словам. Спадарожнікамі справядлівасці ёсць вера і праўда. У справядлівага чалавека ніколі не разыходзяцца слова і справа. Ён не парушае ніводнай дамоўленасці ці пагаднення і стараецца прадухіліць усякі падман. Але справядлівы чалавек не задавальняецца толькі тым, што сам нікому не робіць шкоды. Праўдалюб, наколькі можа, стараецца яшчэ і прадухіліць шкоду, якую мерацца нанесці ўсім астатнім іншыя. Каб адвесці ад слабейшых зло і абараніць іх ад моцнага ліхадзея, справядлівец не ашчаджае ні сілы, ні сродкаў, і яго не спыніць нічые гнеў і абурэнне.

Дык вось жа няхай кожны разважыць і скажа, ці выконвае ён так ужо бездакорна свае абавязкі, ці заўсёды паводзіць сябе бескарысліва і добрасумленна. Нават прыстойныя людзі дапускаюць у сваіх думках і дзеях безліч аблуд і памылак. Прыватныя інтарэсы настолькі прытупляюць вастрыню розуму, што сярод многіх тысяч людзей нялёгка знайсці чалавека, які больш рупіўся б пра чужое, чым пра сваё. Хто па сваёй велікадушнасці і шчодрасці (а гэта і ёсць часцінка справядлівасці) ахвяраваў

уласныя сродкі на карысць тых, хто варты такой дапамогі і такога садзейнічання? Хто аддаваў значныя сумы грошай на падтрымку чагось высакароднага, узнёслага замест таго, каб патраціць іх на нешта неабавязковае, непатрэбнае ці нават непрыстойнае. Няпраўдзівыя здані дабра нярэдка збіваюць чалавека з тропу так, што ён прымае за дабро заганы, якія з дабром нават не мяжуюць. Напрыклад, багацей прамантачвае і марна траціць усе свае скарбы, а яго, няхай і даволі млява, хваляць як дабрадзея.

Разгледзім яшчэ адну чалавечую вартасць — памяркоўнасць, якая надзвычай упрыгожвае чалавечае жыццё і адкрывае простую дарогу да астатніх вартасцяў. Паўсядзённы досвед яскрава сведчыць, што гэтая адметная якасць сустракаецца даволі рэдка. Амаль усе з самага маленства маюць схільнасць да прыемных целу ўцехаў і ўвесь час кідаюцца ў пошуках асалоды. Чалавеку нялёгка з дапамогай аднаго толькі розуму стрымаць свае нізкія памкненні і душэўныя парыванні і быць узорам цвёрдасці, памяркоўнасці і пастаянства. Я тут не кажу пра тых разбэшчаных вырадкаў, якія па сваёй агіднай пажаднасці горшыя за скаціну і не маюць нічога агульнага з высакароднай чалавечай прыродай. Я вяду гаворку пра звычайных людзей, якія, ведаючы Божыя і чалавечыя законы, стараюцца ўладкоўваць сваё жыццё адпаведна з імі. У іх жыцці няма нічога непрыстойнага, ганебнага, распуснага. Яно не супярэчыць нормам здаровага розуму. Але жыццёвая дарога гэтых людзей настолькі коўзкая, што яны ледзь могуць па ёй ступаць, не паслізгваючыся. Часта нават найбольш устойлівыя аказваюцца не без хібаў і ляцяць неўзабаве потырч. Чалавечыя галовы спатайма агортвае ўсялякая пошасць, якая імкнецца пагасіць святло розуму і, утульна схаваўшыся ў цемры, унікнуць яго ўлады.

Узяць хоць бы гнеў — ён ёсць нішто іншае як прыкмета слабавольнасці, пры якой для ўзважанай памяркоўнасці няма месца. Гнеў і раз'юшанасць адмятаюць прэч тое, што настойліва раіць

розум. Але ці знойдзецца чалавек, надзелены такою спакойнай разважнасцю, што яго ніколі не ахоплівала жарсць помсты і ён не станавіўся рабом злосці і гневу? А колькі розных іншых заганаў пануе ў галовах людзей — пералічыць іх усе немагчыма. Будучы ворагамі чалавечай свядомасці, гэтыя заганы ўсяляк перашкаджаюць яднанню розуму з дабрачыннасцю.

Усе святыя, якіх гняце цяжар грахоў, слёзна моляць і просяць Бога вызваліць іх ад гэтага зла. Дый, бадай, кожны, шчыра паразважаўшы сам-насам, адчуе сябе вінаватым у многіх блюзнерствах. Дык як жа тады ён можа дасягнуць спакою душы і шчаслівага бесклапотнага жыцця, калі ў яго свядомасці паўстае той страшны суд, на які Бог пакліча ўсіх грэшнікаў, і кожны з іх павінен будзе адказваць за сваё зямное жыццё, якое не адпавядала Божым запаветам і Божай волі?

Эвэргет. Аднак некаторыя глыбакадумныя філосафы ўсё-такі бачаць шчасце ў дабрачыннасці. Чалавечай прыродзе не дадзена, сцвярджаюць яны, нічога прыгажэйшага і болей велічнага, чым розум. А паколькі розум вучыць узнёсламу і вядзе да высакародных учынкаў, то найвышэйшага шчасця чалавек можа дасягнуць толькі тады, калі будзе жыць у адпаведнасці з веліччу сваёй прыроды і выконваць тое, што дыктуе разважнасць.

Эўсэбій. Мы раней досыць красамоўна ўжо даказалі, што чалавечыя мазгі ахутвае цемра аблудаў, а ён не мае нават паходні, каб выбраць правільную дарогу. І нават калі перад ім загараецца нейкі агеньчык, у небаракі не стае сілы ісці за ім следам. Ён неўзабаве паварочвае назад — да сваіх аблудаў і вадаў — і ў іх атачэнні соладка спачывае.

Паганскія філосафы, пазбаўленыя Божага святла, былі няздольныя ўбачыць прычыны такой заганнасці чалавечага розуму і не маглі зразумець, ад чаго ўзнікае чалавечае грэхападзенне. Нічога дзіўнага, што, памыляючыся ў разуменні дабра, яны нават недасканалае, знявечанае дабрадзейства лічылі за найвышэйшае

шчасце. Досыць пераканаўча пра такую аблуду гаворыць Цыцэрон. Ён сцвярджае, што прырода надзяліла чалавека розумам, які дазваляе яму дасягнуць любых вартасцяў і без навукі ўсведамляць разнастайныя ўласцівасці многіх рэчаў. Але маральная сапсаванасць зайшла так далёка, што губіць зерне ўсіх вартасцяў і гасіць іскаркі, падораныя чалавеку прыродай.

Паўстае пытанне, чаму дрэнныя норавы маюць такую сілу, што могуць знішчыць у чалавеку прыродныя задаткі, закладзеныя ў яго свядомасць як непарушны закон. Мы ведаем, што прырода — чыннік настолькі моцны, што ўсё, дадзенае ёю жывым істотам, немагчыма вырваць ніякім спосабам. Хто калі зрабіў ільва, ваўка ці мядзведзя рахманымі свойскімі жывёламі, каб яны назаўжды пазбавіліся сваёй дзікасці і ніколі ўжо не вярнуліся да ранейшых звычак? Цалкам справядліва казаў паэт: «Калі прыроду прагоніш у дзверы, яна пралезе ў замочную шчыліну». На думку Цыцэрона, іскаркі, закладзеныя ў чалавека прыродай, не загарацца ніколі, бо хутка гасяцца скажонымі памкненнямі і дрэннымі норавамі.

Святло, якім Бог аздобіў чалавечую прыроду, было настолькі аслабленае грэхападзеннем першых людзей, што правільную дарогу цяпер агортвае густы, непраглядны туман. Заганныя паняцці, няўцямныя паводзіны вырастаюць з зерня разнастайных аблудаў, пасеяных у галаве чалавека. Гэтыя аблуды і даюць гнілыя плады. А там, дзе іскаркі чалавечых вартасцяў разасобленыя, яны не могуць сабрацца ў адзіны агонь і зашугаць зыркім полымем. Можна падумаць, што яны закінутыя ў чалавечую прыроду толькі дзеля таго, каб пераканаць чалавека ва яго нямогласці і паказаць, што сваёю грэшнасцю ён заслугоўвае асуджэння. Нават добрыя ўчынкі не робяць чалавечае жыццё шчаслівым. Наадварот, дабрачыннае жыццё аказваецца найчасцей гаротным, бядачым. Дабрадзей адчувае сваю мізэрнасць, нікчэмнасць, бачыць марнасць сваіх высілкаў. Яму застаецца

шукаць шчасця не ў сабе, а звонку. Ва ўсякім разе ён пачынае разумець, што толькі сваімі сіламі поспеху не даможацца. Яму неабходная дапамога.

Шматлікія мудрацы на працягу стагоддзяў былі няздольныя разгадаць таямніцу чалавечага шчасця. Блукаючы ў глыбокай цемры няведання, яны не маглі ўбачыць святла вышэйшага розуму. Толькі хрысціяне, асвечаныя промнямі Божай праўды, нарэшце спасцiглі, у чым заключаецца шчаслівае, увенчанае сапраўднымі дабротамі жыццё. Яны не абмяжоўваюць яго хуткаплынным і тленным зямным існаваннем, не акрэсліваюць скупымі тэрмінамі людскіх паняццяў. Шчаслівае жыццё для хрысціянаў — у вечным царстве нябеснай велічы. Там чалавечая душа, пазбаўленая ўсіх заганаў і азораная жыватворным спазнаннем Бога, заўсёды будзе славіць Усявышняга. А чалавечае цела, здабыўшы несмяротнасць, злучыцца з душою. Чалавек перастане пакутаваць ад хваробаў і цяжкай працы і зможа цешыцца салодкім, прыемным спакоем.

Аднак не ва ўсіх лёс аднолькавы. Шчаслівы ён хіба толькі ў праведнікаў. Стаўшы на запаветны шлях, яны шыбуюць па ім напрасткі і ўзыходзяць да шчасця, якога марна шукалі ў зямным ліхалецці. Але па дарозе гэтыя святыя вымушаныя цярпець вялікія нягоды і беды. Таму яны не баяцца смерці, якая заканчвае ўсе чалавечыя пакуты. Таму з лёгкасцю пераносяць боль, нястачу і іншае ліха, пакутна-радасна сустракаючы незлічоныя злыбеды і ўпарта ідучы пуцявінай, якая вядзе іх да шчасця.

Эвэргет. Ты маеш рацыю. Амаль кожнаму бліжэй сваё. Большасць людзей занятыя пагоняй за нядоўгатрывалымі, мінучымі дабротамі. А што тычыцца розуму, яго выхавання на прынцыпах дабра і пабожнасці, — такое амаль нікога не абыходзіць. Тым часам, як ты сам даводзіш, ад гэтых атрыбутаў у істотнай меры залежыць чалавечае шчасце. Прынамсі розум, узрошчаны на згаданых прынцыпах, адкрывае чалавеку запавет-

ны шлях. А без гэтага нават сярод тых, хто будзе ўпарта імкнуцца да шчасця і накіроўваць ўсе свае намаганні на дасягненне гэтае мэты, некаторыя пойдуць не па адной дарозе, а выберуць розныя пуцявіны. Перад вялікаю разнастайнасцю навук многія падарожныя пачнуць вагацца, сумнявацца і разважаць, які шлях для іх лепшы. Таму я хацеў бы, каб ты, дарагі Эўсэбій, падрабязна распавёў, якая дарога да шчасця карацейшая. Адважуся таксама паручыцца і за тваіх апанентаў. Спадзяюся, што яны пераменяць свае меркаванні, адмовяцца ад сваіх перакананняў і, выслухаўшы твой аповед, не пагрэбуюць тваімі парадамі.

ЭЎСЭБІЙ. Няма, па-мойму, іншай дарогі, апроч пазначанай Госпадам, які і ёсць сама ісціна. Калі Сын Божы папрасіў Айца нябеснага адкрыць, што ёсць самым правільным і разумным, то пачуў адказ: вечнае жыццё, сутнасць якога ў пазнанні адзінага праўдзівага Бога і вестуна яго Ісуса Хрыста. Гэтымі словамі ён хацеў сказаць, што ўсе астатнія чалавечыя намаганні і спробы знайсці нейкае іншае шчасце, апроч спасціжэння Бога, як і меркаванні, што яно можа быць не ў авалоданні вечным жыццём, а ў нечым іншым, — аблудныя і марныя.

Трэба таксама мець на ўвазе вось што: дзеля належнага пазнання Бога патрэбны не сачыненні філосафаў, а звесткі, якія ўтрымліваюцца ў святых кнігах. Філосафы, нават самыя празорлівыя, аказваюцца дрэннымі інтэрпрэтатарамі, калі гаворка заходзіць пра Божую ўсёмагутнасць. Яны вельмі прынізілі Бога, выдумаўшы, што сусвет вечны. Гэтыя мудрагелі не прызнаюць Бога як творцу ўсяго існага, адмаўляюць яму ў здольнасці прадбачання — гэтай неабходнай умовы ўладарыць і кіраваць. Іх выказванні пра несмяротнасць душы заўсёды вельмі дваістыя і сумнеўныя. Складаецца ўражанне, што яны, прапаноўваючы свае тэзы для дыспутаў, самі думаюць інакш. А што казаць пра ўваскрашэнне мёртвых? Яны аб'яўляюць веру ў гэта блюзнерствам і адкідаюць яе як памылку і выдумку.

Але святыя прароцтвы даюць нам праўдзівае пазнанне Бога. Мы верым, што ён сапраўды ёсць творца гэтага сусвету. Без яго жадання і волі нічога наогул немагчыма ў гэтым агромністым механізме. Усявышні бачыць усё настолькі, што самыя прыхаваныя чалавечыя думкі не застаюцца для яго тайнай. Мы ведаем ласку, цярплівасць і мудрасць Бога. Мы ўслаўляем яго міласэрнасць і дабрату. Ён увасобіў у чалавечай плоці свайго адзінага сына, каб той выратаваў грэшны чалавечы род, зрынуты ў бездань апраметнай і прывёў яго да трона нябеснай славы. У адпаведнасці са Святым пісаннем мы прызнаём, што Хрыстос ёсць сынам існага Бога, сам ёсць існым Богам, а таксама існым чалавекам. Гэтыя існасці ў ім не змешваюцца, не пераходзяць адна ў другую. І хоць кожная з іх мае свае атрыбуты, але няма дзвюх асобаў, двух Хрыстосаў. Асоба ёсць толькі адна — наш Бог Ісус Хрыстос.

Сын божы зрабіўся пасярэднікам паміж Богам-айцом і ўсім родам чалавечым. Гасподзь быў укрыжаваны дзеля ўратавання грэшных. Навекі ўслаўлены, ён сваёю крывёй вярнуў царкву да праўды, перамог смерць, грэх і сатану. Ён пайшоў на згубу і прыняў смерць за смяротных людзей. Святое пісанне гаворыць пра нікчэмнасць чалавечага роду, апаганенага колішнім грэхападзеннем, і таму праклятага назаўсёды. Пазбавіцца сатанінскай тыраніі чалавек змог толькі тады, калі сын Божы ўзяў усю віну на сябе і, пакутніцкай смерцю выкупіўшы грэх, выратаваў чалавека ад наканаванай яму пагібелі. Праведны памёр за няправедных. Бязгрэшны зрабіўся грэшным за нас, каб мы, як кажа апостал, спазналі Божую справядлівасць. Хрыстова справядлівасць змагалася з чалавечай хібнасцю. Чалавека за яго грэшнасць спасціг Божы гнеў і вечны праклён. Але Хрыстос сваёй душэўнаю чысцінёй і справядлівасцю выбавіў чалавека ад Божага гневу і вечнай смерці.

Як бачым, сумная планіда, якая напаткала першага чалавека, адбылася па яго віне. Ён аддаліўся ад бязгрэшнай сваёй пры-

роды. Яго аблуднасць разбурыла праведнасць, якую падараваў яму Бог. Таму ён павінен быў панесці наканаваную яму кару і цярпець пакуты вечнае смерці. Толькі Божы сын пазбавіў чалавека ад гэтых пакутаў. Аўгустын сугучна са Святым пісаннем гаворыць, што Хрыстос, абсалютна бязгрэшны, прыняў на сябе прызначаную нам кару. І праз яго мы атрымалі дараванне нашых грахоў.

Найвышэйшая Божая справядлівасць патрабуе, каб чалавек, створаны па вобразе Бога, заўсёды захоўваў гэтае падабенства і ў адпаведнасці з Божымі запаветамі і волевыяўленнем шчыра ўшаноўваў Бога. Але Адам, першы чалавек, не паслухаўся свайго Творцу і тым самым пазбавіў сваё патомства светлага розуму, адвярнуў патомкаў ад Бога. Яны пераслалі разумець Божую ісціну і ў шалёным утрапенні памкнулі за сваімі жаданнямі, якія не мелі нічога агульнага з Богам. Як заўважае Аўгустын, прыродзе, пераможанай злом, спатрэбілася свабода.

З ласкі ўсяміласцівага Бога наш Гасподзь, шкадуючы род чалавечы, цалкам выканаў закон і прыняў смерць, якая прызначалася грэшнаму чалавеку. І як праз непаслушэнства аднаго грэшнікамі зрабіліся безліч астатніх, так і праз пакору аднаго праведніка праведнікамі сталі многія іншыя. Вечнае жыццё — гэта Божы дар. Яно даецца толькі тым, чый розум праз Евангелле вучыцца пазнанню Бога і Божага сына Ісуса Хрыста. Дабратворнае ўздзеянне Святога духа ўзбройвае чалавека непарушнай верай ва Усявышняга. Хрыстос глыбока ўваходзіць у сэрцы людзей, а людзі, паяднаныя з ім, створаныя плоць ад яго плоці, засцярожаныя толькі праведнасцю і пакорай, паўстаюць перад абліччам Бога-айца, як непахібныя і бязгрэшныя. А Хрыстос, міласэрны для тых, каго палюбіў, працягвае дарыць ім сваю дапамогу і ўрэшце праз Духа святога стварае, замест ранейшага, зусім новага чалавека, чый розум і воля дзейнічаюць у адпаведнасці з Божым законам.

Як адзначае апостал, усе святыя прысвячаюць сваё жыццё Богу і пабожнай сваёю працай імкнуцца заслужыць нябесную ўзнагароду, ці то вечнае жыццё. Хаця плоць час ад часу і сіліцца падпарадкаваць сабе дух, але Хрыстовы пакорнасць і справядлівасць заўсёды бароняць святых. Хрыстос просіць даравацъ ім за іх блюзнерства, каб саграшыўшых не насцігнуў справядлівы гнеў караючага Бога. Дарэчы, плоць была б знішчаная раней, калі б гэтае нядоўгатрывалае аблачэнне не было скінутае. «Сыны, — павучае святы Ян, — не грашыце. А калі хто саграшыць, таго мы папросім з'явіцца перад Ісусам Хрыстом, які ёсць сама міласэрнасць не толькі да грахоў нашых, але і да грахоў усяго сусвету». Гэтаксама і Бернард глыбока ўпэўнены, што царква ўгрунтаваная не на заслугах сваіх, а на сваёй міласэрнасці: «Ёсць тры віды міласэрнасці, на якіх грунтуецца нашая надзея, менавіта замілаванне ўсынаўленнем, праўдзівасць абяцання і моц адплаты. І няхай мая неразумная свядомасць абураецца колькі заўгодна, пытаючыся: «Хто ты? Чым праславіўся? За якія такія заслугі хочаш атрымаць тое, што просіш?» Я без ваганняў адкажу на гэта: «Я ведаю, у каго веру, і ўпэўнены ў яго міласэрнасці. Ён усынавіў мяне з вялікай любоўю. Ён трымае сваё абяцанне. Аддаючы, ён усёмагутны». А вось яшчэ словы малітвы: «Прасвятлі вочы мае — і зраблюся я мудры. Не прыгадвай грахоў і заганаў майго юнага невуцтва — і буду я праведны. Вядзі мяне, Госпадзе, па дарозе тваёй — і я ўжо святы. А калі не праліецца кроў твая за мяне, то не будзе мне паратунку». Аўгустын гаворыць у гэтай сувязі наступнае: «Каб не грашыць, розум павінен накіроўвацца Хрыстом. Калі ж розум саграшыў, то ачышчае яго ад граху той жа першасвяшчэннік Хрыстос».

Чалавек, пакуль жыве, мусіць усяляк імкнуцца пазнаць праўдзівага Бога і ягонага сына Хрыста. Гэта ёсць найвялікшае шчасце і найвышэйшае дабро. Гэтаксама чалавек павінен пазнаць і сябе, дакладней, сваю мізэрнасць і сваю нікчэмнасць. Змар-

даваны нягодамі, ён заўсёды ўрэшце звяртаецца да міласэрнага Бога і просіць Хрыста аб дапамозе і паратунку. Словамі прарока Гасподзь павучае: «Няхай не хваліцца мудры сваёй мудрасцю, моцны — сваёй сілаю, багаты — сваім багаццем. Няхай кожны хваліцца тым, наколькі ён пазнаў Мяне». Святы апостал Павел, каб збіць з чалавека пыху і схіліць яго да пакоры, пісаў: «Што з таго, што ты чагось не атрымаў? А калі атрымаў, дык чаго мовіш так, быццам нічога не атрымаў? Калі нехта штось хваліць, то аддае належную пашану Богу, ад якога праз Ісуса Хрыста мы атрымалі столькі дабротаў. Створаны Богам Хрыстос ёсць для нас мудрасцю, святасцю і збаўненнем».

Некалі сатырык сказаў, што прыемна быць знакамітым сярод знакамітых, славіцца гераічнымі подзвігамі, вызначацца талентам і вучонасцю. Цудоўна, калі чалавек, хоць на сваім веку, усталёўвае мір і спакой на зямлі. Добра, калі чалавек мае багацце, да якога, дарэчы, ласы і кожны прасталюдзін. Багацце дае карысць і прыбытак, дорыць магчымасць атрымліваць цялесныя і іншыя даброты, адкрывае доступ да ўсіх асалодаў, асабліва да ўзаконеных і дазволеных. Але ўсе такія выгоды часовыя, нядоўгатрывалыя. Гэта — рэчы тутэйшага, зямнога жыцця. Нярэдка яны аказваюцца небяспечнымі нават для саміх уладальнікаў. Мінучыя зямныя рэаліі не забяспечваюць шчасця, якога мы ўсе шукаем. Шчасце знаходзіцца ва ўлонні вечнага нябеснага спакою. Яго не азмрочыць ніякае ліха, не знішчыць ніякая хвароба, ні душэўная, ні фізічная. Дык павярніце, сябры, сюды вашыя позіркі. Забудзьце пра марныя летуценні гэтага свету. Імкніцеся да нябеснага, якое не знікне ніколі.

Эвэргет. Вядома, мы ў малітвах сваіх папросім Усявышняга, каб ён сваім Святым духам выкараніў заганную нястрыманасць нашай плоці. Калі шкодныя жаданні знікнуць, мы будзем маліць, каб Бог накіраваў нашыя сэрцы і думкі на існасці толькі нябесныя. І каб урэшце прывёў нас да прычалу найвышэйшага шчасця.

# Біяграфічная даведка

Андрэй Волян нарадзіўся ў Наваградку. Яго бацька паходзіў з сілезскіх немцаў, быў чалавек адукаваны і карыстаўся асаблівай гасціннасцю ў сям'і Вастрарогаў — вядомых паслядоўнікаў Яна Гуса. Калі Андрэю споўнілася трынаццаць, яго аддалі на вучобу ў універсітэт у Франкфурце-на-Одэры. У тыя часы гэтая навучальная ўстанова ветліва расчыніла свае дзверы гуманістам і рэфарматарам. Праз тры гады юнак вяртаецца да бацькоў. Займаецца юрыспрудэнцыяй, вывучае кіраванне сельскай гаспадаркай. У наступныя тры гады праходзіць стажыроўку пад апекаю свайго дзядзькі Гераніма Квілецкага, які быў распарадчыкам маёнткаў каралевы Боны.

Пасля таго як Воляну мінула дзевятнаццаць, Квілецкі рэкамендуе пляменніка сакратаром князю Мікалаю Радзівілу Чорнаму. Але юнак хоча вучыцца далей. Неўзабаве са згоды і пры пэўнай матэрыяльнай падтрымцы Радзівіла Волян едзе на вучобу ў Кёнігсбергскі універсітэт. Тут ён вывучае антычную філасофію, гісторыю, прававыя навукі, дасканаліць свае веды ў лацінскай мове. На студэнта моцна ўплываюць лютэранскія ідэі, шырока распаўсюджаныя ў Кёнігсбергу. Волян становіцца актыўным прыхільнікам рэформы.

Праз тры гады малады рэфарматар вяртаецца ў Вялікае Княства Літоўскае і паступае на працу сакратаром да Мікалая Радзівіла Чорнага — заўзятага адэпта кальвінізму. За добрую службу Радзівіл дорыць Воляну маёнтак Біюцішкі, што непадалёк ад Ашмянаў. Праз пэўны час князь рэкамендуе свайго таленавітага аднадумца сакратаром каралю Жыгімонту Аўгусту. Волян выконвае розныя дзяржаўныя даручэнні. За адданую службу кароль дорыць яму землі па суседстве з Біюцішкамі.

Андрэй Волян адыгрывае важную ролю ў лагеры літоўскіх кальвіністаў, прымае актыўны ўдзел у спрэчках з езуітамі. Найбольш падрабязна ён выказвае сваё разуменне некаторых догматаў каталіцкага веравызнання ў творы «Пяць кніг супроць Скаргі» (1582). Літоўскі рэфарматар крытычна ставіўся і да анты-трынітарыяў, пра што яскрава сведчыць яго трактат «Paraenesis» (1582).

Волян быў не толькі рэлігійным рэфарматарам, але і палітычным дзеячам, філосафам, юрыстам. У 1581 годзе яго выбіраюць у Вярхоўны Суд Польшчы. Ён мае даволі значны ўплыў пры каралеўскім двары. Можа, з гэтай прычыны пасля смерці караля Сцяпана Батуры новы кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт IV, які быў, дарэчы, каталіком, пакінуў Воляна на пасадзе свайго сакратара.

Самы першы трактат вучонага літвіна меў назву «Аб палітычнай, ці грамадзянскай свабодзе» (1571). Віленскі адвакат Аўгустын Ратундус, якога Волян папрасіў папярэдне напісаць прадмову, высока ацаніў гэты твор: «Сярод нашых палякаў, чые тэксты мне давялося бачыць і чытаць, мала знойдзеш такіх, — пісаў знакаміты праўнік, — якія маглі б стаць з табой упоравень». Аднак прадмовы Ратундус не даў. Прычынай было тое, што Волян адмовіўся прызнаць каталіцкае духавенства за асобнае саслоўе Рэчы Паспалітай. Апроч таго, ён у сваім творы прапаноўваў нават не ўключаць у склад Вярхоўнага Суда прадстаўнікоў каталіцкага духавенства — калегіі канонікаў.

Грамадзянскія, дзяржаўна-прававыя, этычныя праблемы знаходзяць сваю інтэрпрэтацыю ў многіх яго творах, у прыватнасці, такіх, як «Прадмова на кнігу Андрэя Фрыча Маджэўскага «Аб удасканаленні Рэчы Паспалітай» (1577), «Зварот да жыхароў Каралеўства Польскага» (1585), «Пра шчаслівае жыццё або найвышэйшыя чалавечыя вартасці» (1596), «Пахвальнае слова вяльможнаму пану Мікалаю Крыштафу

Радзівілу» (1598), «Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя вартасці» (1608).

Андрэй Волян ведаў некалькі замежных моваў. Аднак аддаваў перавагу лаціне. Ён любіў гэтую мову, пастаянна ўдасканальваў свой лацінскі стыль. Ягоныя творы зачароўваюць элегантнасцю сказаў. Карыстаючыся жывой класічнай лацінай, ён хацеў найперш, каб яго творы чыталі ва ўсёй Еўропе. Разам з тым імкненне пісаць на мове пісьменнікаў даўняга Рыма было своеасаблівым адмаўленнем той няўклюднай лаціны, якая была характэрнай для многіх вучоных сярэднявечча.

Закончыў Волян свой зямны шлях 6 студзеня 1610 года ў сваім маёнтку Біюцішкі. Там яго і пахавалі. Знакаміты ліцвін быў патрыётам сваёй радзімы. Ён паважаў свой народ, верыў у творчыя магчымасці ліцвінаў і з гордасцю заяўляў: « Ліцвіны вызначаюцца прыстойнымі звычаямі, пабожнасцю, адукаванасцю і іншымі станоўчымі якасцямі так, што могуць сваімі вартасцямі з поспехам сапернічаць за першынства сярод іншых народаў». Зразумела, што ліцвінамі ён называў усіх насельнікаў Вялікага Княства Літоўскага.

# Змест

**Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе ................... 5**
Раздзел I. Усе разумныя людзі высока цанілі свабоду .....12
Раздзел II. Пра аблуднасць і недарэчнасць думкі, што свабода — гэта ўсёдазволенасць ......................16
Раздзел III. Развагі аб свабодзе і яе сутнасці ..................19
Раздзел IV. Царская ўлада была ненавісная колішнім грэкам і рымлянам, бо супярэчыла свабодзе ............ 22
Раздзел V. Якія ў грамадстве павінны быць законы, каб грамадзяне напраўду мелі свабоду ................ 26
Раздзел VI. Пра траісты статус грамадзян у нашым грамадстве і пра тое, ці ўсе карыстаюцца аднолькаваю свабодай......................................... 29
Раздзел VII. Знатнасць, яе сутнасць і паходжанне.........35
Раздзел VIII. Сёння знатнасць вызначаюць не на тых падставах, як у мінулыя вякі ..................... 42
Раздзел IX. Шляхта ў нашым грамадстве мае намнога большую свабоду, чым нобілі іншых народаў ............................................................... 46
Раздзел X. Несправядлівы закон аб забойстве, які дзейнічае ў нашым грамадстве, шмат у чым шкодзіць агульнай свабодзе ................................53
Раздзел XI. Адсутнасць у нашым грамадстве законаў, якія каралі б за пралюбадзейства, значна парушае палітычную і грамадзянскую свабоду .......................................................... 62
Раздзел XII. Дзеля забеспячэння агульнай свабоды і грамадзянскага дабрабыту трэба выдаць законы, якія абмяжоўваюць п'янства ............................ 70

Раздзел XIII. У свабодным грамадстве вельмі патрэбныя законы аб выдатках на раскошу ............... 76
Раздзел XIV. Няправільнае ўжыванне законаў моцна шкодзіць свабодзе ........................................ 87
Раздзел XV. Законы не садзейнічаюць захаванню грамадзянскай свабоды, калі няма ўлады, якая сочыць за іх выкананнем .................................. 96
**Пра шчаслівае жыццё або найвышэйшыя чалавечыя вартасці** ..................................................107
Біяграфічная даведка ......................................................138

**Волян,** Андрэй

В72 Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе / Андрэй Волян ; пер. з лацінскай Ул. Шатона. — Мінск : Зміцер Колас, — 2009. — 142 с. — (Галерэя чалавечай думкі)

ISBN 978-985-6783-49-7

Кніга знаёміць з двума творамі вядомага беларускага гуманіста, багаслова і дзеяча Рэфармацыі Андрэя Воляна (1530–1610), у якіх аўтар падымае пытанні аб прававым забеспячэнні свабоды ў сучаснай яму грамадзянскай супольнасці Вялікага княства Літоўскага («Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе»), а таксама разважае аб маральных падвалінах і сэнсе чалавечага жыцця («Пра шчаслівае жыццё або найвышэйшыя чалавечыя вартасці»).

Адрасуецца шырокай чытацкай аўдыторыі.

**УДК 1**
**ББК 87**

**У серыі «Галерэя чалавечай думкі» выйшлі з друку:**

*Зыгмунд Фройд*

**Дыскамфорт ад культуры**

*Імануэль Кант*

**Пралегомены да любой будучай метафізікі, што можа ўзнікнуць як навука**

*Эразм Ратэрдамскі*

**Пахвала дурасці**

*Рэнэ Дэкарт*

**Развагі аб метадзе як правільна накіроўваць свой розум і шукаць праўду ў навуках**

*Нікало Мак'явэлі*

**Уладар**

*Па пытаннях набыцця звяртайцеся*
*Тэл. 8-029-623.35.65, 8-029-765.19.37*
*Email: zkolas@yahoo.com*

*Навукова-папулярнае выданне*

Серыя «Галерэя чалавечай думкі»

**Волян** Андрэй

**АБ ГРАМАДЗЯНСКАЙ, АБО ПАЛІТЫЧНАЙ СВАБОДЗЕ**

Адказны за выпуск *Зміцер Колас*

Падпісана да друку 12.12.2008. Фармат 84х108 $^1/_{32}$.
Папера афсетная. Гарнітура Акадэмія. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 7,56. Ул.-выд. арк. 5,85.
Наклад 1000 асобнікаў. Першы завод 500 асобнікаў. Заказ 543.

Выдавец Зміцер Колас
ЛИ № 02330/0133412 ад 14.10.2004.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка
у друкарні СТАА «Мэдысонт»
ЛП № 02330/0056748 ад 29.01.2004.
Вул. Ціміразева, 9, 220004, Мінск.

ISBN 978-985-6783-49-7

9 789856 783497 >

АНДРЭЙ ВОЛЯН

**Аб грамадзянскай або палітычнай свабодзе**